ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Пачалася падпіска на II паўгоддзе 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	10600	31800	63600
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9990	29970	59940
63858 (ведамасны)	17050	51150	102300
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	15550	46650	93300

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 МАЯ 2009 г. СЕРАДА № 85 (26443)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

Беларускай энергетычнай галіне неабходна павышаць эфектыўнасць работы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным павышаць эфектыўнасць работы энергетычнай галіны. Гэта пытанне было ўзнята кіраўніком дзяржавы 12 мая ў час наведвання Мінскай ЦЭЦ-3.

Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне Адміністрацыі Прэзідэнта высветліць і далажыць яму, чаму эфектыўнасць работы беларускай ЦЭЦ, якая мае больш нізкія выдаткі на набыццё энергарэсурсаў і зарплату персаналу, чым у краінах Заходняй Еўропы, і валодае практычна такім жа абсталяваннем, аказваецца не вышэйшай, а прыкладна роўнай той жа нямецкай цеплаэлектрацэнтралі.

У час наведвання Мінскай ЦЭЦ-3 у цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы знаходзіліся пытанні тэхнічнай мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў энергасістэмы краіны, ход выканання адпаведнай дзяржпраграмы.

Як было даложана Прэзідэнту, у 2006-2008 гадах у выніку рэалізацыі дзяржпраграмы ўдалося скараціць амаль на 7 працэнтаў знос асноўных вытворчых фондаў энергасістэмы, колькасць пашкоджанняў у цеплавых сетках знізілася на 34 працэнты, у электрычных сетках — на 26,5 працэнта. За гэты час у энергасістэме эканомлена амаль 900 тыс. тон умоўнага паліва (туп), што эквівалентна $135 млн, замешчана 267,5 тыс.туп імпартуемых энергарэсурсаў.

Плануецца, што пры рэалізацыі ўсіх праектаў да 2011 года будзе ўведзена 727,2 МВт электрагенерыруючых магутнасцяў у энергасістэме, эканомія паліва ад эксплуатацыі ўведзеных аб'ектаў складзе каля 320 тыс.туп у год, што эквівалентна эканоміі валютных грашовых сродкаў у суме каля $42 млн у год. Будзе замешчана каля 70 тыс. туп імпартуемых паліўна-энергетычных рэсурсаў, павысіцца надзейнасць забеспячэння спажыўцоў электрычнай і цеплавой энергіяй. Як запэўніў Прэзідэнта першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка, нягледзячы на сусветны крызіс, усё, што намечана праграмай, будзе рэалізавана ў тэрмін.

Што датычыцца Мінскай ЦЭЦ-3, станцыя аснашчана самым сучасным абсталяваннем вядучых сусветных вытворцаў. Выкарыстоўваючы новы парагазавы цыкл, удалося павысіць ККД да 53 працэнтаў супраць 30 працэнтаў, якія былі да мадэрнізацыі ЦЭЦ-3.

Па такім жа прынцыпе працуе электрастанцыя ў Бярозе, у наступным годзе будзе ўведзена пасля мадэрнізацыі Мінская ЦЭЦ-2, а самы вялікі энергаблок магутнасцю 400 МВт на Мінскай ЦЭЦ-5 плануецца запусціць у 2011 годзе. Усяго ж за час рэалізацыі Дзяржаўнай комплекснай праграмы мадэрнізацыі асноўных вытворчых фондаў энергасістэмы Беларусі будзе ўведзена 1150 МВт магутнасцяў.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з тэхнічнай мадэрнізацыяй Мінскай ЦЭЦ-3. Увазе кіраўніка дзяржавы быў прадстаўлены блочны шчыт кіравання парагазавай установкай, а таксама тэхналагічны працэс вытворчасці электраэнергіі.

Як адзначыў першы віцэ-прэм'ер, Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні замежных крэдытных ліній для рэалізацыі праектаў у энергетычнай сферы. Напрыклад, дзякуючы кітайскаму крэдыту (52 млн еўра), які быў прадастаўлены нашай краіне на вельмі выгадных умовах, была праведзена мадэрнізацыя Мінскай ЦЭЦ-2. Акрамя таго, у бліжэйшы час Беларусь прыцягне 280 млн еўра кітайскага крэдыту для мадэрнізацыі Мінскай ЦЭЦ-5. «Практычна ўсе пытанні па прыцягненні крэдыту ўжо вырашаны», — сказаў Уладзімір Сямашка.

Пакуль жа мадэрнізацыя Беларускай энергасістэмы ажыццяўляецца ў асноўным за кошт беларускіх крыніц, пераважна ўласных сродкаў прадпрыемстваў і крэдытаў банкаў.

Усяго ў 2006-2008 гадах на рэканструкцыю вытворчых фондаў энергасістэмы было накіравана Br3241,4 млрд, з іх замежных інвестыцый — Br278,1 млрд. Пры гэтым, нягледзячы на складанасці з-за сусветнага эканамічнага крызісу, за першы квартал 2009 года на гэтыя мэты было выдзелена Br340 млрд.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кардынал БЕРТОНЕ:

Бенядыкт XVI застаўся вельмі задаволены сустрэчай з Аляксандрам Лукашэнкам

Аб гэтым заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу АНТ Дзяржаўны сакратар Яго Святасці Кардынал Тарчызіо Бертоне, паведамілі **БЕЛТА** ў Мінскай мітрапалітальнай курыі РКЦ.

«Ваш Прэзідэнт быў вельмі добра падрыхтаваны да сустрэчы, вывучыўшы і зразумеўшы склад мыслення Яго Святасці. Ён правёў з Папам дыскусіі на розныя тэмы, абмеркаваўшы ў тым ліку праблему адносінаў паміж рэлігійнай верай і розумам, паміж навукай і верай. У іх была цікавая гутарка, і Аляксандр Лукашэнка даў зразумець, што вельмі цэніць пазіцыю Бенядыкта XVI», — адзначыў кардынал. «Я думаю, што факт гэтай сустрэчы яшчэ больш зблізіў Беларусь з каталіцкай царквой», — дадаў ён.Тарчызіо Бертоне нагадаў, што падчас сустрэчы з беларускім лідарам былі абмеркаваны канкрэтныя праблемы і прааналізавана перспектыва заключэння базавага пагаднення паміж Беларуссю і Ватыканам. Гэта пагадненне знаходзіцца ў стадыі вывучэння і ўзгаднення яго асобных пунктаў. «Мы спадзяёмся ў найбліжэйшы час падпісаць гэтае пагадненне».

«Я сказаў Прэзідэнту: пагадненне можна падпісаць дзе заўгодна, але прыкметай яго вялікай значнасці і важнасці быў бы факт падпісання яго ў гэтай зале, дзе мы знаходзімся зараз, — зале пагадненняў і перагавораў», — адзначыў дзяржсакратар.

Аб'ём знешняга гандлю ў I квартале скараціўся на 38,7 працэнта

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Згодна з прагнозам на 2009 год прадугледжваецца рост знешняга гандлю на 16,2-17,7 працэнта. Па выніках трох месяцаў беларускі экспарт знізіўся да 54 працэнтаў да студзеня-сакавіка 2008 года (пры гадавым прагнозе росту на 17-18,5 працэнта), імпарт — да 68,4 працэнта (прагноз на год — рост на 15,5-17 працэнтаў). Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі Беларусі ў першым квартале 2009 года склалася адмоўнае ў памеры $1445 млн. Згодна з прагнозам на 2009 год адмоўнае сальда знешняга гандлю чакаецца ў межах $1470—1500 млн.

ISSN 1990 - 763X

Купляй сваё!

ПРЫЗЕМЛЕНЫ БУДАЎНІЧЫ ФОРУМ: БЛІЖЭЙ ДА СПАЖЫЎЦА, ТАННЕЙ ДЛЯ ЯГО КІШЭНІ

Аляксандр СІДАРЭНКА дэманструе драўляны зруб.

«Прадукцыя «Мінскжалезабетона» карыстаецца попытам».

Учора ў Мінску ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» па вуліцы Я. Купалы, 27 распачаў сваю працу 10-ы міжнародны форум-кангрэс сучасных тэхналогій у гарадскім добраўпарадкаванні і будаўніцтве. Не першы год наведваю падобнага кшталту выставы, аднак, на мой асабісты суб'ектыўны погляд, менавіта гэты форум з'яўляецца адным з найлепшых. Не тое, каб іншыя былі нечым горшыя, проста на ім зацікаўленаму ў рамонце ці добраўпарадкаванні жыля і тэрыторыі чалавеку будзе даспадобы і па кішэні практычна ўсё ці амаль усё. Калега-фатограф пасля назвала гэтую выставу прыземленай — усё ў тым жа сэнсе. Сёлета ў рамках форуму пройдуць выставы «Камунальная гаспадарка», «Еўрарамонт. Кватэра. Катэдж-2009», «Экспакамень і кераміка», «Азеляненне і добраўпарадкаванне» і іншыя. Першай агульнай адметнасцю гэтага мерапрыемства ад папярэдніх я назваў бы **зніжэнне** — у сувязі з фінансавым крызісам — **цэнаў на тавары і паслугі,** што прапаноўваюць шматлікія экспаненты. Другой тое, што ўжо на самой выставе зацікаўлены пакупнік у большасці выпадкаў можа атрымаць бонус у выглядзе дадатковых зніжак. Наведаць гэтую выставу — як патрапіць на будаўнічы рынак ці ў буйную спецыялізаваную краму, толькі тут уся інфармацыя і цэны будуць непасрэдна ад вытворцаў.

...Пры будаўніцтве індывідуальнага дома многія, нягледзячы на модныя тэндэнцыі, па-ранейшаму аддаюць перавагу драўніне як самаму экалагічнаму, натуральнаму матэрыялу. Колькі зараз каштуе ўзвесці такое жытло, як кажуць, ад «нуля» да «вільчака»? Дом плошчай 7,5х9,5 метра (без апрацоўчых работ) абыдзецца заказчыку ў суму каля 18 тысяч долараў. Да крызісу ён каштаваў недзе 21 тысячу «зялёных». Прычым, як запэўнілі мяне, гэта не канчатковая лічба — у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі магчымыя пэўныя зніжкі. Матэрыял — прафіляваны брус, у суму ўваходзіць яго кошт, як і кошт іншых матэрыялаў, аплата працы на ўладкаванні падмурка, даху, узвядзенню сценаў, арганізацыі дзвярных і аконных праёмаў. На ўсё пра ўсё патрэбна каля месяца — і на вашым участку з «нуля» вырастае дом. Фірма — беларуская. «Бюджэтны» варыянт дома памерам 6х6 метраў (выдатны садовы домік) будзе каштаваць каля 10 тысяч долараў. У каго ёсць сродкі, могуць заказаць і жыллё больш шыкоўнае. З таго ж прафіляванага бруса двухпавярховы дом плошчай каля 180 квадратных метраў будзе каштаваць недзе 50 тысяч долараў. Адносна нядаўна за яго прасілі на 10 тысяч «зялёных» больш, расказаў намеснік дырэктара па будаўніцтве ТДА «Фурцім» Аляксандр Сідарэнка.

Паставіў дом, трэба думаць пра агароджу. Зноў жа апошнім часам усё большую папулярнасць набываюць металічныя агароджы, са штучнага каменя, з абшыўкай драўнінай, з элементамі коўкі ці цалкам каваныя. Усё гэта — на любы густ і кішэню — можна ўбачыць на выставе. Мы, у прыватнасці, падышлі да стэнда ААТ «Мінскжалезабетон». Гэта прадпрыемства выпускае не толькі плиты перакрыццяў, лесвічныя маршы, але і элементы добраўпарадкавання, дэкаратыўныя блокі. Апошнія вырабляюцца з вібрапрэсаванага бетона, падыходзяць як для будаўніцтва сценаў, так і іх аздаблення. Спадабаліся блокі «Ірваны камень» коштам ад 6 да 8 тысяч рублёў за адзін (цана залежыць ад афарбоўкі). Вырабляюцца яны на нямецкім абсталяванні з дапамогай нямецкіх і чэшскіх фарбавальнікаў, што гарантуе высокую якасць. Тратуарнай пліткі прадпрыемства выпускае больш за 14 найменняў, у кожным з якіх можа быць па 8-9 колераў і яшчэ больш адценняў. Ноу-хау: плітка «Калормікс». Гэта калі пры вытворчасці адначасова ўпрыскваецца тры розныя фарбавальнікі. Паўтарыць потым атрыманае змяшэнне колераў немагчыма, паколькі ўсё залежыць ад машыны. Каштуе такая плітка даражэй — 50 тысяч за квадратны метр, аднак яна вельмі надзейная, па ёй можна ездзіць на машыне, запэўніла інжынер аддзела маркетынгу ААТ «Мінскжалезабетон» Ірына Ліпень. Яшчэ адна навінка прадпрыемства — керамзітабетонныя сценавыя блокі. «Уся Еўропа будуецца з іх», заўважыла суразмоўца. У Беларусі такія блокі выпускаюць пакуль толькі два прадпрыемствы. Каштуе навінка крыху даражэй за звыклыя газасілікатныя (215 тысяч за кубаметр), аднак да перавагаў можна аднесці экалагічна чысты, без прымесяў, матэрыял. Да таго ж, напрыклад, сцяна з гэтых блокаў на 40 сантыметраў не патрабуе дадатковага ўцяплення, заўважыла Ірына Ліпень.

Тут жа на выставе — уязныя брамы: двухстворкавыя, што адкатваюцца, з электрапрывадам... Да прыкладу, кошт металічнага камплекта двухстворкавага варыянту памерам 3,5х1,8 метра (у залежнасці ад выбранай мадэлі, дадатковых функцый, з мантажом) будзе складаць сёння ад 950 да 2350 у.а.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Кацярына КАНЬКОВА: «коўка — адзін з лепшых элементаў дэкору».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Бязмытны ўвоз: змяншэнне нормы ў пяць разоў?

Дзяржаўны мытны камітэт лічыць неабходным зніжэнне нормы бязмытнага ўвозу тавараў з 1000 да 200 еўра і будзе ініцыяваць яе ўвядзенне ў найбліжэйшы час. Пра гэта заявіў старшыня ДМК Аляксандр Шпілеўскі.

Як заўважыў Аляксандр Шпілеўскі, цяперашняя норма бязмытнага ўвозу ў 1000 еўра вядзе да таго, што часта пад выглядам тавараў для асабістага карыстання ў Беларусь увозіцца вялікая колькасць тавараў для продажу на рынках. У сваю чаргу гэта не лепшым чынам адбіваецца на айчынных вытворцах, перш-наперш на лёгкай прамысловасці. Пры гэтым старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта заўважыў: бязмытны ліміт увозу ў межах 200 еўра існуе ў суседніх дзяржавах, у прыватнасці, ва Украіне.

Яшчэ адной мерай, скіраванай на падтрымку айчыннай эканомікі, у ДМК лічаць рашэнне аб павелічэнні ўвазной мыты. Сама па сабе гэта мера можа паўплываць на скарачэнне імпарту, але не павінна прывесці да дэфіцыту — павышэнне ў першую чаргу закранула тавары, якія вырабляюцца ў Беларусі. Недахопу тавараў у сувязі з часовым павышэннем увазных пошлін у Беларусі не будзе.

З іншага боку, нагадаў Аляксандр Шпілеўскі, прымалася і іншае рашэнне — аб зніжэнні мыты на асноўную сыравіну і тэхналагічнае абсталяванне, што павінна спрыяць развіццю айчыннай вытворчасці. Таксама неабходным для эканомікі крокам з'яўляецца спрашчэнне мытных працэдур. Як паведаміў падчас Грамадскага савета з удзелам прадстаўнікоў буйных прадпрыемстваў старшыня ДМК, да 1 верасня 50 % экспартных мытных дэкларацый будзе пераведзена ў электронную форму. Прычым, адзначыў Аляксандр Шпілеўскі, электронная сістэма з'яўляецца больш танная, хуткай і што ці не найбольш важна — выключае прамы кантакт мытных інспектараў з прадстаўнікамі суб'ектаў гаспадарання, што дазваляе выключыць верагоднасць суб'ектыўных адносінаў.

Паводле слоў кіраўніка ведамства, цяпер мытных пунктаў пропуску на беларуска-расійскай граніцы няма, таму намечана ўладкаваць прыгранічную тэрыторыю. «Аднаўляць пасты мы не плануем, ва ўсялякім выпадку такіх указанняў мы не атрымлівалі», — сказаў Аляксандр Шпілеўскі.

Сяргей ГРЫБ.

Інфляцыя ў красавіку склала 0,4 працэнта, з пачатку года — 6,5 працэнта

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Сярэднямесячны прырост індэкса спажывецкіх цэнаў з пачатку 2009 года склаў 1,6 працэнта.

Аб'ём прамвытворчасці за 4 месяцы знізіўся на 3,6 % да Br38,4 трлн

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Згодна з прагнозам у 2009 годзе прамысловая вытворчасць павінна вырасці на 10-12 працэнтаў. За чатыры месяцы выпушчана спажывецкіх тавараў на Br8,807 трлн, што на 0,3 працэнта ніжэй за ўзровень аналагічнага перыяду 2008 года (гадавы прагноз — павелічэнне на 12-13 працэнтаў). Выпуск тавараў харчовай групы склаў 106 працэнтаў да ўзроўню аналагічнага перыяду 2008 года (гадавы прагноз — 112-113 працэнтаў) і дасягнуў Br4,613 трлн. Выраблена нехарчовых тавараў на Br3,621 трлн (92,8 працэнта, гадавы прагноз — 111,5-112,5 працэнта).

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МАЛДАЎСКІ ПАРЛАМЕНТ АБРАЎ СВАІМ СПІКЕРАМ ДЗЕЮЧАГА ПРЭЗІДЭНТА

Старшынёй малдаўскага парламента абраны лідар кампартыі і дзеючы прэзідэнт рэспублікі Уладзімір Варонін.

Кандыдатуру Вароніна аднагалосна падтрымалі ўсе 60 дэпутатаў ад Камуністычнай партыі, якія ўдзельнічалі ў галасаванні. Для яго абрання дастаткова было простай большасці, гэта значыць 52 галасоў. Дэпутаты ад апазіцыйных партый, якія на апошніх выбарах атрымалі 41 мандат, адмовіліся ўдзельнічаць у выбарах старшыні.

Хуткім часам парламенту Малдовы давядзецца абраць і прэзідэнта краіны. Да гэтага моманту яго абавязкі будзе выконваць Варонін.

СМІ: ДЗЕЯННЯМІ САМАЛІЙСКІХ ПІРАТАЎ КІРУЮЦЬ З ЛОНДАНА

Самалійскіх піратаў, якія атакуюць караблі ў Адэнскім заліве і Індыйскім акіяне, накіроўвае да цэлі каманда «кансультантаў» у Лондане. Такое сцвярджэнне ўтрымліваецца ў сакрэтным дакументе еўрапейскай ваеннай разведкі.

Групы піратаў, паводле інфармацыі, маюць «добра размешчаных інфарматараў» у Лондане, якія пастаянна кантактуюць па спадарожнікавай сувязі з кантрольнымі цэнтрамі ў Самалі, дзе вырашаецца, якія судны захопліваць. Лонданскія «кансультанты» дапамагаюць піратам знаходзіць цэлі, інфармуючы іх аб грузах і курсе суднаў. Пры выбары мішэні піраты ўлічваюць, пад якім сцягам плавае судна, прычым брытанскіх караблёў яны ўсё часцей пазбягаюць, адзначае выданне. Гэта не тлумачыцца нічым, акрамя таго, што пираты не хочуць прыцягваць увагу брытанскай паліцыі да сваіх крыніц інфармацыі ў Лондане, лічыць радыёстанцыя.

ТЭРАРЫСТЫ РЫХТАВАЛІ ТЭРАКТЫ Ў АЭРАПОРЦЕ ФРАНЦЫІ

Італьянская паліцыя ў аўторак арыштавала ў горадзе Бары двух чалавек, якія, як мяркуецца, планавалі правесці тэракты ў французскім міжнародным аэрапорце «Руасі — Шарль дэ Голь».

Абодва меркаваныя тэрарысты, 63-гадовы імам Басам Аячы і 34-гадовы Рафаэль Жандрон, могуць быць звязаныя з «Аль-Каідай». Паводле папярэдняй інфармацыі, абодва яны — грамадзяне Францыі, прычым Аячы — сірыец, які атрымаў французскае грамадзянства. У паліцыі лічаць, што яны мелі намер здзейсніць тэракты «з выкарыстаннем самалётаў».

PLAYBOY СКАРОЦІЦЬ ТЫРАЖ З-ЗА КРЫЗІСУ



Часопіс Playboy скароціць тыраж і будзе выходзіць радзей, каб справіцца з крызісам, які прывёў да рэзкага падзення продажаў, паведамляе The Chica-go Tribune.

Прапаноўваецца аб'яднаць ліпеньскі і жнівеньскі нумары, а таксама знізіць расцэнкі на размяшчэнне рэкламы. Як адзначае The Chicago Tribune, папяровы Playboy адчувае ўсё нарастальную канкурэнцыю з боку электронных выданняў і бясплатнай эротыкі ў Інтэрнэце. З 2002 па 2008 год яго аўдыторыя скарацілася на 600 тысяч чытачоў.

Ва Урадзе

Мінпрацы прапануе павысіць дапамогу па доглядзе дзіцяці да трох гадоў да 100 працэнтаў БПМ

Больш за 15 гадоў Беларусь жыве ва ўмовах дэпапуляцыі, аднак эканоміка краіны пакуль не адчувала негатыўных наступстваў гэтага працэсу, было адзначана ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідоркага. Аднак сёння, як сказаў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык, які дакладваў аб ходзе выканання мерапрыемстваў Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі, сітуацыя мяняецца.

Летась, праінфармаваў міністр, упершыню колькасць насельніцтва ў працаздольным узросце зменшылася. І, паводле прагнозаў дэмаграфаў, такая тэндэнцыя будзе захоўвацца дастаткова працяглы час — не менш за 15-20 гадоў. Таму, на думку міністра, своечасова зробленыя цяпер захады па павышэнні нараджальнасці, зніжэнні смяротнасці, эфектыўная міграцыйная палітыка могуць вырашыць у будучым праблему змяншэння як агульнай колькасці насельніцтва краіны, так і працаздольнай яго часткі.

Міністр нагадаў, што Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі рэалізуецца ў Беларусі ўжо два гады. Сярод станоўчых тэндэнцый развіцця дэмаграфічных працэсаў ён, у прыватнасці, згадаў рост колькасці нараджаных, скарачэнне тэмпаў дэпапуляцыі. Летась, дарэчы, у рэспублікі назіралася найменшае змяншэнне колькасці насельніцтва за апошнія 14 гадоў — 18,4 тысячы чалавек. Паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі Уладзімір Патупчык у многім звязвае са стварэннем спрыяльных умоў для выццядзейнасці сям'і. Перш за ўсё, значным захадам стала павелічэнне памеру адначасовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці да 5 бюджэтаў пражыткоўага мінімуму, пры нараджэнні другога і наступных — да 7 БПМ. Крайне важным у вырашэнні жыллёвых пытанняў міністр назваў павелічэнне фінансавай падтрымкі дзяржавай шматдзетных і маладых сем'яў у пагашэнні запазычанасці па крэдытах, выдадзеных на будаўніцтва ці набыццё жылля. Істотнай формай дзяржпадтрымкі сем'яў з'яўляецца і забеспячэнне бясплатным харчаваннем дзяцей першых двух гадоў жыцця. Павышэнне крытэрыю патрэбнасці да бюджэту пражыткоўага мінімуму дазволіла летась павялічыць колькасць атрымальнікаў гэтага віду сацыяльнай дапамогі: яе атрымалі больш за 44 тысячы дзяцей з малазабяспечаных сем'яў. Шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, у два разы павялічаны штомесячны стандартны падатковы вылік пры вылічэнні падаходнага падатку. Акрамя таго, з пачатку мінулага года да 80 працэнтаў БМП быў павялічаны памер дапамог па доглядзе дзіцяці да трох гадоў.

Між іншым, што датычыцца апошняй дапамогі, то Мінпрацы і сацыяльнай абароны ініцыюе яе павелічэнне.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ВНИМАНИЕ АУКЦИОН!

МИХАНОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ МИНСКОГО РАЙОНА

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома:

земельный участок в д. Кайково, площадь земельного участка — 0,2292 га, кадастровый номер 623684202601000202, начальная цена — 30 808 330 бел. руб.

В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения.

Аукцион состоится **26 мая 2009 года в 15.00** по адресу: п. Михановичи, пер. Садовый, 8.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22 мая 2009 года до 17.00** в каб. 7.

Контактные телефоны: 8 (017) 503 71 00, 8 (017) 503 83 34.

УНП 600303747

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 771,00
▼ 1 еўра	3 777,70
1 латвійскі лат	5 338,60
1 літоўскі літ	1 096,47
1 чэшская крона	141,50
1 польскі злоты	862,70
▲ 1 расійскі рубель	85,84
1 украінская грыўня	353,44

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	32,2817
10 UAH	41,2546
1000 BYR	11,6121
EUR	43,9709

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Дзённік «Еўрабачання»

НАРВЕЖСКІ БЕЛАРУС — №1?

Сёння зацікаўленыя гледачы ўжо ведаюць, ці пашчасціла беларускаму прадстаўніку па выніках галасавання прайсці ў фінал конкурсу, ці давялося застацца за бортам конкурсных падзей. Эмоцыі, якія б яны ні былі, выплеснутыя, уражанні крыху згладжаныя — а мо наадварот, жарсці працягваюць віраваць?..

Але ў той час, калі я пішу гэтыя радкі, яшчэ нічога не вядома — хто ў лідарах, хто ў аўтсайдарах — ды, уласна кажучы, і не настолькі гэта важна. Бо сёння хочацца пагаварыць не пра ўсё «Еўрабачанне», а пра аднаго канкрэтнага чалавека. Знаёмцеся: герой дня — агульны конкурсны ўлюбёнец Аляксандр Рыбак, які сёння, 13 мая, сустракае свой 23-і дзень нараджэння.

Нягледзячы на тое, што з часоў пераезду Саша Рыбак у Беларусі больш ніколі не быў, захоўвае пра гістарычную радзіму вельмі цёплыя ўспаміны, так што не толькі беларуская дэлегацыя, але практычна ўсе дэлегацыі краін—удзельніц сёлетняга «Еўрабачання» называюць Сашу Рыбака «нарвежскім беларусам» і паўжартам кажуць, што сёлета ў Беларусі ўдвая большыя шанцы на поспех.

Беларуская дэлегацыя тым часам памятае пра дзень нараджэння Сашы і рыхтуе яму нейкі адмысловы падарунак, які будзе ўручаны сёння вечарам. «Пакуль не скажу, што канкрэтна падорым — але мы ведаем, што падабаецца Сашу, і разглядаем некалькі варыянтаў», — падзяліўся кіраўнік дэлегацыі Аляксандр Мартыненка. А я лічу так — калі не ведаеш дакладна, што лепш падыдзе ў якасці падарунка, трэба спытаць у самога імянінніка. Што і зрабіла, прабіўшыся скрозь шчыльнае кольца журналістаў вакол фаварыта на адной з вечарынак у «Еўрадоме».

— Мне вельмі-вельмі прыемна быць гасцём — ой, госцем правільна? — перапытвае Саша. — Дык вось, вельмі прыемна быць госцем на вечарынках, але найперш я не забываю займацца па некалькі гадзін на скрыпцы — у мяне класічная праграма.

— Саша, у прынцыпе, зразумела, што найлепшым падарункам для цябе будзе перамога на «Еўрабачанні»...

— І не толькі для мяне! 18 мая ў маёй мамы юбілей — 50 гадоў, а 17 мая, якраз адразу пасля конкурсу, у Нарвегіі адзначаецца дзень незалежнасці, так што перамога была б найлепшым падарункам для ўсёй краіны.

— І ўсё ж — што хацелася б атрымаць асабіста табе?

— Я разумею, што вялікага свята не атрымаецца — 13 мая дзве генеральныя рэпетыцыі, на наступны дзень паўфінал, дзе я выступаю — добра, калі ўдасца з'есці кавалачак торта. Але... *(Задумваецца.)* Ведаю! Я быў бы вельмі рады атрымаць у падарунак песню.

— Любую?

— Галоўнае, каб прыгожую.

— Думаю, у гэтым недахопу не будзе. А свае першыя песні ты памятаеш?

— Тата сцвярджае, што ўласную песню я спяваў ужо гады ў тры, яшчэ калі мы жылі ў Беларусі. Але я не памятаю.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Даведка

Нарадзіўся ў Беларусі ў сям'і музыкантаў: маці Наталля Валянцінаўна — піяністка, тата Ігар Аляксандравіч — скрыпач, які пэўны час працаваў у музычным калектыве ў Віцебску. Калі хлопцу было 4 гады, сям'я пераехала ў Нарвегію, і з гэтага часу малая радзіма Аляксандра — прыгарад Осла, мястэчка Несодэн. У Осла хлопец скончыў кансерваторыю, у 2006 годзе стаў пераможцам нарвежскага аналага «Фабрыкі зорак» — шоу «Kjempesjansen» з уласнай песняй «Foolin». Удзельнічаў як музыкант у мюзікле, пастаўленым кіраўніком гурта «A-ha» Мортэнам Хакетам; гэта пастаноўка аб'ехала Еўропу, ЗША і Кітай. Цяпер працуе канцэртмайстрам у найбуйнейшым нарвежскім моладзевым сімфанічным аркестры, а гэтым летам — незалежна ад вынікаў «Еўрабачання» — плануе знятца ў дзіцячым фільме «Ёхан — маленькі скіталец».

Мінпрацы прапануе павысіць дапамогу па доглядзе дзіцяці да трох гадоў да 100 працэнтаў БПМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Разумеючы складанасці эканамічнай сітуацыі, — заявіў Уладзімір Патупчык, — мы прасілі б згоды Прэзідыума Савета Міністраў на паўторнае ўнясенне ва Урад праекта указа Прэзідэнта аб павелічэнні памеру дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў».

Міністэрства прапануе сёлета павялічыць памер гэтай дапамогі да 100 % БПМ. У бюджэце фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2009 год сродкі на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці да трох гадоў прадугледжаныя з улікам павелічэння памеру такой дапамогі.

Паводле слоў Уладзіміра Патупчыка, намаганні дзяржавы па ўзмацненні матэрыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі даюць плён: да прыкладу, летась у Беларусі нарадзілася 107 910 дзяцей, што на 4,3 працэнта больш, чым пазалетась, пры гэтым рост колькасці народжаных назіраецца ва ўсіх абласцях краіны і сталіцы. Агульны каэфіцыент нараджальнасці ў мінулым годзе склаў 11,1 чалавека на тысячу насельніцтва. Дарэчы, сёлета станоўчая тэндэнцыя росту нараджальнасці захоўваецца: у першым квартале колькасць нованароджаных у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам павялічылася на 6,2 працэнта, агульны каэфіцыент нараджальнасці павысіўся да 11,3 на тысячу насельніцтва.

Міністр падкрэсліў і тое, што ў краіне складваецца дэмаграфічная сітуацыя, якая патэнцыяльна спрыяе павышэнню нараджальнасці. Як вядома, у сярэднім 70 працэнтаў нараджэння дзяцей прыходзіцца на жанчын ва ўзросце 20-24 і 25-29 гадоў. Колькасць жанчын, якія ўваходзяць у гэтыя ўзроставыя групы, будзе ўзрастаць да 2010 года.

Разам з павышэннем нараджальнасці, лічыць міністр, для стабілізацыі дэмаграфічнай сітуацыі неабходна забяспечыць зніжэнне смяротнасці і павелічэнне чаканай працягласці жыцця. Аднак высокі ўзровень смяротнасці сёння з'яўляецца сур'ёзнай праблемай для ўзнаўлення насельніцтва рэспублікі. Летась колькасць памерлых павялічылася на 1,2 працэнта, агульны каэфіцыент смяротнасці склаў 13,9 на 1000 насельніцтва, у 2007 годзе — 13,7. Уладзімір Патупчык звярнуў увагу на тое, што шмат людзей у краіне гіне ад знешніх прычын — забойстваў, самагубстваў, атручванняў алкаголем і ў ДТЗ. У мінулым годзе ў згаданых выпадках загінула больш як 14 тысяч. Прычым, перш за ўсё ахвярамі знешніх прычын становяцца мужчыны працаздольнага ўзросту.

Узровень смяротнасці і стан здароўя ўплывае і на паказчык чаканай працягласці жыцця насельніцтва. Як адзначыў Уладзімір Патупчык, апошнія тры гады чаканая працягласць жыцця павялічваецца і летась склала 70,5 года для ўсяго насельніцтва. Аднак захоўваецца вялікая розніца ў працягласці жыцця мужчын і жанчын: для першых яна складае 64,7 года, а вось для так званай слабай паловы — 76,5, што тлумачыцца адрозненнямі ў ладзе жыцця палоў.

Згадваючы пра міграцыю насельніцтва, міністр праінфармаваў, што летась міграцыйны прырост склаў 8545 чалавек і кампенсаваў натуральнае змяншэнне нашага насельніцтва больш як на 30 працэнтаў.

Працягваючы сумную тэму смяротнасці насельніцтва, міністр аховы здароўя Васіль Жарко падкрэсліў, што сярод прычын смерці вядучае месца працягваюць займаць хваробы сістэмы кровазвароту, доля якіх летась склала больш як 52 працэнты. На другім месцы сярод прычын смерці знаходзяцца новаўтварэнні — 13,8 працэнта. Прычым паказчык смяротнасці ад новаўтварэнняў, заўважыў Васіль Жарко, мае тэндэнцыю да павелічэння не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў многіх развітых краінах свету. Знешнія прычыны ў структуры смяротнасці — на трэцім месцы. Разам з тым, у Міністэрстве аховы здароўя і МУС упэўненыя, што скараціць паказчыкі смяротнасці ад знешніх прычын ёсць магчымасць, напрыклад, з дапамогай папулярызацыі здаровага ладу жыцця і барацьбой з алкагалізмам. У прыватнасці, як паведаміў начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей Бягун, колькасць загінулых у выніку злачынстваў за чатыры месяцы скарацілася на 14 працэнтаў, паказчык смяротнасці ў выніку атручвання алкаголем знізіўся на 17 працэнтаў, колькасць ДТЗ — на 17 працэнтаў, а загінулых у іх — на 19. Сярод іншых захадаў Аляксей Бягун згадаў і нарошчванне намаганняў у барацьбе з самагонаварэннем і незаконным абаротам алкагольных напояў, правядзенне ў рэспубліцы дзён цвярозасці, стварэнне месцаў цвярозасці. Дарэчы, як мяркуецца, хранічныя алкаголікі, якія парушаюць грамадскі парадак і ставяць свае сем'і ў цяжкае матэрыяльнае становішча, будуць больш актыўна накіроўвацца ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі, колькасць якіх плануецца павялічыць.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КАНФІСКАЦЫЯ АЎТАМАБІЛЯ — ТАКСАМА МЕТАД

Бяспека на дарогах

Кожныя суткі ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў у краіне гінуць 4-5 чалавек і каля 25 атрымліваюць раненні

Аб павышэнні бяспекі дарожнага руху ідзе гэтымі днямі размова на спецыяльным семінары з удзелам прадстаўнікоў шэрагу зацікаўленых міністэрстваў і сырокага міжнароднага прадстаўніцтва.

Паводле слоў в.а. міністра ўнутраных спраў Анатоля КУЛЯШОВА, міністэрства гатовае разглядаць і ўносіць у беларускае заканадаўства новыя метады ўздзеяння на парушальнікаў дарожнага руху. Дарэчы, цяпер у краіне дзейнічае 3 адпаведныя Указы Прэзідэнта, 22 пастановы Савета Міністраў, 10 заканадаўчых актаў, а таксама інструкцыі шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, якія не застаюцца ў баку ад пытанняў бяспекі дарожнага руху. Тым не менш **«мы выйшлі з прапановай на Генеральную пракуратуру, каб мець магчымасць канфіскоўваць транспарт асобаў, якія на працягу года двойчы затрымліваюцца за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнагаап'янення,** — сказаў Анатоль Куляшоў журналістам. — Не выключана, што такое змяненне будзе замацавана ў якім-небудзь дзейным нарматыўна-прававым акце. Гэта дапамагло б зменшыць колькасць парушальнікаў закона. Летась за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення было затрымана 56 тысяч чалавек, з якіх 5 тысяч — паўторна. Наша дзейнае заканадаўства дазваляе ў дачыненні да гэтай катэгорыі вадзіцеляў узбуджаць крымінальныя справы, аднак, напрыклад, **у Германіі і Літве за згаданае парушэнне аўтамабіль канфіскуецца».**

Паводле слоў начальніка ўпраўлення ДАІ МУС Беларусі Юрыя ЛІТВІНА, напрыканцы гэтага ці на пачатку наступнага года будзе ўведзена бальная сістэма ўліку парушэнняў ПДД.

Вопыт заходніх краін паказвае, што зніжэнне ДТЗ магчымае нават ва ўмовах росту дарожнага руху і павелічэння колькасці транспартных сродкаў. Вядома таксама, што нават істотныя інвестыцыі ў дарожную інфраструктуру не даюць пажаданага выніку і скарачэння ДТЗ. Патрэбны менавіта інтэграваны і сістэмны падыход да праблемы. У Беларусі такі падыход, дакладней, канцэпцыя ёсць. Паводле гэтага стратэгічнага падыходу да бяспекі руху на дарогах, у найбліжэйшыя гады перш-наперш павінна зменшыцца колькасць ахвяраў дарожна-транспартных здарэнняў.

Дарэчы, летась на тэрыторыі рэспублікі было зарэгістравана звыш 7 тысяч ДТЗ, у якіх загінулі звыш 1,5 тысячы чалавек і каля 7,6 тысячы атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. У большасці выпадкаў мелі месца наезды на пешаходаў і сутыкненні транспартных сродкаў.

Анатоль Куляшоў заўважыў, што не падтрымлівае ўвоз у краіну маральна састарэлых аўтамабіляў, маўляў, хто б з вадзіцеляў не жадаў мець сучасны, бяспечны аўтамабіль? Аднак пры гэтым асаблівую ўвагу Куляшоў звярнуў на чалавечы фактар — падрыхтоўку вадзіцеля.

Як адзначыла дырэктар аддзела транспарту Еўрапейскай эканамічнай камісіі Арганізацыі Аб'яднаных нацый Ева МОЛЬНЭР, дарожна-транспартныя здарэнні выходзяць у свеце на вядучыя пазіцыі ў структуры смяротнасці. Паводле афіцыйнай статыстыкі, размова ідзе пра 5-е месца ў ліку прычын смяротнасці насельніцтва ў цэлым і лідарскія пазіцыі, калі гаварыць аб прычынах смяротнасці сярод дзяцей ва ўзросце ад 5 гадоў. Спадарыня Мольнэр зазначыла, што на шляху далейшага ўмацавання бяспекі дарожнага руху ў нашай краіне Беларусь атрымае ўсялякую падтрымку ад ААН і, у прыватнасці, ад Еўрапейскай эканамічнай камісіі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПРЫЗЕМЛЕНЫ БУДАЎНІЧЫ ФОРУМ: БЛІЖЭЙ ДА СПАЖЫЎЦА, ТАННЕЙ ДЛЯ ЯГО КІШЭНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да вясны было ад 1150 да 2700 тых жа ў.а, аднак крызіс прымусіў знізіць цану, сказала нам менеджар па продажы фірмы «Картуш» Вольга Мікітовіч. Дарэчы, гэтая ж кампанія апроч іншага займаецца і бурэннем свідравін, праводзіць мантаж помпавага абсталявання «пад ключ», з уводам вады ў дом. Выкарыстоўваюцца два метады буравання: шнэкавае (з выкарыстаннем металічнай трубы) і ротарнае (з пластыкавай трубой). Кошт работ сёння складае адпаведна ад 45 і ад 70 долараў за пагонны метр (да крызісу было адпаведна ад 60 да 70 і ад 85 да 130 долараў за пагонны метр, да таго ж патаннела металічная труба).

Любы гаспадар, калі завершаны асноўныя будаўнічыя ці рамонтныя работы, рана ці позна пачынае думаць пра прыгожае аздабленне жылля ці прылеглай да яго тэрыторыі (хоць насамрэч многія з пералічаных вышэй сучасных матэрыялаў адначасова з'яўляюцца элементамі добраўпарадкавання, дэкору). Адзін з найлепшых, на мой погляд, варыянтаў — мастацкія вырабы з металу, коўка. Менеджар па маркетынгу ТАА «Твен» Кацярына Канькова прадэманстравала нам, напрыклад, лесвічныя агароджы — з ручной і машыннай коўкай. З ручной працай квадратны метр такіх вырабаў каштуе ад 230 долараў. Вулічны ліхтар з каванымі элементамі — прыкладна 180 долараў, лаўка (разам з драўлянай складовай) ад 600 тысяч рублёў. Аздобіць інтэр'ер можна нават каваным падсвечнікам, ён прадаецца за 40 долараў. Выкарыстаць коўку могуць не толькі ўладальнікі катэджаў. Вядомая праблема жыхароў першых паверхаў шматпавярховых дамоў: трэба неяк абараняць вокны кватэр ад няпрошаных гасцей, для чаго многія выкарыстоўваюць краты. Надзейна, але, пагадзіцеся, не вельмі эстэтычна. А можна заказаць тыя ж краты, але з элементамі мастацкай коўкі. Тэрмін вырабу — ад месяца, кошт за стандартнае акно — ад 120 долараў. Пагадзіцеся, нядорага. Па словах Кацярыны, фірма мусіла знізіць расцэнкі ва ўмовах канкурэнцыі, якая расце. «Лепш не мець прыбытку, але прыцягваць сродкі». Таму прама на выставе кліент можа разлічваць на невялікую зніжку.

...ТАА «Масіў-дрэў» з Івацэвічаў спецыялізуецца на вытворчасці лесапрадукцыі і вырабаў з ацыліндраванай драўніны. Апошнія дэманструюцца некалькімі дзясяткамі найменняў, сярод іх — агароджы, альтанкі, мэбля, малыя архітэктурныя формы. Дарэчы, тавар пастаўляецца ў шэраг краін блізкага і далёкага замежжа. Мы адразу «купіліся» на альтанку «Прэстыж», як высветлілі потым у спецыяліста па знешне-эканамічнай дзейнасці прадпрыемства Вольгі Пунько, навінку сезона. Выраблена яна з сасны, якая прайшла вакуумнае прамочванне, што падаўжае тэрмін службы вырабу да 10-15 гадоў. Каштуе такая альтанка 4 мільёны рублёў. Каму дарагавата, могуць набыць альтанку з серыі «камфорт» коштам ад 1,8 да 2,1 мільёна рублёў, праўда, у іх няма даху з мяккай чарапіцы, дэкаратыўных уставак, стала, а толькі дзве лаўкі па баках. На адсутнасць кліентаў Вольга не скардзілася, асабліва калі ўлічыць, што за апошні час цэны на прадукцыю былі зніжаны на 10-15 працэнтаў. «У нас і выставачныя экзэмпляры вельмі хутка разбіраюць, тым больш што з форуму дастаўка ў нас бясплатная».

Ужо напрыканцы, калі адпрацавалі, позірк выхапіў сярод цяперашняй майскай мокрай шэрані на пляцоўцы перад выставачным комплексам ярка-чырвоную пляму. Гэта на выставе-кірмашы па продажы саджанцаў дрэў, расады розных раслін завіхалася ў чырвонай куртцы Лізавета Шыліна з Навагрудка. Яна займаецца развядзенем і продажам расады ягад. У Мінск прывезла расаду клубніц. Гатунак, кажа, вельмі салодкі, духмяны, расліна можа доўга «сядзець» на адным месцы. Самі ягады — памерам з пачак ад запалак (у закатаным слоіку яны тут жа красамоўна пацвярджалі гэтыя словы) і такія ж яркія, як вопратка жанчыны. Прадае расаду гаспадыня па 1-2 тысячы рублёў за расліну. Што ж, лагічнае завяршэнне нашага аповеду: пабудаваў дом, добраўпарадкаваў яго і прыгожую, час і пра смачнае з прыгожым на ўчастку падумаць. А чытачам нагадваем, што на ўласныя вочы пераканацца ва ўсім прачытаным яны змогуць да 15 мая ўключна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РЫБАКІ ПАТАНУЛІ

Гаворка ідзе пра жыхара вёскі Муляраўка Петрыкаўскага раёна і гамяльчаніна, якія патанулі пры адналькавых абставінах: падчас рыбалкі на рацэ Бобрык і ў вяслярным канале ў абодвух пачаўся прыступ эпілепсіі, і яны ўпалі ў ваду. На жаль, відавочцы, якія былі далекавата ад іх, ужо нічым не змаглі дапамагчы.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Развіццё дыялога Беларусь — ЕС не абумоўлена пытаннем аб прызнанні Абхазіі і Паўднёвай Асеціі

Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі пасол Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Пры гэтым пасол адзначыў, што адносіны Беларусі да статусу Абхазіі і Паўднёвай Асеціі мелі бы больш ключавую ролю, калі б краіна знаходзілася ў працэсе інтэграцыі ў Еўрасаюз з перспектывай членства. «Але Беларусь пакуль не вызначылася са сваім выбарам адносна перспектывы ўступлення ў ЕС. Гэта справа беларускага боку: Брусель не настойвае на інтэграцыі Беларусі ў саюз», — дадаў дыпламат.

Кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра спадзяецца на больш хуткія зрухі ў лібералізацыі візавага рэжыму ЕС для Беларусі.

У рамках ініцыятывы «Усходняе партнёрства» прадугледжана дапамога з боку Еўракамісіі ў набліжэнні стандартаў прадукцыі краін-партнёраў да стандартаў ЕС, што павінна садзейнічаць свабоднаму доступу прадукцыі гэтых краін на рынак Еўрасаюза. Паводле слоў пасла, Еўракамісія абавязана абараняць якасць тавараў, што імпартуюцца ў ЕС. Таму ў працэсе падрыхтоўкі пагаднення аб свабодным гандлі пытанне аб стандартызацыі з'яўляецца ключавым. Прадугледжваецца выдзяленне адпаведнай дапамогі з боку Бруселя.

КРУТА?

Вечарам на вул. Міцкевіча ў Пружанах жыхар гэтага райцэнтра атрымаў пашкоджанні. Са слоў пацярпелага, невядомы двойчы стрэліў з пісталета ў яго бок. Аператыўная група затрымала 23-гадовага хлопца, які страляў з пнеўматычнага пісталета.

ЯЧЭЙКА — НЕ ДЛЯ ТЭЛЕФОНА

Жыхарка Пінска зайшла ў краму «Світанак» і свой тэлефон, коштам болей чым у паўмільёна, паклала ў ячэйку для захоўвання рэчаў. Калі ж жанчына з пакупкамі вярнулася да ячэйкі, то тэлефона ў ёй не было.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Секанула маланкай па хаце...

Першая навальніца пранеслася 11 мая над Рагачоўскім раёнам. І была яна грознай, добра яшчэ, што без вялікага ветру. А маланкі былі адна за адной. Трэцяя па ліку каля шасці гадзін вечара секанула па драўлянай хаце.

Як расказала нам спецыяліст групы прапаганды Рагачоўскага аддзела па надзвычайных сітуацыях Раіса Расол, пачалося ўзгаранне столевага пакрыцця, успыхнула электраправодка, выбіла пробкі і вырвала заднюю пластмасавую абалонку тэлевізара. Навальнічны разрад выклікаў хуткі агонь, і на яго паспяшаліся тры экіпажы выратавальнікаў, якія патушылі пажар.

— Ад стыхійных сілаў абараніцца немагчыма, — кажа Раіса Данілаўна, — але ў выніку прадуманых захадаў страты могуць быць меншымі ад іх уздзеяння. У гэтым я ўпэўнілася сама, калі летась у жніўні навальніца ў маім доме вывела са строю тэлевізар, які ўжо рамонту не падлягаў, і халадзільнік, які аднавілі. Гэтыя рэчы былі застрахаваныя.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Абзац

■ Новыя паслугі ў сферы экатурызму — катанне на ўсюдыходзе і маторнай лодцы — прапануе турыстам Столінскі лясгас. Усюдыход, ці балотаход — транспартны сродак, які можна параўнаць з грузавым аўтамабілем і які праходзіць па любой дрыгве. На ім можна праехаць па палескіх лясах і балотах тром чалавекам, вадзіцелю і гіду. Маршрут праходзіць па заказніках «Сярэдняя Прыпяць» і «Альманскія балоты».

■ **Грамадзянка Расіі загінула ўчора ў ДТЗ у Мсціслаўскім раёне. Вадзіцель, грамадзянін Расіі, за рулём аўтамабіля ВАЗ-2114 не справіўся з кіраваннем і перакуліўся ў кювет. У выніку яго жонка загінула, а сам ён з траўмамі быў дастаўлены ў бальніцу.**

■ Чацвёра грамадзян Сірыі сталі ахвярамі ДТЗ на тэрыторыі Пермскага краю. Грамадзянін Сірыі на аўтамабілі «Жыгулі» сутыкнуўся з велікагрузнай аўтамашынай «Рэно», якой кіраваў грамадзянін Беларусі — ён працуе ў прыватнай кампаніі, што займаецца грузаперавозкамі. У выніку вадзіцель легкавіка і трое яго пасажыраў, усе — студэнты Пермскай фармацэўтычнай акадэміі, загінулі на месцы.

■ **Буйную партыю нелегальных тытунёвых вырабаў затрымалі смаргонскія памежнікі на беларуска-літоўскай мяжы. Пры афармленні аўтамабіля «Фальксваген Пасат» пад заднімі сядзеннямі і ў багажніку было выяўлена каля 600 пакетаў калекцыйнай курыльнай сумесі. Папярэдняя сума іх ацэнкі — каля Br109 млн.**

■ Уезд у Стары горад у Вільнюсе з наступнага года, магчыма, стане платным: сталічнае самакіраванне такім чынам спадзяецца палепшыць экалагічную сітуацыю і наладзіць больш камфортнае жыццё ў Старым горадзе. У праекце, які павінен зацвердзіць гарсавет, прадугледжана, што плата за праезд павінна стымуляваць грамадзян пакідаць машыны на стаянках у прыгарадзе, што палепшыць дарожную сітуацыю, зменшыць узровень шуму і загазаванасці і г.д. Бясплатна ўязджаць на гэтую тэрыторыю можна будзе толькі на матацыклах, мапедах і матаролерах. Плата за аднаразовы ўезд складзе каля 3 еўра, гадавы дазвол — 362 еўра. Самакіраванне літоўскай сталіцы падлічыла, што даход ад гэтага можа дасягнуць каля 2,3 млн еўра ў год. Платны ўезд у Стары горад ужо ўводзіўся ў 1994 г., але праз паўтара года яго адмянілі.

Поўны абзац

■ **Зняволены следчага ізалятара Караганды Дзяніс Аклеўкаў аб'явіў галадоўку і зашыў сабе рот, патрабуючы перагляду сваёй справы. Ён асуджаны на 13 гадоў за рабаўніцкі напад з прымяненнем агнястрэльнай зброі, але лічыць сябе невінаватым. Рот ён зашыў для таго, каб ніхто не сумняваўся ў яго галадоўцы.**

■ У Сімферопалі днямі дзве падпітыя наведвальніцы крамы пабілі 33-гадовага рабаўніка, які прыняў іх за прадавачак і, пагражаючы нажом, пачаў патрабаваць грошай. Рабаўнік уварваўся ў краму з раскладным нажом і стаў пагражаць каля прылаўка жанчынам, якія зайшлі купіць піва. Тыя спачатку аслупянелі, а потым надавалі яму кухталёў. Рабаўнік вырваўся і збег, а ў гэты час сапраўдная прадавачка выклікала міліцыю, якая і затрымала налётчыка.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Считать недействительными бланки страховых свидетельств Белгосстраха: «По обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» **серии АД № 927385, № 927392, № 927393, № 5900417, № 5900419; серии АЖ № 1426503, № 1426512 — в связи с утерей.**
УНП 101883943.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Швабского сельсовета Логойского района:

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Расходы по подготовке документации	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
4	д. Ганевичи	0,1853 га	1 290 604 руб.	1 853 000	185 000
5	д. Молоди, участок № 4	0,2076 га	1 423 514 руб.	8 304 000	830 000
6	д. Молоди, участок № 5	0,2075 га	1 423 514 руб.	8 300 000	830 000
7	д. Молоди, участок № 6	0,1970 га	1 423 514 руб.	7 880 000	780 000
8	д. Молоди, участок № 8	0,1567 га	1 290 604 руб.	6 268 000	620 000
9	д. Молоди, участок № 9	0,1671 га	1 290 604 руб.	6 684 000	660 000

Земельный участок в д. Ганевичи расположен в водоохранной зоне ручья. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.02.2009 г. Аукцион состоится **25.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.05.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

НАРВЕЖСКІ БЕЛАРУС — № 1?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Часта пытаюцца, наколькі рана я пачаў займацца музыкай — таксама дакладна не памятаю, такое адчуванне, што ўсё жыццё. У мяне першыя асэнсаваныя ўспаміны — мне чатыры гады, і бацькі штодня прымушаюць займацца на скрыпцы. Як усякае дзіця, я спачатку быў супраць, тым больш, потым у школе аднакласнікі дражніліся, — але пазней зразумеў, наколькі мне пашанцавала — цяпер я магу гаварыць з людзьмі на мове музыкі, даносіць да іх свае пачуцці і перажыванні. Уласна, як ужо многія ведаюць, і конкурсная песня «Fairytale» таксама пра пачуцці — яна прысвечана майму першаму сур'ёзнаму каханню.

— Тым не менш ужо ўсе ў курсе, што дамы сэрца на гэты момант у цябе няма?

— Так, на жаль, у Нарвегіі дзяўчына мяне не чакае — спадзяюся, чакае ў Расіі? Хоць, можа, гэта і да лепшага. Нельга так рабіць, што ты ездзіш па свеце, робіш кар'еру, а іншы чалавек вымушаны сядзець дома і ўвесь час чакаць цябе.

— Дарэчы, твае бацькі сядзяць дома і перажываюць там, альбо падтрымліваюць цябе тут?

— Пакуль што дома, але 14 мая і мама, і тата прыедуць і будуць глядзець паўфінал тут.

— Саша, беларусы насамрэч няшмат ведаюць пра Нарвегію — ну, ф'ёрды, Грыг, Пер Гюнт... цяпер вось Аляксандр Рыбак. Ты ж пражыў у гэтай краіне ўжо 18 гадоў. Калі б прапанавалі апісаць Нарвегію ў некалькіх словах, пра што расказаў бы?

— Я, напэўна, скажу не пра краіну, а пра людзей. У мяне такое адчуванне, што ў Нарвегіі людзі значна больш паказваюць сваю радасць, часцей усміхаюцца.

— Таму ты ўвесь час такі пазітыўны?

— Нават не ведаю, ува мне, лічу, сабралася самае лепшае з Беларусі і з Нарвегіі. У Беларусі, гэтак жа, як і ў Расіі, усе песні збольшага ў міноры — нават калі гэта вясёлыя песні. Мы (вы ацанілі гэта «мы»? — **Аўт.**) вельмі любім меланхолію, настальгію, кавалачак суму. А ў Нарвегіі ўсе песні часцей у мажоры, каб усім нагадаць, што ў свеце больш добрага, чым дрэннага.

— Калі табе ўсё ж удасца сёлета наведаць Беларусь, якое месца хацелася б наведаць у першую чаргу?

— Вёску Лешні, дзе я часта бываў у дзяцінстве і многае помню.

— Дзякуй, Саша! І ведай, што цябе падтрымліваюць не толькі сваякі ў Мінску і Віцебску, але вельмі многія беларусы.

— Дзякуй усім ім, гэта вельмі прыемна!

«Калі я перамагу... Першае, што зраблю — гэта высплюся як след, бо класціся спаць а палове трэцяй ночы — гэта вельмі цяжка, — дзеліцца Саша напрыканцы, і дадае, што ў букмекерскія стаўкі і прагнозы наконт абавязковай яго перамогі на «Еўрабачанні» не вельмі верыць — хоць верыць, натуральна, хочацца».

P.S. *Нягледзячы на запланаваны канцэртны тур па Нарвегіі і здымкі ў кіно, Саша Рыбак можа прыехаць у Беларусь з канцэртам ужо гэтым летам. Ва ўсякім выпадку, прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі актыўна вядуць перамовы на гэты конт.*

Вікторыя ЦЕЛЯШУК,
Масква.

Мазаіка «Еўрабачання»

Святлана Лабада: крызісу — бой! А таксама гёрл

Украінская канкурсантка, якая ўваходзіць на конкурсе ў лік фаварытаў, адразу запамінаецца не толькі песняй «Anti-crisis girl» і пастаноўкай з «адскімі машынамі», але таксама смелымі паводзінамі. Святлана, падтрымліваючы імідж антыкрызіснай, а значыць прабіўной дзяўчыны, заўзята хуліганіць — абліваецца вадой на прэс-канферэнцыях, носіць іменны баксёрскі пояс, дэманструе акрабатычныя эцюды і з'яўляецца на публіцы, пакрытая сінякамі і крывападцёкамі.

У такім выглядзе, напрыклад, Лабада паказалася на вечарынцы адкрыцця «Еўрабачання». «Што з вамі здарылася? Няшчасны выпадак? Аўтааварыя? — абступілі спявачку журналісты з тэлекамерамі». Зрэшты, пры бліжэйшым разглядзе высветлілася, што страшныя драпіны і гузакі — умелы грым. Такім чынам Святлана прыцягвае ўвагу грамадскасці да сваёй сацыяльнай акцыі супраць гвалту ў сям'і:

— Я лічу, што, паколькі аўдыторыя конкурсу вельмі вялікая, «Еўрабачанне» — выдатная магчымасць яшчэ раз нагадаць аб гэтай праблеме, — заявіла спявачка. — Чаму мужчыны лічаць, што могуць захоўваць мір ва ўсім свеце, калі самі спараджаюць гвалт, падымаючы руку на жанчын?

У такім «збітым» выглядзе Лабада, дарэчы, ужо некалькі разоў паказвалася падчас свайго прома-туру па Еўропе. А на «Еўрабачанні» ў Маскве ўразіла ідэяй нават Патрысію Каас, падбіваючы вытанчаную французанку таксама прыйсці на адну з прэс-канферэнцый у сіняках.

Анастасія Прыходзька прыбавіць 50 гадоў

Здаецца, заўсёднікаў «Еўрабачання» здзівіць ужо немагчыма. Але для конкурснага нумара прадстаўніцы Расіі, якая выступіць у фінале 16 мая, пастаноўшчыкі прыдумалі незвычайны нумар, якога раней не было ні ў кога. Падчас песні на сцэне, акрамя спявачкі, не будзе падтанцоўкі і музыкантаў — затое за спінай Насці будзе паказвацца фільм, у якім яна за 3 хвіліны «пастарэе» з 20 да 70 гадоў.

Аўтары гэтай жаночай версіі Дарыяна Грэя расказваюць, што здымкі кліпа доўжыліся 15 гадзін без перапынку, грым для рознага ўзросту — маршчыны, сівізну ў валасах — давялося накладваць 6 разоў, і кожнае перагрыміраванне займала па 1,5 гадзіны. Аднак пераможца апошняй «Фабрыкі зорак» надзіва цярпліва ўсё гэта вытрымала і спрацавала як вопытная актрыса, выдаючы патрэбныя эмоцыі.

Хоць першапачаткова нюансы нумару трымаліся ў сакрэце, на другой рэпетыцыі Расіі фільм ужо дэманстраваўся, але пастаноўшчыкі сцвярджаюць, што гэта яшчэ толькі 10 працэнтаў ад усіх задумак. Прадзюсар Насці Канстанцін Меладзэ сцвярджае — нягледзячы на тое, што пастаноўка даволі статычная, аднак гэта сапраўднае шоу — «толькі не харэаграфічнае і не касцюмаванае, як усе прызвычаіліся, а хутчэй псіхадэлічнае». Сама спявачка эксперыментам па штучным старэнні засталася задаволеная — кажа, ёй спадабаўся ўласны выгляд у старасці: «Так што вырашыла, ніякіх пластычных аперацый рабіць не буду».

Вядучыя конкурсу: галасуем па «плане Пуціна»

Калі гавораць пра фаварытаў, згадваюць брытанскую спявачку Джэйд Эвэн. Музыку для яе песні напісаў сам знакаміты Эндру Лойд Уэбер, і не толькі напісаў і акампанаваў на раялі, але нават не пасарамеўся спытацца ў расійскага прэм'ер-міністра Уладзіміра Пуціна — ці можа сёлета Расія прагаласаваць за Вялікабрытанію?

— Як адзіны прысутны пры гэтым чалавек, сведчу — дакладна пытанне гучала так — ці можа Пуцін забяспечыць, каб Расія дала высокі бал Англіі? — расказаў журналістам кіраўнік Першага канала Канстанцін Эрнст. — Уладзімір Уладзіміравіч дыпламатычна адказаў, што забяспечыць не можа, але сам з задавальненнем прагаласуе.

Адпаведна, тут жа ўзнікла пытанне, на чыім баку сімпатыі самога Эрнста, а таксама вядучых конкурсу — топ-мадэлі Наталлі Вадзянавай, Андрэя Малахава, Івана Урганта і Алсу? Практычна ўсе сказалі, што згодныя з прэм'ерам і падтрымаюць Англію, толькі Андрэй Малахаў агучыў іншы варыянт — «Першую СМС-ку адпраўлю за Нарвегію, другую — за Грэцыю, трэцюю — за Францыю, ну і чацвёртую, як папрасіў прэм'ер-міністр». Канстанцін Эрнст адзначыў, што будзе вызначацца з сімпатыямі ў час самога конкурсу. Зрэшты, на практыцы, зразумела, наўрад ці хто-небудзь з адказных за маскоўскае «Еўрабачанне» людзей паспее адправіць хоць адно СМС-паведамленне. Значна большую вагу будзе мець меркаванне журы, склад якога, за выключэннем старшыні — Філіпа Кіркорава — пакуль не агучваецца.

Руслан САЛЕЙ: «ПАРА СУМЕСНЫХ ВЯЧЭРАЎ ПЕРАД ЧЭМПІЯНАТАМ — І МЕЗІН БЫЎ ГАТОВЫ»

Пасля вяртання з чэмпіянату свету ў Швейцарыі беларускія хакеісты Руслан Салей (Р.С.) і Віталь Коваль (В.К.), а таксама трэнер зборнай Эдуард Занкавец (Э.З.) у прэс-цэнтры газеты «Комсомольская правда» адказалі на пытанні журналістаў. Выйшаў на тэлефонную сувязь і галоўны трэнер каманды Глен Хэнлан, які цяпер знаходзіцца ў Фінляндыі. Эдуард Занкавец пачаў з вынікаў выступлення беларускай каманды:

— Мы занялі восьмае месца на чэмпіянаце свету, атрымаўшы чатыры перамогі і тры разы саступіўшы. У рэйтынгу міжнародная федэрацыі зборная паднялася на адну пазіцыю. Андрэй Мезін стаў лепшым ратаром турніру. Каманда паказала той хакей, які не пакінуў абыякавым гледача, выкладвалася па поўнай, і, мяркую, у балельшчыкаў няма прэтэнзій.

В.К.: — Камандным вынікам я задаволены. Мой асабісты вынік атрымаўся скамечаным, выступаць заўсёды прыемна і мне б хацелася большага. Але галоўнае, што каманда выступіла здорава.

Р.С.: — Маю гульню даверу ацэньваць спецыялістам. Мы выканалі заданне, паказалі, што можам на роўных гуляць з грандамі сусветнага хакея. Першая гульня з канадцамі, вядома ж, не атрымалася.

— Аналізавалі, чаму яна не атрымалася?

Э.З. — Першая прычына — стартавае хваляванне, якое характэрна для ўсіх спартсменаў. Усе хлопцы хацелі сябе праявіць. Пасля першых двух перыядаў у нас, дарэчы, заставаўся шанц згуляць гэты матч больш удала. Але ў трэцім перыядзе не хапіла фізічнага складніка. Занадта захапіліся атакамі.

— Наколькі, на ваш погляд, выгадна Беларусі праводзіць чэмпіянат свету-2014?

Э.З. — Гэтыя спаборніцтвы ў любым выпадку выгадныя для нашых балельшчыкаў. Не так шмат людзей у нас пакуль можа дазволіць сабе паехаць на турніры ў замежныя краіны. Наконт эканамічнага складніка не магу сказаць, я ў гэтым не спецыяліст.

В.К. — Чэмпіянат свету ў нашай краіне — гэта вялікі плюс у развіцці хакея, папулярызацыя віду спорту.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 мая 2009 г. № 17 (169)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ЗНОЎ ПАНЕСЛІ СТРАТЫ?

Добры дзень, паважаная рэдакцыя! Звяртаюцца да вас вашы чытачы з вёскі Гарадок Маладзечанскага раёна. У вашай газеце ўжо некалькі разоў друкаваліся матэрыялы аб тым, як знізіліся апошнім часам закупачныя цэны на малако. Але нам хацелася б звярнуцца да гэтай тэмы яшчэ раз. І вось чаму.

Хто займаўся калі-небудзь сельскай гаспадаркай, той ведае, якая нялёгкая гэта праца — трымаць карову. Да пашы трэба ісці амаль кіламетр. Цэлае лета неабходна нарыхтоўваць кармы... Вельмі хочацца, каб у наш нялёгкі час была нейкая аддача ад гэтай працы. Бо круглы год ад кароўкі далёка не адыдзеш і не ад'едзеш.

Але ў нас улады як распарадзіліся? Малаку вярнулі былую цану — 665 рублёў за літр, дзякуй. (Хоць гэта смешныя грошы ў параўнанні з затратамі.) Ды мы былі згодныя і на гэта. Толькі з нас раптам запатрабавалі... каб тлустасць малака была не ніжэйшая за 3,6% (раней 665 рублёў плацілі за літр малака тлустасцю 3,4%). Можа, недасведчанаму чалавеку гэта лічба нічога і не скажа. Але той, хто разумее нешта ў сялянскай «спецыфіцы», ведае, што ў пачатку лета пасля ацёлу ў каровы не можа быць гэткага малака. Вось і атрымліваецца, што зноў панясём страту мы, сяляне, якія хочуць яшчэ трымаць свойскую жывёлу. І не дзіва, што скарачаецца грамадскі статак. Хочацца, каб ваша газета яшчэ раз вярнулася да гэтай праблемы. І дапамагла б звярнуць увагу на простага селяніна з яго патрэбамі.

З павагай — вашы падпісчыкі і чытачы А.В. Мурза, В.І. Цярэшка, жыхары Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

ВОПРОС БЕЗ ОТВЕТА

Решение об изменении базисной жирности молока с 3,4 до 3,6 процентов потрясло сельчан до глубины души. Неужели кто-то думает, что колхозники не поймут, что таким завуалированным путем им снова пытаются уменьшить выплаты?

Молоко и так убыточно на личном подворье, а тут еще и цена снижена (хотя формально она осталась 665 руб. за литр):

1) за счет обесценивания рубля только с 1.01 по 1.04 — на 36%;

2) за счет изменения базисной жирности с 3,4 до 3,6 — это опять-таки 6%;

3) за счет снижения дотаций: в 2008 г. сдавшие 5000 кг молока получали дотацию 500 тысяч руб.; в 2009 г. — уже 70 руб. за 1 кг (5000 х 70 = 350 тысяч руб.) — и здесь произошло удешевление приблизительно на 14,3%.

Все это делается в то время, когда издержки и цены растут ежедневно — налоги, страховки, услуги, свет, газ, энергия; стоимость выпасов и сенокосов и прочее, прочее. Если суммировать все минусы, то молоко обесценилось более чем наполовину к уровню прошлого года!

Сколько можно обижать колхозников?! Да их (колхозников) и осталось-то немного. При таком отношении к сельчанам вряд ли возможен подъем села, о котором так много говорится. Вкладывание денег в строительство домов, в возведение агрогородков — все это будет неэффективным, если не поддержать сельчанина на жизненном уровне.

Для снижения себестоимости продукции есть много других путей, но почему-то выбран самый «лёгкий».

Простите за резкость — наболело, ведь снижение закупочных цен на сельскую продукцию недопустимо. Сельчанин рано или поздно не выдержит.

Жители Рассонского района Витебской области.

ГРАМАДСКАЕ САМАКІРАВАННЕ

БАЕЦ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ

За плячамі Ларысы Феліксаўны САВІНАВАЙ больш за 40 гадоў грамадскай работы (яе муж быў ваенным, а ў аддаленых гарнізонах для жанчыны часам проста не знаходзілася іншага занятку). Яна была старшынёй дывізіённага жансавета, удзельнічала ў злёце жонак афіцэраў у Маскве. «Адпаведная загартоўка ў мяне была», — прызнае Ларыса Феліксаўна.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ларыса Феліксаўна ў «адваяваным» скверыку.

У кастрычніку 1989 года яны з мужам перасяліліся ў новы сталічны мікрараён Кунцаўшчына, а ўжо 15 снежня ёй прапанавалі працягнуць займацца грамадскай работай — увайсці ў склад толькі што створанага камітэта грамадскага самакіравання.

— Калі мы толькі пачыналі, мікрараён актыўна будаваўся, — узгадвае Ларыса Феліксаўна. — Нас абавязкова уключалі ў камісіі па прыёмцы дамоў, дворавых тэрыторый, мясцовых дарог, праездаў. Калі члены камітэта знаходзілі нейкія недапрацоўкі, дык прымушалі будаўнікоў ліквідаваць іх, навесці парадак. Часцей мы дамаўляліся адразу напрамую (з будаўнікамі), але калі не знаходзілі паразумення — выходзілі на раённую адміністрацыю. Бывала і так, што мы бачылі недапрацоўкі, аднак усё ж ставілі свой подпіс на акце прыёмкі (людзі ж чакалі засялення), аднак у такой сітуацыі абавязкова запісвалі ў дакументе агаворку, што ў далейшым, на працягу пэўнага часу, усе хібы трэба ліквідаваць. Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання тады меў вялікія паўнамоцтвы.

Напачатку ў КТГСе № 101 налічвалася да 40 членаў. Дзейнічала 5 камісій, у кожную з якіх уваходзіла па 5 чалавек (па рабоце з цяжкімі падлеткамі, па фізкультуры і спорце, па рабоце з ветэранамі, культурна-масавая і камісія па эканамічных пытаннях і добраўпарадкаванні). На пасяджэнні КТГСа штомесяц запрашалі дырэктараў школ, загадчыкаў крамаў, прадстаўнікоў адміністрацый прадпрыемстваў, паліклінікі, дзіцячых садкоў, дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Калісьці пры камітэце тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання працавалі самыя разнастайныя гурткі для дзяцей і падлеткаў: авіямадэлявання, радыётэхнікі, кройкі і шыцця, выяўленчага мастацтва, вязання, заалогіі, музыкі. Ахвотныя маглі прайсці курсы машынапісу, справаводства і сакратарскай справы, наведваць шыкоўна абсталяваную залу спартыўна-атлетычнай гімнастыкі. Існаваў і камп'ютарны клуб, дзе, акрамя віртуальных гульняў, дзецям прапаноўваліся курсы камп'ютарнай граматы. Для няпоўнагадовых з малазабяспечаных, неўладкаваных сем'яў заняткі ў гуртках былі бясплатнымі.

З-за адсутнасці стаянкі машыны вымушаны «дзяліць» дарогу з пешаходамі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Нічыё» смецце?..

— У першую чаргу мы імкнуліся «зацягнуць» у гурткі дзяцей з неўладкаваных сем'яў, дзе пітушчым бацькам было не да іх, — працягвае Ларыса Феліксаўна. — Пры нашым КТГСе існавала камісія па справах няпоўнагадовых, куды ўваходзілі дырэктары школ, настаўнікі, інспектар па справах няпоўнагадовых і г.д. Мы арганізоўвалі рэйды па «пажыўных месцах», разам з участковым наведвалі кватэры, якія пітушчыя гаспадары ператваралі ў прытоны. Тады яшчэ існавалі таварыскія суды, на якія мы выклікалі «праблемных» бацькоў, выпівох і г.д. Праца КТГСа была відавочнай.

На пачатку дзейнасці камітэта грамадскага самакіравання №101 прадпрыемствы, якія размяшчаюцца на тэрыторыі мікрараёна, адлічалі на яго рахунак пэўны працэнт ад свайго прыбытку. Гэтыя сродкі ішлі на ўмацаванне матэрыяльнай базы (спартыўнай залы, кабінетаў, дзе праводзіліся заняткі гурткоў), на аказанне матэрыяльнай дапамогі адзінокім старым людзям, на правядзенне масавых святочных мерапрыемстваў. Зараз, як патлумачыла Ларыса Феліксаўна, адзінай крыніцай фінансавых паступленняў для КГТСа з'яўляецца прэмія, якой узнагароджваюць пераможцаў гарадскога конкурсу-агляду на лепшы камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. За першае месца даюць 5 мільёнаў рублёў, за другое — 3, за трэцяе — 2. Прычым палова атрыманай сумы ідзе на ўзнагароджанне членаў камітэта, старшых дамоў і пад'ездаў, а другая частка — на правядзенне масавых мерапрыемстваў.

Пачынаючы з 2000 года Фрунзенскі раён заўсёды быў сярод пераможцаў. КТГС мікрараёна Кунцаўшчына-101, які ўзначальвае Ларыса Феліксаўна, неаднаразова займаў прызавыя месцы.

Ларыса Феліксаўна — баец па натуры. Жанчыну не палохае той факт, што работа старшыні КТГСа (між іншым, на грамадскіх пачатках!) часам звязана з рызыкай. Яна бясстрашна заходзіць у «небяспечныя» кватэры, дзе збіраюцца выпівохі, рэгулярна наведвае злосных неплацельшчыкаў. «Трэба ж дапамагчы ЖЭСу спагнаць квартплату, — тлумачыць пенсіянерка, — хаця, бывала, мне пагражалі, што выкінуць з 9-га паверха».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

РЫНАК ПРАЦЫ

БУДАЎНІК ПАЧЫНАЕ. І «ЦЯГНЕ» АСТАТНІХ

Чым буйнейшы рэгіён — тым менш праблем на рынку працы. Спрачацца з гэтым не будзеш: варыянтаў працаўладкавання ў невялікіх раёнах насамрэч не так і шмат. Праўда, з любога правіла ёсць свае выключэнні. Сёння насельніцтва Дрыбіншчыны не дасягае 13 тысяч чалавек, і ў той жа час тут даволі нізкі паказчык беспрацоўя — 1,1 працэнта. Аднак галоўнае ў іншым: на кожнага жыхара раёна, што знаходзіцца на ўліку ў службе занятасці, прыпадае па паўтары вакансіі. Прычым, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці апошняга часу, колькасць свабодных працоўных месцаў павінна ўзрастаць і надалей.

«Нестандарт ны» варыянт

Несупадзенне прапаноў са спецыяльнасцю ці месцам жыхарства беспрацоўнага, часцяком зусім невысокая зарплата — гэта заўсёды «мінус». Разам з тым бясспрэчным «плюсам» з'яўляецца сама магчымасць выбару. Зараз «бюджэтныя» арганізацыі Дрыбіншчыны шукаюць урачоў, фельчараў і медсясцёраў, у службе занятасці ёсць заяўкі ад працадаўцаў на бухгалтараў, гандляроў і кухонных рабочых, па-ранейшаму назіраецца значны попыт на будаўнікоў — маляроў, муляраў, зваршчыкаў, плітачнікаў, тынкоўшчыкаў. І ўсё ж ці не самымі запатрабаванымі застаюцца работнікі сельскай гаспадаркі: прадпрыемствы АПК прапануюць уладкавацца даяркам, жывёлаводам, трактарыстам, вадзіцелям, заатэхнікам, і ў тым ліку — з выдзяленнем жылля.

— За апошні час гаспадаркі атрымалі шмат новай, больш прадукцыйнай тэхнікі, адбыліся аб'яднанні некалькіх сельгаспрадпрыемстваў і, на першы погляд, усё гэта павінна было б прывесці да абвастрэння сітуацыі з беспрацоўем на вёсцы, — адзначае начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Дрыбінскага райвыканкама Аляксандр Рынг. — Аднак атрымалася інакш. Прадпрыемствы АПК сталі будаваць новыя комплексы, пашыраць плошчы, павялічваць аб'ёмы вытворчасці — адпаведна ўзрасла патрэба ў кадрах... Але тут неабходна адразу зрабіць істотную агаворку. Сельгасвытворцы робяць усё большую стаўку на высокакваліфікаваных работнікаў. А вось у тых, хто не мае спецыяльнасці, злоўжывае «моцнымі» напоямі і грэбуе працоўнай дысцыплінай, сапраўды могуць з'явіцца праблемы.

Зрэшты, варта заўважыць: змяненні на рынку працы ў вёсцы сёлета мінімальныя паўсюль. Асобная гаворка — гарады. Тут многія прадпрыемствы, асабліва арыентаваныя на экспарт, сталі адчуваць цяжкасці з заказамі і, як вынік, перайшлі на працу ў няпоўным рэжыме, пачалі выкарыстоўваць звальненні.

— Па сутнасці найбольш няпростая сітуацыя склалася некалькі гадоў таму, калі было прынятае рашэнне аб рэарганізацыі нашага масласырзавода, — кажа Аляксандр Рынг. — Пасля перамоў з новым уласнікам на прадпрыемстве ўдалося захаваць 15 з 70 працоўных месцаў. Аднак усплёску беспрацоўя зноў-такі не было — людзі змаглі знайсці сабе занятак у іншых арганізацыях. Што ж да гэтага года, то ён ідзе без якіх-небудзь адчувальных узрушэнняў.

Зараз у 3-тысячным Дрыбіне зарэгістравана ўсяго 8 беспрацоўных, няма і пагрозы масавых звальненняў. Дзеля справядлівасці, апошняя акалічнасць мае яшчэ адно «нестандартнае» тлумачэнне — у райцэнтры практычна няма... сваёй прамысловасці. Магчыма, з пункту гледжання стабільнасці на рынку працы ў наш час гэта нават можна назваць «перавагай». Але з пункту погляду эканомікі — ужо адназначна не.

Асаблівыя ўмовы

Адметным праектам мінулага года стала стварэнне 20 новых працоўных месцаў на прадпрыемстве «МалПрамБуд», якое знайшло сабе даволі простую нішу — робіць металічныя скрыні для электраабсталявання. Сёлета, у сувязі з крызісам, пэўныя ваганні вытворчых планаў тут сапраўды былі. Аднак паступова з'явіліся заказы, сітуацыя прыйшла ў норму — словам, разлікі спраўдзіліся.

Між тым, таксама зразумела — адно, і да таго ж невялікае, прадпрыемства праблемы не здымае. Раёну неабходныя іншыя вытворчасці. І асноўнае пытанне сёння — якія?

— Знайсці тое, што будзе запатрабавана заўтра, сапраўды няпроста, — зазначае Аляксандр Рынг. — Аднак ці не самым бяспройгрышным варыянтам з'яўляецца будаўніцтва. Так, тут ужо не назіраецца буму папярэдніх гадоў, і ў той жа час няма і згортвання тых жа жыллёвых праграм. І такі падыход цалкам лагічны. Будаўніцтва застаецца лакаматывам многіх галін эканомікі, а значыць, захаваецца і попыт на ўсё, што звязана з гэтай сферай.

Ужо зараз у раёне ствараюцца два прадпрыемствы, адно з іх вызначыла сваім напрамкам цеплаізаляцыйныя будматэрыялы, другое — плітку, бардзюры і іншыя вырабы з гравійна-пяшчаных сумесяў. З улікам перспектыў новых вакансій, абодва суб'екты гаспадарання карыстаюцца дзяржпадтрымкай са сродкаў садзейнічання занятасці насельніцтва. Пры гэтым цікава: прадпрыемствы з'яўляюцца прыватнымі і «прыходзяць»... з буйных гарадоў. Прычына ж ляжыць на паверхні — падатковыя льготы, большыя шанцы атрымаць дапамогу на арганізацыю працоўных месцаў, нашмат меншая арэндная плата.

— Асаблівыя ўмовы гаспадарання ў сельскай мясцовасці і малых гарадах робяць сваю справу — у раёне практыка рэгістрацыі прадпрыемстваў жыхарамі Мінска і Магілёва становіцца звычайнай, — працягвае Аляксандр Рынг. — І гэта можна толькі вітаць. Праўда, паралельна нам даводзіцца сутыкацца з праблемай... загрузкі новых вытворчасцяў. Да верасня мы павінны адшукаць для іх каля 40 чалавек. А вось дзе ўзяць гэтых людзей — яшчэ пытанне.

Першы стымул — дапамога

Традыцыйная для Захаду практыка — пражыванне ў адным, а праца — у іншым месцы. Сёння на Дрыбіншчыне не выключаюць, што праблему «дэфіцыту кадраў» можна вырашыць менавіта такім чынам, у прыватнасці, шляхам падвозу людзей. Але ёсць тут і яшчэ адзін рэзерв. Падлікі сведчаць, што агульная колькасць працаздольных жыхароў раёна складае каля 6 тысяч чалавек, а занята ў мясцовай эканоміцы толькі 4,9 тысячы.

Безумоўна, дзякуючы невялікім адлегласцям хтосьці з дрыбінцаў уладкаваўся ў Магілёве ці Горках, другія па завядзёнцы падаліся ў Расію, трэція не будуць працаваць ні пры якіх умовах. А чацвёртыя... проста сышлі «ў цень».

— Праблему з кадрамі можна было б вырашыць перш-наперш за кошт тых, хто не мае афіцыйнага занятку, і галоўная задача ў гэтым плане — легалізаваць гэтых людзей, — зазначае Аляксандр Рынг. — Аднак вядома: чалавек пойдзе рэгістравацца ў тую ж службу занятасці толькі тады, калі палічыць тое выгадным. І тут не апошнюю ролю магло б адыграць рашэнне аб павелічэнні дапамогі па беспрацоўі, паступовае набліжэнне яе да бюджэту пражыткавага мінімуму. Бо цяперашні сярэдні памер выплат у 47 тысяч рублёў зацікавіць проста не ў стане. Як, дарэчы, нельга лічыць стымулам і той факт, што сама дапамога рэальна прызначаецца не ўсім.

Сяргей ГРЫБ.

Дрыбінскі раён.

ТЭМА ДНЯ

Патрабуйце! Але ў межах закона

На чым сёння павінна акцэнтавацца ўвага кіраўнікоў першаснага звяна ўлады? З гэтага пытання пачаў сустрэчу са старшынямі сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксей СЦЕПАНЕНКА.

Сёння, паведаміў ён, ва ўсіх абласцях рэспублікі працуюць камісіі, якія правяраюць стан спраў у сістэме сельскіх Саветаў — на прадмет таго, ці ўдалося за апошнія гады павысіць іх ролю і аўтарытэт у вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння людзей. Галоўная мэта дзейнасці камісій — не столькі кагосьці пакрытыкаваць ці пакараць, колькі паглядзець, што ж насамрэч адбываецца на месцах, прасачыць за дынамікай, выявіць, што і ў які бок змянілася ў рабоце мясцовай улады першаснага ўзроўню, вылучыць тыя праблемы, якія тармозяць працэс развіцця.

— На сваёй тэрыторыі вы павінны дамагацца выканання ўсіх заканадаўчых актаў. Але за аснову неабходна ўзяць 4 нарматыўныя дакументы, — сказаў, звяртаючыся да прысутных, Аляксей Сцепаненка.

Першы з іх — гэта **Пратакол даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які стаў вынікам нарады ад 18 мая 2006 года, прысвечанай павышэнню ролі органаў улады першаснага ўзроўню ў вырашэнні праблем жыццезабеспячэння насельніцтва**. Зыходзячы з гэтага дакумента, галоўная мэта мясцовых уладных структур — забеспячэнне годнага ўзроўню жыццядзейнасці праз узмацненне работы з людзьмі.

— Вы знаходзіцеся на «пярэднім краі» і з'яўляецеся, калі выказвацца вобразна, буферам дзяржавы, якому заўсёды выпадае трымаць першы ўдар. А значыць, павінны адчуваць усе праблемы і «ўзбройваць» імі іншых, у тым ліку і Савет па ўзаемадзеянні. Таму што ад вырашэння гэтых праблем залежыць настрой людзей і іх стаўленне да ўлады.

Не менш важны момант — выкананне на падуладнай тэрыторыі ўсіх нарматыўных заканадаўчых актаў, якія толькі існуюць. Нарматыўная база ахоплівае сёння практычна ўсе бакі жыцця. Проста яе трэба ведаць, ёю трэба цікавіцца і не баяцца прымяняць на практыцы.

— Не бойцеся адстойваць сваё меркаванне, калі яно падмацаванае наяўнымі законамі. Час ужо памяняўся, надвор'е іншае. Дамагайцеся, каб і гаспадарчыя суб'екты, і ўсе, хто мае дачыненне да вырашэння праблем людзей на вашай тэрыторыі, выконвалі ўсё, што павінны. Калі ж не выконваюць — адказваць за гэта будзеце вы. Бо палітыка дзяржавы сёння накіравана на тое, каб «цэнтр цяжару» ў вырашэнні праблем жыццезабеспячэння паступова перанесці на нізавы ўзровень.

Трэба даваць адпор тым службам, якія навязваюць вам свае абавязкі.

Другі дакумент, якім, паводле слоў сакратара Савета па ўзаемадзеянні, павінны кіравацца ў сваёй штодзённай працы сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў, — **Дырэктыва Прэзідэнта № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату»**.

— Пільная ўвага да работы Саветаў дэпутатаў першаснага ўзроўню тлумачыцца і тым, што замест дэбюракратызацыі там з'явілася сцэльная... бюракратызацыя. І ў першую чаргу яна характэрная для тых сельвыканкамаў, чые кіраўнікі, пакорліва схіліўшы галаву, выконваюць усе распараджэнні, якія дасылаюць ім раённыя службы і структуры. Кожны павінен рабіць сваю справу, а не перакладваць яе на вашы плечы. Калі вы ўважліва прачытаеце Дырэктыву № 2, то знойдзеце там адказы на гэтыя пытанні. У любым выпадку, трэба даваць адпор тым службам, якія навязваюць вам свае абавязкі, патрабуюць справаздачы. Тым больш, што сёння ў сельвыканкамах працуюць у сярэднім па 2—3 чалавекі, а не па 7—8 ці нават 10, як некалі. Калі нейкія звесткі праходзяць праз тэрытарыяльныя органы статыстыкі, іх не мае права запытваць ні адна служба. А мы ўжо дайшлі да таго, што раённы санітарны ўрач выдае старшыні сельскага Савета распараджэнне аб хларыраванні калодзежаў, а начальнік ДАІ патрабуе звесткі аб колькасці святлоадбівальнікаў...

На думку Аляксея Сцепаненкі, ва ўзнікненні такой сітуацыі вінаватыя і самі кіраўнікі першаснага ўзроўню ўлады — менавіта яны прапускаюць падобныя «ініцыятывы» праз рашэнне сельвыканкама, часам нават у рабочым парадку, без абмеркавання.

Наступны «настольны дакумент» для сельскага Савета — **Указ Прэзідэнта краіны № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва»**.

— Вы можаце сёння сказаць, што ўказ не працуе. Наадварот — яго рэалізацыя ідзе нават больш хуткімі тэмпамі, чым чакалася. Матэрыяльную базу сельскіх Саветаў умацавалі, зарплату кіраўнікам першаснага звяна ўлады паднялі, прававыя асновы для вашай работы стварылі... Вы вось часам крыўдзіцеся, што ва ўказе закранута «не ўсё». Але «ўсё» за адзін раз зрабіць нельга, гэта прыходзіць у працэсе, паступова. Затое нарэшце зроблена галоўнае — вызначаны даходныя крыніцы і расходныя паўнамоцтвы вашых бюджэтаў. Вы, магчыма, будзеце са мной спрачацца: маўляў, бюджэт стаў горшы. Безумоўна, за год-два яго не павялічыш, але вам дадзена магчымасць стварыць падатковую базу.

Яшчэ адным дакументам, якім павінны кіравацца ў сваёй штодзённай дзейнасці старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў, з'яўляецца **Пратакол пасяджэння калегіі Адміністрацыі Прэзідэнта ад 27 снежня 2007 года «Аб рабоце абласных выканаўчых камітэтаў па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання пярвічнага ўзроўню ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва»**.

— Сёння наша галоўная мэта — максімальна разгрузіць Саветы ад неўласцівых ім функцый, пазбавіць іх ад адказнасці за вырашэнне гаспадарчых пытанняў, — падкрэсліў Аляксей Сцепаненка. — Хаця цалкам ад гэтых праблем яны ўсё адно не адыдуць.

Спачатку — яшчэ ў 2003—2004 гадах — з балансаў сельскіх Саветаў «знялі» клубы, ФАПы, дзіцячыя садкі. Далей — цеплавыя сеткі, водазабеспячэнне, водаадвядзенне і г.д. Той, хто быў больш кемлівы, хутчэй перадаў іх на баланс ЖКГ. Сёння перадаваць стала больш праблематычна...

Асабліва вялікая праблема з перадачай на баланс дарог — не транзітных, а ўнутрыгаспадарчых, унутрыпасялковых. Некалькі разоў гэта пытанне разглядалася на пасяджэннях Савета па ўзаемадзеянні, быў праведзены «круглы стол» з удзелам усіх зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў і службаў. У выніку 3 снежня 2007 г. з'явілася Пастанова Савета Міністраў «Аб некаторых пытаннях будаўніцтва, рэканструкцыі, эксплуатацыі, утрымання і рамонту вуліц населеных пунктаў», у адпаведнасці з якім «адказным» за вуліцы было прызначана Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Разам з тым мне часта даводзіцца ад вас чуць: маўляў, да цяперашняга часу вуліцы населеных пунктаў ніхто так і не прыняў. І гэта — праўда, якая сведчыць аб адсутнасці цвёрдай пазіцыі па дадзеным пытанні ў некаторых губернатараў. Але літаральна ў апошнія тыдні рашэнне аб перадачы вуліц на баланс спецыялізаваных арганізацый нарэшце прынялі Гомель, Гродна, Мінск і Брэст. Як бачыце, працэс быццам бы пайшоў. Праўда, я не лунаю ў аблоках з гэтай нагоды. Адна рэч — прыняць на баланс. Іншая — знайсці пад гэта грошы... У любым выпадку, вырашэнне праблемы ўскладзена на Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БАЕЦ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ларыса Феліксаўна першая заахвоціла суседзяў паставіць у пад'ездзе металічныя дзверы, каб хоць неяк захаваць чысціню. Але і гэта не стала панацэяй. Нецвярозыя грамадзяне неаднаразова ламалі замок, каб трапіць усярэдзіну. «Давялося ліквідаваць усе лавачкі ля пад'ездаў, — гаворыць Ларыса Феліксаўна. — Аб гэтым папрасілі самі жыльцы, бо іншым чынам немагчыма было пазбавіцца ад алкаголікаў».

Асаблівую ўвагу члены КГТСа №101 надаюць пытанням добраўпарадкавання і азелянення. Аднак і з гэтым узнікаюць цяжкасці: «Калі мы толькі перасяліліся сюды, тут быў голы мікрараён, — узгадвае старшыня тэрытарыяльнага камітэта. — Штогод мы высаджваем па 60-90 дрэўцаў, аднак з-за таго, што глеба тут гліністая, яны вельмі дрэнна прыжываюцца. Нам патрэбны спецыяліст, які валодае тэхналогіяй пасадкі».

На перакрыжаванні вуліц Кунцаўшчына і Прытыцкага служба зеленбуда пару гадоў таму высадзіла скверык. Каб ён не засох, мясцовыя жыхары на чале з Ларысай Феліксаўнай палівалі яго ўручную. І дрэўцы выратавалі. А потым жыхары мікрараёна даведаліся, што сквер плануецца знесці, а на яго месцы пабудаваць кавярню і казіно. Людзі тады ішлі ў КТГС цэлымі дэлегацыямі. Прасілі захаваць сквер. «Мы шарэнгай усталі на абарону сквера і ў рэшце рэшт адстаялі яго, — узгадвае пенсіянерка. — Пад казіно былі арэндаваны памяшканні ў наяўным будынку па вуліцы Прытыцкага, а кавярню ўвогуле не сталі будаваць».

Гаворачы аб азеляненні і добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый, нельга абмінуць увагай злабадзённую праблему паркоўкі, актуальную і для Кунцаўшчыны. «Людзі ставяць аўтамабілі проста на клумбы, — абураецца старшыня, — разрылі машынамі ўсю зялёную зону. Я спачатку звярталася ў міліцыю, але там сказалі, што гэта не іх клопат, маўляў, выклікайце дарожную службу. Я цяпер так і раблю. Яны прыязджаюць, штрафуюць уладальнікаў аўто... Я разумею: дзесьці аўтамабілі паркаваць трэба, і часта іх проста няма дзе паставіць. Дамы вялікія, дванаццаціпавярховыя, а дворыкі маленькія. Мы з разуменнем ставімся да праблем аўтааматараў — калі ласка, паркуйце ў двары, але ж не на зялёнай зоне, не на дзіцячых пляцоўках!»

На планёрках у кіраўніка раённай адміністрацыі, перад дэпутатамі гарсавета і Палаты прадстаўнікоў Ларыса Феліксаўна неаднаразова выносіла на разгляд наступнае балючае пытанне.

— Пабудавалі побач з намі станцыю метро «Каменная горка». Цяпер тут пастаянна мора народу. А прыбіральняў няма! І людзі ператвараюць у прыбіральні нашы дварыпад'ездзі, наш скверык! Няўжо так цяжка паставіць біятуалеты?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Актывісты камітэта грамадскага самакіравання Аляксей Фёдаравіч КАЛІВЕРДА і яго жонка Марыя Іосіфаўна.

Дзякуючы намаганням Ларысы Феліксаўны, перамогай жыльцоў скончылася барацьба дома № 78 на вуліцы Прытыцкага з замежнай кампаніяй, якая распачала ўзвядзенне медыцынскага цэнтра. Грошы ўклалі туды вялікія, аднак пры праектаванні не вытрымалі санітарныя нормы адлегласці. Людзі засталіся б без сонечнага святла ў кватэрах і без дваровай тэрыторыі.

— Мы сабралі 702 подпісы супраць будаўніцтва, — расказвае старшыня КГТСа. — Куды толькі з імі ні звярталіся: і да дэпутатаў, і ў Савет Міністраў. Пакуль мы ваявалі, мне пастаянна тэлефанавалі дадому, пагражалі... А дапамог нам Камітэт дзяржкантролю. Інтарэсы жыльцоў адстаялі, будоўлю адмянілі.

Ужо тры гады Ларыса Феліксаўна спрабуе вырашыць яшчэ адну праблему. На дваровай тэрыторыі дамоў №№ 150, 134, 136 па вуліцы Прытыцкага складскія памяшканні будынка крамы ўзяла ў арэнду страхавая фірма, якая афармляе страхоўку і на аўтамабілі. Ніякай аглядныя пляцоўкі ў дварыне прадугледжана. Машыны ставяцца дзе заўгодна, перад самымі пад'ездамі. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і з-за таго, што ў адным будынку размяшчаецца адразу некалькі крамаў («Рублёўскі», «Караван», «Сцяжынка»).

— Мы падлічылі, што за дзень тут бывае да 150 машын, якія падвозяць сюды тавары! — расхвалявалася мая суразмоўніца. — І ўсе едуць праз наш двор. А дадайце сюды аўтамабілі, на якія афармляе дакументы страхавая кампанія. Уяўляеце, якая там загазаванасць? Мы просім: прыбярыце адсюль аўтамабілі! Няхай страхавая кампанія застаецца, аднак не афармляе машыны ў нашым двары. Тым больш, што праз дарогу працуе яшчэ адна страхавая кампанія — з вялікай абсталяванай аглядной пляцоўкай.

Напачатку ў Фрунзенскім раёне было створана 18 КТГСаў . Цяпер засталося толькі 10. У камітэце тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, які ўзначальвае Ларыса Феліксаўна, раней налічвалася каля 40 членаў, сёння — 11.

— Гэта ўсё тыя ж старажылы, многім з якіх сёння па 76, па 78, па 80 гадоў, — уздыхае Савінава. — Калі ствараўся КТГС, мне было 49 гадоў, а цяпер 69. Немагчыма знайсці замену сярод маладога пакалення — бясплатна ніхто не хоча працаваць. Узнікаюць праблемы і з выбарам старшых дамоў і пад'ездаў. Удзел у суботніках бярэ толькі сталае пакаленне, людзі актыўныя, неабыякавыя. А маладых не зацягнуць.

Тым не менш, «старая гвардыя» КТГСа №101 працягвае працаваць на карысць жыхароў мікрараёна. Удзельнічае ў прыёмцы работ па падрыхтоўцы дамоў да эксплуатацыі ў зімовы перыяд, дапамагае старым людзям, збірае адзенне для малазабяспечаных сем'яў, праводзіць конкурсы на лепшую клумбу, двор, пад'езд, балкон. Людзі па-ранейшаму прыходзяць у КТГС са сваімі скаргамі, бедамі, праблемамі. Напрыклад, маладыя бацькі наракаюць, што дзетак даводзіцца вадзіць у дзіцячыя садкі іншых мікрараёнаў, хаця пад бокам стаяць два спецыялізаваныя будынкі. Быў перыяд, калі колькасць дзетак значна скарацілася, і ў абодвух садках размясцілі іншыя структуры. Цяпер бацькі просяць вярнуць будынкі пад садкі... Узнікаюць скаргі і на ўцяпленне дамоў. «Нашы 12-павярхоўкі былі ўзведзены з парушэннем тэхналогій, яны «халодныя», — кажа Ларыса Феліксаўна. — Нам паабяцалі, што ў 2009 годзе дамы ўцепляць. У выніку ўцяплілі толькі 12-ы, 11-ы і 10-ы паверхі. А на астатніх паверхах па-ранейшаму халадэча».

— Увогуле, КТГСы патрэбны, — перакананая пенсіянерка. — Там, дзе яны працуюць, няма кінутых на волю лёсу людзей. Цяжка бывае старшыні, членам камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, затое сацыяльна неабароненыя людзі, ад зінокія старыя, а таксама неўладкаваныя сем'і ў нас навідавоку.

Інга МІНДАЛЁВА.

Патрабуйце! Але ў межах закона

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Таксама павінны быць перададзены на баланс камунальных службаў грамадскія калодзежы — гэта, дарэчы, трэба было зрабіць яшчэ да 1 студзеня, згодна з адпаведным лістом міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Калі ў вас такая работа сёння не праводзіцца, вінаватыя вы самі, — сказаў Аляксей Сцепаненка.

Што датычыцца грамадскіх могілак, то яшчэ ў лістападзе 2001 года быў прыняты закон аб пахаванні, дзе запісана: утрыманне месцаў пахавання ажыццяўляецца спецыялізаванай арганізацыяй за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

— Інакш кажучы, вы маеце поўнае права патрабаваць ад раённых уладаў, каб у ваш бюджэт закладваліся грошы менавіта пад гэта. Між тым, многія з вас нават не падумалі выкарыстаць дадзеную законам магчымасць і па звычцы наводзяць парадак на могілках за кошт сродкаў, выдзеленых на добраўпарадкаванне. А значыць, зноў шукаюць нейкія «абыходныя шляхі»... Пры наяўнасці ж канкрэтных грошай вы зможаце (і павінны!) заключаць дагавор са спецыялізаванай камунальнай арганізацыяй на абслугоўванне могілак. Прасіце пад гэта грошы!

Закранаючы тэму фарміравання бюджэту першаснага ўзроўню, Аляксей Сцепаненка адзначыў, што з 1 студзеня наступнага года адмяняецца залічэнне падатка з продажу, які раней з'яўляўся адной з найбольш адчувальных крыніц папаўнення сельсавецкага «кашалька».

— На маю думку, сёння неабходна ўсё ж даць раённым Саветам права пакідаць у першасных бюджэтах частку падаходнага падатку як рэгулюючага. А з цягам часу можна будзе падумаць і пра тое, каб накіроўваць падаходны падатак на развіццё менавіта той тэрыторыі, дзе грамадзянін пражывае і дзе, адпаведна, ён карыстаецца ўсімі сацыяльнымі паслугамі. Думаю, мы да гэтага абавязкова прыйдзем.

Будуць у сельсавета грошы — будуць вырашацца і праблемы. Гэта практычна можна лічыць аксіёмай сённяшняга дня. Але наяўнасць грошай — толькі палова справы. Неабходна ведаць, як і на што іх патраціць. Аляксей Сцепаненка парэкамендаваў прысутным больш уважліва чытаць Указ Прэзідэнта № 21.

— Там дакладна прапісана, на якія мэты вы маеце права выдаткаваць свае сродкі. Бо многія з вас, атрымаўшы грошы, адразу кідаюцца ставіць агароджы... Зразумела, патрэбна і гэта. Але калі мы пачнём узводзіць грамадзянам агароджы за бюджэтныя грошы, то вельмі хутка самім «на жыццё» не хопіць. Вы павінны ведаць літаральна па пунктах, на што неабходна патраціцца, а не проста ездзіць у райвыканкам і прасіць там: «Дайце мне грошы!». Падлічыце, якая сума можа спатрэбіцца вам у наступным годзе, і ў найбліжэйшы час падайце лічбы ў райфінаддзел. Гэта не азначае, што вам дадуць усё і адразу. Але ў любым выпадку там будуць ведаць канкрэтныя, аб'ектыўныя патрэбы канкрэтнага сельсавета. І, магчыма, перастануць выдзяляць вам грошы па прынцыпе «хто да начальства бліжэйшы», зыходзячы з суб'ектыўных меркаванняў.

Сакратар Савета па ўзаемадзеянні падкрэсліў, што сёння неабходна ўзнімаць якасць жыцця ў вёсках і пасёлках.

— А мы агароджы пафарбавалі, асфальт паклалі — і рады, і рапартуем, і прымаем рашэнне аб узвядзенні новага аграгарадка... Трэба ісці далей, думаць пра якасць вады, паветра, медыцынскага абслугоўвання... Мне ў адной школе паказалі сшытак, дзе робяцца адзнакі аб правядзенні праверкі стану здароўя дзяцей, ставяцца, так бы мовіць, «птушачкі». Навошта і дзеля чаго? Каго мы такім чынам падманваем, як не саміх сябе? Ці нехта ўпэўнены, што медсястра ФАПа можа правесці кваліфікаваны агляд?.. Вось пра гэта вам таксама трэба думаць. Дзеля гэтага мы і імкнёмся вызваліць вас ад гаспадарчых праблем. Працэс «вызвалення» зойме не адзін дзень і нават не адзін год, але галоўнае, ён пачаўся.

Цяпер наша агульная задача — прымусіць службы і ведамствы працаваць у вашых інтарэсах разам з вамі на вашай тэрыторыі для забеспячэння патрэбаў вашых грамадзян.

Наталля КАРПЕНКА.

ПЫТАННЕ ПА ТЭМЕ

ад старшыні Асвейскага сельскага Савета дэпутатаў Верхнядзвінскага раёна Валянціны ГАМАНЬКО:

— У 2004 годзе наш сельскі Савет у якасці ўзнагароды за добрую работу атрымаў трактар, але яго забралі для патрэбаў ЖКГ. Я пацікавілася тады — а хто будзе вуліцы чысціць? Ці вы іх таксама забераце? Але вуліцы пакінулі нам... Сёлета нас зноў прэміявалі — за 1-е месца па добраўпарадкаванні. Хацелі мы купіць газонакасілку, але ўжо не маем права, бо сельскі Савет — не гаспадарчая арганізацыя. Між тым, вуліцы па-ранейшаму засталіся за намі.

На тэрыторыі Асвеі ёсць участак ЖКГ, але там не займаюцца добраўпарадкаваннем! У іх «кампетэнцыю» ўваходзіць толькі водазабеспячэнне і водаадвядзенне. Колькасць штатных адзінак гэтага ўчастка якой была раней, яшчэ да ўвядзення аграгарадка, такой і засталася — дадатковыя адзінкі там не ўведзеныя... Вось і атрымліваецца, што ўсе прэтэнзіі і нараканні з нагоды добраўпарадкавання датычацца толькі сельскага Савета — з яго пытаюцца, яму выпісваюць штрафы... Участкі ЖКГ даўно неабходна ўзмацніць, тым больш у аграгарадках. Сёння на іх баланс многае перадалі — а працаваць няма каму.

ВІНШУЕМ!

ПЕРАМАГЛІ... У НЕЗВЫЧАЙНЫМ КОНКУРСЕ

Старшыні сельскіх Саветаў сталі «Жанчынамі года»

У Брэсцкай вобласці правялі незвычайны конкурс. Ён доўжыўся амаль паўгода. Арганізатарам выступіла абласная арганізацыя «Беларускага саюза жанчын». Сутнасць шматэтапнага агляду заключалася ў тым, каб знайсці лепшага старшыню сельскага Савета сярод жанчын. Вынікі кожнага адрэзка конкурснага марафону падводзіла спецыяльна абраная камісія. І ў рэшце рэшт выбралі трох пераможцаў, якіх і аб'явілі на ўрачыстым мерапрыемстве ў Антопалі.

У Доме культуры пасёлка Антопаль Драгічынскага раёна сабраліся ўсе намінанткі конкурсу — прадстаўнікі дзесяці раёнаў. Усе яны мелі магчымасць выступіць, усе атрымалі сувеніры на памяць і ўдзячныя апладысменты залы. І гэта было цікава, бо кожная са старшынь выступіла ў нечаканым, так бы мовіць, амплуа. Цяперашні кіраўнік мясцовага органа ўлады — чалавек за рулём, мабільны, камунікабельны, вечна заклапочаны недахопам грошай на тыя самыя падсыпку, падкошванне і ўборку смецця. Але гэта яшчэ не ўсё.

На мерапрыемстве кожную са старшынь можна было ацаніць як гаспадыню, кулінарку, майстрыху (канкурсанткі прывезлі з сабой свае выпечкі, узоры рукадзелля) і галоўнае — асобу, заклапочаную шляхамі развіцця грамадства, станам роднай зямлі. Адны ў сваіх хатніх заданнях — выступленнях-эсэ — гаварылі пра вопыт захавання народных традыцый і самабытнасці свайго краю. Іншыя расказвалі пра клопат аб ветэранах, старых, адзінокіх людзях. Канкурсанткі яшчэ падрыхтавалі ўнушальных памераў фотаальбомы, з якіх можна было даведацца пра гісторыю сельсавета апошняга дзесяцігоддзя альбо пяцігоддзя, пра яго слаўных і працавітых людзей.

Ганна ШКАРУПА, Марыя ШКАБАРА, Таццяна ІЛЬЯШЭВІЧ.

І вось надышоў кульмінацыйны момант, калі актывістка абласной жаночай арганізацыі і галоўны спонсар мерапрыемства Наталля Ільніцкая, дырэктар ААТ «Лагуна», адкрыла запаветны канверт і абвясціла пераможцаў. Імі сталі Ганна Шкарупа, старшыня Азяцкага сельскага Савета Жабінкаўскага раёна, Таццяна Ільяшэвіч, старшыня Харaўскога сельскага Савета Пружанскага раёна і Марыя Шкабара, старшыня Сялецкага сельскага Савета Бярозаўскага раёна.

Цікава, што ўсе гэтыя мілыя жанчыны і дасведчаныя кіраўнікі ў розны час былі геаінямі артыкулаў «МС». Кожная з іх мае багаты вопыт працы на сваёй пасадзе. Дыплом І ступені атрымала Ганна Шкарупа, якая 14 гадоў узначальвае Азяцкі сельсавет. Амаль чатыры дзесяцігоддзі таму Ганна маладым спецыялістам прыехала ў Жабінкаўскі раён і засталася тут назаўсёды. Спачатку працавала ў мясцовай гаспадарцы, потым яе абралі старшынёй прафкама тагачаснага калгаса «Беларусь». 16-гадовы вопыт работы з людзьмі ў сістэме прафсаюзаў вельмі спатрэбіўся на новай пасадзе. І цяпер сваёй галоўнай задачай Ганна Васільеўна лічыць работу з насельніцтвам, клопат пра тых, хто ўсё жыццё працаваў на зямлі. Старшыня сельскага Савета ўяўляе сабой прыклад для аднавяскоўцаў. Сын атрымаў адукацыю і вярнуўся ў родныя мясціны. Працуе цяпер у сельгаспрадпрыемстве «Азяты». А Ганна Васільеўна з мужам трымаюць вялікую падсобную гаспадарку, як спакон веку прынята ў вёсцы.

Таццяна Ільяшэвіч з Харавы сёлета адзначыць юбілей — 20-годдзе працы старшынёй сельскага Савета. Таццяна Аляксееўна нарадзілася і вырасла на тэрыторыі свайго сельсавета. Калі яе толькі абралі на гэту пасаду, старшыні мясцовых гаспадарак «скінуліся» і купілі «Запарожац» для мясцовай улады. Адлегласці там вялікія, а гаспадаркі, на шчасце, былі заможныя. Кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў палічылі, што нядобра старшыні Савета на веласіпедзе з вёскі ў вёску ездзіць. Зараз сельсавет мае другую машыну. Але з кіраўніцтвам гаспадарак Таццяна Ільяшэвіч імкнецца агульную мову заўсёды знаходзіць. Бо, як ні старайся, як ні круціся, а ўсё ж раз-пораз даводзіцца звяртацца па дапамогу да гаспадарнікаў, у якіх тэхніка, працоўная сіла, магчымасці.

Марыя Шкабара з Сяльца — былы педагог. Гуманітарны стыль работы хоць крышачку, але прысутнічае ва ўсіх яе справах. Шмат увагі надае Марыя Іванаўна захаванню гісторыі, традыцый сваёй вёскі, якая даўно адзначыла 600-годдзе. Мястэчка некалі было цэнтрам гандлю і рамесніцтва. Яе, старшыні сельсавета, стараннем і руплівасцю тут адрадзілі нават былыя знакамітыя кірмашы. Варты ўвагі і перайманння вопыт Сялецкага сельсавета па рабоце з сям'ёй, асабліва з цяжкімі, праблемнымі сем'ямі. Тут нават сесіі праводзілі, на якіх прысутнічалі школьнікі, іх бацькі і настаўнікі.

І яшчэ. Марыя Іванаўна была адзіная на мерапрыемстве, хто выступаў толькі па-беларуску. Яе прыгожая, сакавітая мова проста захапляла аўдыторыю.

Разам з памятнымі сувенірамі пераможцы конкурсу атрымалі дыпломы, на якіх яны былі абвешчаны «Жанчынамі года» сярод старшынь сельскіх Саветаў вобласці. Як заўважыла намеснік начальніка абласнога ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Ірына Арабей, яна ж старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі «Беларускага саюза жанчын», амаль трэць сельсаветаў вобласці ўзначальваюць жанчыны. Гэтым конкурсам жаночая арганізацыя хацела выказаць падтрымаць іх. А гераіні імпрэзы ў сваю чаргу выказалі прапанову заснаваць прафесійнае свята работніка сельскага Савета. А то ва ўсіх такое свята ёсць, а ў іх няма. Неяк несправядліва атрымліваецца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

ВЕЦЕР АГНЮ ДАПАМОГ...

Пакуль што не высветлены прычыны буйнога пажару, які адбыўся ў першы майскі дзень ноччу ў вёсцы Букча Лельчыцкага раёна.

Вядома, што спачатку загарэўся дом, у якім знаходзіліся два 34-гадовыя мужчыны, якія прыехалі сюды з Пінска. Потым у хаце выбухнуў газавы балон. Моцны вецер падхапіў полымя, і агонь перакінуўся на суседні дом, які таксама згарэў поўнасцю. Ад пажару моцна пацярпеў яшчэ адзін дом і 7 надворных пабудоў.

Нягледзячы на тое, што буйны пажар, які бушаваў ў лясах Лельчыцкага раёна і пашкодзіў раней больш за 500 гектараў, лакалізаваны, супрацоўнікі пажарнай аховы працягваюць працаваць у кругласутачным рэжыме.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГАРЭЛКА «КРОЧЫЦЬ» ЗА БУГ

Для павелічэння экспарту алкагольнай прадукцыі прынятае рашэнне аб стварэнні сумеснага беларуска-польскага таварыства з абмежаванай адказнасцю. Заснавальнікамі новага прадпрыемства сталі РУП «Мінск Крышталь» і канцэрн «Белдзяржхарчпрам», а таксама польская фірма «J&J Decor».

Галоўнай задачай новага прадпрыемства стане арганізацыя гандлю «моцнымі» напоямі на тэрыторыі Польшчы і іншых краін Еўрасаюза. Пры гэтым, як адзначыла прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына Гусева, сёння па аб'ёмах спажывання гарэлкі Польшча займае чацвёртае месца ў свеце — пасля Расіі, Украіны і ЗША. Пазалетась агульная ёмістасць польскага рынку лікёрагарэлачных вырабаў склала 240,8 млн, летась — 244,6 млн, а да 2012 года яна, як мяркуецца, узрасце да 255,5 млн дэкалітраў — гэта адпавядае прыкладна 6-7 млрд еўра.

Сяргей ГРЫБ.

ХТО Ў ЛЕС, А ХТОСЬЦІ — З ЛЕСУ

Калі супрацоўнікам Гомельскай аблінспекцыі паведамілі пра незаконную здабычу рыбы на рацэ Сож паблізу колішняга населенага пункта Рыслава Веткаўскага раёна, тыя выехалі на месца.

На лясной дарозе быў заўважаны легкавы аўтамабіль, у якім, як меркавалася, і знаходзіліся браканьеры. Пры спробе спыніць яго, машына рэзка затармазіла, а з салона выскачылі двое невядомых і кінуліся ў лес. У багажніку былі знойдзены доказы супрацьпраўных дзеянняў: сеткі і рыба. Міліцыянеры канфіскавалі аўтамабіль.

А ў Ганцавіцкім раёне былі ўстаноўлены імёны двух падазроных, якія ў лясным масіве паблізу вёскі Люсіна ў выніку незаконнай высечкі дрэў нанеслі прыродзе ўрон у асабліва буйным памеры — на суму 30,8 мільёна рублёў (880 базавых велічынь).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАННЕ

РАЗ, ДВА... ПРАДАДЗЕНА!

Цана аднаго з участкаў павышалася на аўкцыёне 38 (!) разоў

У адміністрацыйным будынку Абухаўскага сельскага Савета адбыўся аўкцыён па продажы ў прыватную ўласнасць зямельных участкаў. Іх мэтавае прызначэнне аднолькавае — для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома. Усе восем участкаў «знайшлі» сваіх гаспадароў. Гэта людзі, якія не значацца сярод асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, але жадаюць будавацца ў сельскай мясцовасці.

Мінімальны кошт лота склаў 536 тысяч 340 рублёў, а максімальны — ажно 28 мільёнаў 661 тысячу 830 рублёў. Увогуле ж ад аўкцыёну ў бюджэт сельвыканкама паступіла 42 мільёны 968 тысяч 300 рублёў.

Гэта быў ужо трэці па ліку аўкцыён, што праводзіўся Абухаўскім сельскім выканаўчым камітэтам. Вынік тут, як зазначыла перад яго пачаткам старшыня сельвыканкама Алена Піхун, заўсёды непрадказальны. Напрыклад, на папярэднім аўкцыёне ўчастак у вёсцы Курпікі быў амаль удвая даражэйшым, чым у аграгарадку Абухава. Пэўна, вызначальную ролю тут адыграла месцазнаходжанне першага зямельнага ўчастка (непадалёк ад ракі Котра).

Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што і на гэты раз не абышлося без «сюрпрызаў», у сэнсе, без вельмі напружанага суперніцтва за права валодання некаторымі ўчасткамі зямлі. Але — па парадку.

... Аўкцыяніст, галоўны спецыяліст землеўпарадкавальнай геадэзічнай службы Гродзенскага раёна Уладзімір Квенцар просіць усіх прысутных адключыць мабільныя тэлефоны, нагадвае ўдзельнікам аўкцыёну яго ўмовы і раіць не хвалявацца. Для кожнага ўчастка вызначаны свой кошт зямлі — згодна з кадастравай ацэнкай, якая залежыць ад размешчаных там камунікацый (уздоўж участка праходзіць сетка водазабеспячэння, зямельны ўчастак прылягае да дарогі з асфальтавым альбо грунтавым пакрыццём і г.д.), адлегласці ад абласнога цэнтра і іншых фактараў. Неабходную дакументацыю на ўсе восем участкаў рыхтавала раённая землеўпарадкавальна-гэадэзічная служба. Прычым, калі б кожны з удзельнікаў аўкцыёну афармляў дакументацыю паасобку, то гэта каштавала б значна даражэй.

Аўкцыён па кожным з лотаў (на адзін з іх было трое прэтэндэнтаў, а на астатнія — па два) пачынаецца з загадзя вызначанай пачаткавай цаны. Аўкцыённы «крок» — 10 працэнтаў ад папярэдняй цаны, што называецца аўкцыяністам. Гэта значыць, што калі пачатковая цана складае 600 тысяч рублёў, то на другім этапе таргоў — ужо 660 тысяч, на трэцім — 720 тысяч рублёў і г.д., пакуль не вызначыцца пераможца.

Для продажу трох участкаў у вёсцы Курпікі і таксама трох у Агародніках спатрэбілася максімум шэсць «крокаў». Але гэта, як стала вядома пазней, была толькі прэлюдыя да заключнага дзейства аўкцыёну, якое датычылася двух участкаў у вёсцы Мігова. Суперніцтва за адзін з іх пачалося з цаны 773 тысячы 480 рублёў і завяршылася на суме ў 9 мільёнаў 218 тысяч рублёў. А заключны лот, «стартаваўшы» з 773 тысяч 480 рублёў, «фінішаваў» на 38-м(!) «кроку» сумай у 28 мільёнаў 661 тысяча 830 рублёў. Гэта стала нечаканасцю нават для арганізатараў аўкцыёну.

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку арганізацыі і правядзення аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць, зацверджаным пастановай Саўміна Беларусі ад 26 сакавіка 2008 года № 462, пераможца аўкцыёну на працягу дзесяці працоўных дзён са дня прыняцця выканкамам рашэння аб перадачы ўчастка ўносіць за яго плату, а таксама кампенсуе выдаткі, звязаныя з правядзеннем аўкцыёну і падрыхтоўкай неабходнай дакументацыі. У двухмесячны тэрмін пасля прыняцця выканкамам рашэння аб перадачы пераможцу зямельнага ўчастка ён абавязаны ажыццявіць дзяржаўную рэгістрацыю права прыватнай уласнасці на гэты ўчастак.

Каментарый старшыні Абухаўскага сельскага Савета дэпутатаў Алены ПІХУН:

— Заробленыя на аўкцыёнах сродкі паслужаць вырашэнню самых надзённых праблем на тэрыторыі сельсавета, у прыватнасці, можна выканаць многія мерапрыемствы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, могілак, міні-паліго-на для цвёрдых бытавых адходаў.

У мінулым годзе, дарэчы, нам удалося папоўніць свой бюджэт дзякуючы продажу на аўкцыёнах не толькі зямельных участкаў, але і размешчаных на нашай тэрыторыі былых аб'ектаў вайсковай часці, якая адтуль перадыслацыравалася. Фірма, якая стала ўласнікам гэтых будынкаў, павінна на працягу трох гадоў стварыць там працоўныя месцы. А сельвыканкаму рашэннем раённага выканаўчага камітэта было пералічана 92 мільёны рублёў — 45 працэнтаў ад выручанай на аўкцыёне сумы. Пераважную частку гэтых сродкаў мы выкарысталі на ліквідацыю аварыйных дрэваў на могілках і, акрамя таго, умацавалі матэрыяльна-тэхнічную базу сельвыканкама. На парадку дня — рамонт калодзежаў.

Варта адзначыць, што ў апошнія гады назіраецца тэндэнцыя: гараджане пайшлі ў вёску. Купляюць на аўкцыёнах зямельныя ўчасткі, прыводзяць у парадак закінутыя дамы альбо будуюць на іх месцах новыя. Аднаму чалавеку так захацелася мець дом у невялікай вёсачцы, што ён адшукаў спадчыннікаў ажно ў Адэскай вобласці, спецыяльна туды паехаў і афарміў усе неабходныя дакументы. Цяпер не пазнаць гэту, здавалася б, зусім бесперспектыўную сядзібу.

Ёсць спадчыннікі, якія спазніліся з афармленнем ва ўласнасць зямельных участкаў і размешчаных там пабудоў і цяпер не валодаюць неабходнымі дакументамі на дом, які застаўся пасля смерці іх бацькоў. Аднак зрабіць гэта ніколі не позна. Сёння праз суд такія пытанні вырашаюцца. Трэба спадчыннікам толькі мець жаданне займацца афармленнем дакументаў, якія сведчаць правы. А сельвыканкам можа аказаць людзям юрыдычную падтрымку.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

РАДАСЦІ ПРОСТАГА ГАСПАДАРА

Пенсіянер з Мілаславічаў, які сам сабраў трактар і трымае пчальнік, перакананы: чалавек з галавой і рукамі можа за любымі часамі жыць у вёсцы нябедна.

У вёсцы ў Клімавіцкім раёне, на самай беларуска-расійскай мяжы, жыццё ідзе асаблівым чынам. Прычым справа тут не ў сучасных выгодах — яны ўсе ёсць у аграгарадку. Нібыта ў такую далечыню крызіс і іншыя трывогі свету не дабіраюцца, альбо людзі па-іншаму ставяцца да іх. Тут свой лад жыцця і свае каштоўнасці.

МАЯ СЯМ'Я

Прыгожы дом на ціхай вясковай вулачцы: прыемныя фарбы, разныя налічнікі, спадарожнікавая талерка на сцяне. І гаспадары, якія цалкам задаволеныя сваім ціхім вясковым жыццём.

Аляксандр Ільіч Філіпенка па прафесіі чырванадрэўшчык, ён працаваў у школе настаўнікам працы. Яго жонка Ганна Іванаўна выкладала дзецям рускую мову і літаратуру.

— Мы ўсё жыццё разам: у школу разам, са школы разам, — узгадвае жанчына. — А пазнаёміліся на танцах, калі ён быў салдатам. Потым пайшоў з арміі, стаў вучыцца, і мы тры гады толькі перапісваліся. А калі зноў сустрэліся, то ён сказаў, што да месца працы без мяне не паедзе...

— Мы з жонкай цяпер сапфіравыя юбіляры, — хваліцца 70-гадовы Філіпенка. — Гэта значыць 45 гадоў сумеснага жыцця! У нас трое сыноў, добрыя нявесткі, унукі.

Дзеці даўно жывуць самастойна і прыязджаюць гасцяваць да бацькоў. Муж з жонкай занятыя хатняй гаспадаркай, а ў вольны час і для душы Ганна Іванаўна спявае ў хоры мясцовай Свята-Уваznясенскай царквы, а Аляксандр Ільіч робіць для храма драўляныя аздабленні.

МОЙ ТРАКТАР

Гэта мясцовая славутасць — не экспанат, а дзейная тэхніка. Аляксандр Ільіч заводзіць і хвацка выводзіць трактар з гаража. Ён нечым падобны на тэхнічную ілюстрацыю савецкай калектывізацыі, але адчуванне старызны падманлівае. Як высветлілася, на гэтым трактары Філіпенка апрацоўвае свае 30 сотак.

— Так што маё тэхнічнае хобі — занятак адначасова карысны і прыемны, — па-настаўніцку даводзіць Аляксандр Ільіч. — Праўда, калі я гэты трактар збіраў, колькі сметнікаў давялося наведаць! Рухавік ад станка, каробка перадач ад грузавога аўтамабіля. І добра працуе на бензіне.

Вялікай выгады, зазначыў гаспадар, у самастойным стварэнні трактара няма. Працаваць трэба шмат, і выдаткі немалыя. Але, прызнаецца Філіпенка, гэта цікава: такога дзіва ні ў кога няма! Ды і тэхніка яго слухаецца і добра служыць шмат гадоў.

— Добра мець рукастага мужа, — смяецца жонка. — У мяне ніколі не было пытанняў, куды пайшоў муж. Калі іншыя цягнуліся ў краму на горку выпіць і лясы тачыць, то ён заўсёды нешта робіць для сям'і і гаспадаркі.

МАЯ ХАТА

Дубовы буфет з інкрустацыямі, які стаіць у пакоі вясковага дома, можна смела перадаваць нашчадкам у спадчыну. Яго зрабіў сваімі рукамі Аляксандр Ільіч, і твор гаспадара напэўна будзе жыць яшчэ не меней за сотню гадоў. А можа і болей.

Філіпенка рабіў яго ў 1960-я гады, калі ў вёсцы яшчэ не было і электрычнасці. Малады чалавек толькі ажаніўся і хацеў зрабіць уражанне на жонку прыгожай мэбляй.

ЖОНКА І МУЖ ФІЛІПЕНКІ: «ДАЙ БОЖА, КАБ УСЕ ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ ТАК ЖЫЛІ!»

— Дуб рэзалі з бацькам уручную, а потым я яго апрацоўваў, — узгадвае майстар. — Рабіў буфет палову зімы, бо дзень быў кароткі, а ўвечары даводзілася працаваць пад лямпу з газай.

Да буфета ён зрабіў, таксама з дуба, стол і табурэткі. Гордасць майстра — шашкі і шахматы, зробленыя сваімі рукамі.

А Ганна Іванаўна аздобіла інтэр'ер вышыванкамі: ружы, алені, цыганка. Дарэчы, вышыванне крыжыкам зноў уваходзіць у моду: сучасныя эмансіпіраваныя жанчыны ў гарадах супакойваюць такім чынам нервы і ствараюць прыгожыя творы. Якраз у стылі Філіпенкаў: карысна і прыемна.

МОЙ МЁД

Пчальнік Філіпенкі — гэта невялікая агароджаная прастора, дзе стаяць два дзясяткі вулляў. На кожным — свая эмблема: сонейка, трохкутнік і іншыя малюнкі дапамагаюць пчолам знайсці свой дом.

— Чуеце гудзенне? — пытаецца пчаляр. — Вось гэты гук любыя нервы супакоіць. Я люблю сюды прыходзіць: пчолы гудуць, а я стрэс здымаю. Я самі пчолак болей люблю, чым мёд. За іх любоў да працы.

Тым не менш, мёд Філіпенкі лічаць важным складнікам здарова-га ладу жыцця. У іх доме ніколі не прапануюць гасцям чаю з цукрам: гаспадары завараць зёлкі і падуць на стол разам з мёдам.

— Ён лепей за любыя таблеткі, — перакананы Аляксандр Ільіч. — Мой метад: проста спажываць мёд у неабмежаванай колькасці.

— Правільна: разумныя людзі кажуць, што мёд ядуць не для таго, каб лячыцца, а каб не хварэць, — падхоплівае жонка.

Самым гаючым мілаславіцкі пчаляр лічыць майскі мёд, калі ўсё навокал квітнее. Але карысны любы яго від, галоўнае — каб прадукт быў, што называецца, сумленны.

Як адрозніць добры мёд ад дрэннага — адвечнае пытанне для спажыўца. Вадкі мёд, адказвае спецыяліст, павінен цячы ў нітку і не рвацца. Калі крапае, то, значыць, утрымлівае прымешкі ці няспелы.

— Але на сваё вока звычайны пакупнік наўрад ці здольны адрозніць якасны прадукт ад падробкі, таму трэба шукаць добрага пчаляра і набываць у яго, — раіць Філіпенка.

МОЙ ДАБРАБЫТ

— У нас крызісу няма, — кажуць муж з жонкай. — Мы атрымліваем дзве пенсіі, харчы сабе вырасцім. Карацей, самі сябе кормім і апранаем. Ды ў каго ёсць зямля, праца і рукі, у таго ніякага крызісу і быць не можа.

Аляксандр Ільіч калісьці атрымаў у сельскагаспадарчай акадэміі спецыяльнасць агранома і веды па вырошчванні пладовых дрэваў, агародніны, вінограду. Усё гэта спатрэбілася ў жыцці. Ва ўсякім разе, вінаграду выспявае на агародзе Філіпенкаў удосталь, каб есці самім і частаваць усіх знаёмых.

— Можна жыць у вёсцы нябедна! — настойвае Аляксандр Ільіч. — Трэба толькі працаваць, ды добра. А навіны я, вядома, слухаю, але не хачу ўнікаць ні ў які крызіс. На нашым падворку крызісу няма!

МАЯ РОДНАЯ ЗЯМЛЯ

Аляксандр Ільіч разумее Год роднай зямлі як час барацьбы з беспарадкам, якога яшчэ хапае на беларускай зямлі.

— На нашай зямлі ўсё добрае, але мы, людзі, часам бываем дрэннымі, — кажа гаспадар. — Трэба працаваць на зямлі, трымаць у парадку нашы лясы, не забывацца на экалогію.

Філіпенкі нагадалі вядомы прынцып Маленькага прынца: устаў раніцай — прывядзі сябе ў парадак, а потым і сваю планету.

— Таму трэба пачаць перш за ўсё з сябе: са сваёй гарадской кватэры і пад'езда, з вясковага падворка і вуліцы, — раіць Аляксандр Ільіч. — Трэба быць гаспадаром на сваёй зямлі!

МАЕ ЖЫЦЦЁ

Вясковыя людзі жывуць разумна. Дні праводзяць у працы, і пастаянны рух не дае арганізму заржавець. Доўгімі зімовымі вечарамі бавяць час за праглядам тэлеперадач і красвордамі.

Горад пужае Філіпенкаў: па іх словах, там не прыдумаеш, куды падзецца, ды і хочацца на схіле гадоў пажыць без мітусні і бегатні, у цішыні і спакоі.

— У нас тут сапраўдная добрая старасць, — прызнаецца Аляксандр Ільіч. — Мы шчаслівыя бацькі і гаспадары. Жадаю ўсім людзям здароўя, а таксама жыць і радавацца гэтаму жыццю.

Ілона ІВАНОВА.

Клімавіцкі раён.

«Звязда» ўзняла праблему...

«І ЧАМУ Ж ТЫ ТАКАЯ ДАРАГАЯ, ЦУКРОВАЯ ПУДРА?»

Няўжо мы ў Беларусі, вырабляючы цукру столькі, што з лішкам хапае не толькі на свае патрэбы, але і на экспарт, не ў стане адмовіцца ад імпарту цукровай пудры? Гэта што, звышскладаная вытворчасць, якая нам не па сілах? Няма спецыялістаў, абсталявання? Не ведаем адпаведнай тэхналогіі?

Гэтыя пытанні былі ўзнятыя ў артыкуле «І чаму ж ты такая дарагая, цукровая пудра» («Звязда», 26 сакавіка 2009 г.) дзякуючы жыхару Гродна Васілю Аляксеевічу, які быў вельмі здзіўлены коштам гэтага прадукту ў крамах абласнога цэнтра. Цана не кілаграма, а 150-грамовага пакеціка цукровай пудры расійскай фірмы ў некаторых крамах складала ажно 4750 рублёў — проста каласальная розніца паміж сыравінай, цукрам і канчатковым прадуктам.

Разам з нашым чытачом карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў разабрацца ў гэтай сітуацыі. Высветлілася, што гэта пытанне не з'яўляецца надта ўжо праблематычным для айчынных вытворцаў. Дакладней, яно зусім не складанае і можа быць вырашана даволі хутка. Што і пацвердзілі кіраўнікі Скідальскага цукровага камбіната, прадпрыемства «Лідскія харчовыя канцэнтраты» і абласнога УП «Бакалея» на нарадзе ў Гродзенскім абласным выканаўчым камітэце. На гэтай нарадзе, якую правёў намеснік старшыні аблвыканкама Аляксандр Русанаў, былі прынятыя канкрэтныя рашэнні па арганізацыі вытворчасці цукровай пудры на тэрыторыі Гродзеншчыны, а таксама высветлілася, што гандаль не валодае нават інфармацыяй аб тым, колькі гэтай прадукцыі прадаецца на тэрыторыі вобласці.

Якая ж на гэты конт пазіцыя рэспубліканскіх органаў? Вось якія адказы на артыкул «І чаму ж ты такая дарагая, цукровая пудра?» атрымала рэдакцыя.

Намеснік старшыні канцэрна «Белдзяржхарчпрам» М. АНЦЯХЕВІЧ паведаміў, што ў ААТ « Лідахарчканцэнтраты» сёлета з 1 ліпеня плануецца распачаць выпуск цукровай пудры ў дробнай (100-400 грамаў) і буйной (ад 1 да 20 кілаграмаў) фасоўцы. Магутнасць па вытворчасці цукровай пудры складзе 9 тон у месяц альбо 100 тон у год. Аб'ёмы вытворчасці на прадпрыемстве будуць планавацца ў залежнасці ад заявак гандлёвых арганізацый.

Адначасова пытанне стварэння вытворчасці цукровай пудры ў дробнай і буйной фасоўцы прапрацоўваецца арганізацыямі цукровай галіны. У 2010 годзе асвоіць выпуск цукровай пудры мае намер ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат» (200 тон у год), у 2010-2011 гадах — ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат».

У выпадку дэфіцыту цукровай пудры ў рэспубліцы арганізацыя яе вытворчасці будзе вырашацца ў ААТ «Скідальскі цукровы камбінат».

Пазіцыя Міністэрства гандлю па гэтым пытанні — у адказе першага намесніка міністра М. СВЯНЦІЦКАГА:

— На падставе аналізу імпарту спажывецкіх тавараў і сітуацыі на ўнутраным рынку рэспублікі Міністэрствам гандлю распрацаваны і накіраваны канцэрну «Белдзяржхарчпрам» пералік тавараў, якія прапануюцца для асваення іх выпуску і стварэння сумесных вытворчасцяў прамысловасцю краіны ў 2009 годзе. У гэты пералік уключана 46 груп харчовых тавараў, у ліку якіх і цукровая пудра (расфасаваная па 100-300 грамаў) з арыенціровачнай гадавой патрэбай нашага ўнутранага рынку 10 тысяч тон. Акрамя таго, Міністэрствам гандлю неаднаразова ўносіліся прапановы канцэрну «Белдзяржхарчпрам» па наладжванні вытворчасці цукровай пудры ў дробнай фасоўцы.

Паводле інфармацыі канцэрна «Белдзяржхарчпрам», з 1 ліпеня 2009 года ў ААТ «Лідахарчканцэнтраты» плануецца вытворчасць цукровай пудры ў дробнай фасоўцы (100-400 грамаў), прызначанай для рэалізацыі насельніцтву. Адпускная цана адной упакоўкі цукровай пудры (250 грамаў) складзе, згодна з папярэднімі разлікамі, каля 2 тысяч рублёў. Вытворчасць цукровай пудры таксама плануецца ў ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат» у 2010 годзе, у ААТ «Слуцкі цукраварафінадны камбінат» — у 2010-2011 гадах.

Для найбольш поўнага задавальнення спажывецкага попыту насельніцтва і ўлічваючы факты, выкладзеныя ў артыкуле, Міністэрствам гандлю ў адрас канцэрна «Белдзяржхарчпрам» накіравана дадатковая прапанова аб арганізацыі вытворчасці цукровай пудры.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Зваротная сувязь
Інваліду дапамаглі

Я інвалід Вялікай Айчыннай вайны II групы. Мне 83 гады, жыву адзін. Цікавіць наступнае пытанне: ці карыстаюся льготамі на ўсталяванне лічыльніка вады?

І.І. ЛАСІЦКІ, *Лідскі раён*

Зварот Івана Іванавіча рэдакцыя даслала ў Лідскі райвыканкам. Як паведаміў у адказе старшыня райвыканкама Андрэй Худык, па заканадаўстве такой льготы для адпаведнай катэгорыі не вызначана. Разам з тым, па хадайніцтве ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лідскага райвыканкама дырэктарам сельгаспрадпрыемства «Ніва» прынята рашэнне аб выдзяленні заяўніку грашовай дапамогі для ўсталявання прыбораў уліку вады. Так што ад просьбы інваліда Вялікай Айчыннай мясцовыя ўлады не адмахнуліся — знайшлі магчымасць яе задаволіць.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«Для будаўніцтва новай веранды няма падстаў...»

Марыя Васільеўна Мікуліч пражывае ў вёсцы Закальное Любанскага раёна. Побач з яе домам знаходзіцца Чацвёртае рудаўпраўленне «Беларускалія». Па словах жанчыны, пад жыллём праходзіць шахта, якая стала прычынай пачатку разбурэння яе цаглянага дома яшчэ шмат гадоў таму. Прынамсі, у 1987 годзе пэўныя работы па яго рамонце спецыялістамі прадпрыемства ўжо праводзіліся: будынак «сцягнулі». Як паведаміла Марыя Васільеўна, шчыліны пасля таго хоць і не пашырыліся, аднак захаваліся. У апошні час разбурэнне падоўжылася: з'явіліся шчыліны на падмурку, на сценах, веранда літаральна адкалолася ад дома. У 2007 годзе зноў была «перацяжка», аднак, паскардзілася заяўніца, да рамонту веранды справа не дайшла. Паводле слоў жанчыны, летась яна шэсць разоў з гэтай нагоды звярталася да кіраўніцтва прадпрыемства, аднак сітуацыя не выправілася.

Скарга заяўніцы наконт нездавальняючага стану цаглянай веранды, што прымыкае да дома, была разгледжана ў РУП «ВА «Беларускалій». Вось што рэдакцыі паведамілі ў афіцыйным адказе.

«Абследаванне домаўладання М.В. Мікуліч праводзілася камісіяй РУП «ВА «Беларускалій» неаднаразова. Цагляны дом і веранда сцягнуты сіламі Чацвёртага рудаўпраўлення. Па выніках камісійных абследаванняў заяўніцы не адзін раз прапаноўвалася выкананне сіламі Чацвёртага рудаўпраўлення рамонтных работ па задзелцы шчылін на сценах веранды і яе падмурку. Аднак гаспадыня дома катэгарычна адмаўлялася ад правядзення названых работ, патрабуючы выканаць будаўніцтва новай веранды. Гэтае патрабаванне, па заключэнні камісіі, з'яўляецца неабгрунтаваным. Цяпер горныя работы ў раёне прысядзібнага ўчастка М.В. Мікуліч не вядуцца. Дэфармацыйныя працэсы зруху зямной паверхні ад горных работ, што праводзіліся ў 1987 годзе рудніком Чацвёртага рудаўпраўлення, завяршыліся ў 2001 годзе. Такім чынам, падстаў для задавальнення патрабавання М.В. Мікуліч па будаўніцтве новай веранды ў аб'яднанні няма.

У выпадку згоды гаспадыні дома сіламі Чацвёртага рудаўпраўлення будуць выкананы прапанаваныя ёй раней рамонтныя работы па задзелцы шчылінаў на сценах і падмурку веранды».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Здарэнні, крымінал
НА РОЎНЫМ МЕСЦЫ

У Кобрыне 27-гадовы вадзіцель выязджаў са двара на аўтамашыне МАЗ. Хуткасць была невялікая, але тым не меней пад колы аўтамабіля трапіў 52-гадовы веласіпедыст, які рухаўся па галоўнай дарозе. Небарака загінуў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У ГАСПАДАРЦЫ ЎСЁ СПАТРЭБІЦЦА

15 дарожных знакаў і 10 металічных стоек да іх знікла на працягу мінулага месяца з аўтадарогі паміж населенымі пунктамі Чыстыя Лужы і Перагон у Веткаўскім раёне. Маёмасць належыць ДРБУ-185 і ацэньваецца ў 470 тысяч рублёў. Узбуджана крымінальная справа і па факце крадзяжу сарака дзевяці жалезабетонных пліт з тэрыторыі былой вайсковай часці Зябраўка ў Гомельскім раёне. Страты тут складаюць 1 мільён 400 тысяч рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МУЖЧЫНЫ СПРАБАВАЛІ СКРАСЦІ 250 ЛІТРАЎ СПІРТУ

У Бабруйску міліцыя затрымала двух мужчын пры спробе вынесці з гідролізнага завода этылавы спірт маркі «Экстра» на суму болей за 6,5 мільёна рублёў. Для гэтага два рабочыя (49 і 67 гадоў) суседніх прадпрыемстваў — гідролізнага завода і «Рэмбыттэхнікі» — дамовіліся: адзін перадаваў праз сцяну каністры са спіртам, другі прымаў і спрабаваў вывезці на аўтамабілі. Па звестках прэс-цэнтра Магілёўскага УУС, распачата крымінальная справа па факце крадзяжу ў групе.

«БМВ» І «ВАЗ» НЕ РАЗ'ЕХАЛІСЯ

27 красавіка ў Магілёўскім раёне паблізу вёскі Паўлаўка адбылося сутыкненне легкавых аўтамабіляў «ВАЗ» і «БМВ». Удар быў такой сілы, што абедзве машыны перакуліліся і зноў сталі на колы. Прычынай аварыі, паводле ДАІ, стала парушэнне хуткаснага рэжыму і правілаў абгону. 25-гадовы кіроўца «БМВ» не прапусціў спадарожны «ВАЗ», які паварочваў налева. У выніку сутыкнення 56-гадовы вадзіцель «ВАЗа» і 8-гадовы хлопчык, які ехаў пасажырам, з траўмамі шпіталізаваныя. Вадзіцель «БМВ» і яго пасажыр не пацярпелі: людзі былі прышпілены рамянямі і спрацавалі падушкі бяспекі.

Алена КАЗЛОВА.

НЯШЧАСНЫ ВЫПАДАК ЦІ САМАГУБСТВА?

Пад коламі хуткага цягніка «Брэст-Масква» загінула жанчына. Здарылася гэта побач са станцыяй «Баранавічы-Цэнтральныя». 33-гадовая жыхарка в. Саўцэвічы выскачыла на рэйкі перад самым цягніком. Машыніст уключыў экстраннае тармажэнне, але пазбегнуць трагедыі не ўдалося. Што прымусіла жанчыну выбегчы на чыгуначныя пуці, ужо ніхто не даведаецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СУВЯЗЬ НА ЎСЕ ЧАСІНЫ

-- Пакуль у мяне не было Інтэрнэту, я не здагадваўся, навошта ён мне патрэбны, а цяпер не магу зразумець, як жа без яго ўвогуле можна абыходзіцца? -- кажа калега, які працуе ў электронных сродках сувязі.

Мы ўсе хутка прывыкаем да добрага, і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі так шчыльна ўвайшлі ў жыццё, што пачынаеш моцна нерваваццца, калі камп'ютар раптам «завісае» і створаны тэкст не можаш перадаць у нумар. І як людзі жылі раней, не маючы сучасных магчымасцяў сувязі? Сёння без іх -- як без рук. Ці, хутчэй, без галавы. Бо ўсё, што датычыцца найноўшых тэхналогій, успрымаецца як развіццё вялізнага калектыўнага розуму. І тым больш цікава разглядаць сродкі сувязі, якімі нашы продкі карысталіся паўтара стагоддзя таму. Сёння яны сабраныя ў музеі сувязі Гомельскага філіяла Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белтэлекам».

Між іншым, самы старэйшы па ўзросце экспанат, які дагэтуль у рабочым стане — тэлеграфны апарат Морзэ ўзору 1850 года, выраблены кампаніяй «Telegraphenbauanstalt Siemens & Halske», прынёс у музей сучасны кіраўнік гомельскага філіяла прадпрыемства Віктар Шамкін. Многія з прыбораў працуюць дагэтуль. Напрыклад, радыёпрыёмнік, вядомы нам толькі па ваенных кінахроніках -- знакамітая «талерка», хутчэй, падобная на запэцканы тазік. Ці больш сучасны тэлефонны апарат 1961 года.

Тут і самыя першыя ручныя ламерныя камутатары, з дапамогай якіх пераключалі абанентаў. На камутатарах дазвалялася працаваць толькі маладым жанчынам, бо



Тэлеграфны апарат Морзэ ўзору 1850 года, выраблены кампаніяй «Telegraphenbauanstalt Siemens & Halske».

лічылася, што мужчыны не толькі адцягваюць сваю ўвагу ад справы, але і могуць... лаяцца. Менавіта таму першыя «тэлефонныя барышні» былі адукаваныя, цярплівыя і ветлівыя. Абавязкова маладыя -- ад 18 да 25 гадоў, а яшчэ не замужам -- каб клопаты аб сям'і не прыводзілі да памылак пры злучэнні. Тым не менш, звычайна дзяўчаты хутка знаходзілі прэтэндэнтаў на сваю руку і сэрца -- па тэлефоне. Бо злучалі заможных абанентаў, якія звярталі ўвагу ў тым ліку і на прыемны голас супрацоўніц сувязі.

Архіўныя дакументы сведчаць, што ў 1928 годзе ў Гомелі была ажыццёўлена міжгародняя тэлефонная сувязь. Менавіта ў той час па паветраных лініях сувязі абаненты мясцовай тэлефоннай сеткі пачалі весці перамовы з Добрушам, Навазыбкавам, Чачэрскам, Рэчыцай, Церахоўкай і Дабранкай. Потым апаратура становіцца паўаўтаматычнай, аўтаматычнай і нарэшце, лічбавай.

Сённяшнія прапановы прадпрыемства адрозніваюцца ад музейных, як зямля ад нябёсаў. Інтэрнэт па тэхналогіі ADSL, апаратура, якая дае магчымасць выкарыстоўваць модуль кіравання і тарыфікацыі кропак бесправаднога доступу ў Інтэрнэт Wi-Fi, IPTV -- лічбавае тэлебачанне новага пакалення, якое дазваляе глядзець любую праграму, калі хоча і можа глядач, а не тады, калі яна ідзе ў эфіры. Апошняй паслугай на гэты момант у вобласці карыстаюцца 2 з паловай тысячы абанентаў, а вось шырокапалосным доступам у сетку Інтэрнэт byfly -- больш за 10 тысяч чалавек. Праўда, яны, як і патэнцыяльныя карыстальнікі, вельмі чакаюць, што цэны на паслугі будуць значна ніжэйшымі, а хуткасці -- вышэйшымі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Грамадскі транспарт

Аўтобусы — зялёныя, трамваі — чырвоныя

Тралейбусы — бела-блакітныя, таксі маршрутныя, вядома ж, — жоўтыя!

Па ініцыятыве старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Косінца ўпершыню ў краіне ўвесь гарадскі грамадскі транспарт у Віцебску да 1 чэрвеня пафарбуюць у вызначаныя колеры. Потым плануюць такім жа чынам пафарбаваць увесь грамадскі транспарт і ў іншых гарадах Прыдзвінскага края.

Згодна з адпаведнымі даручэннямі аблвыканкама і гарвыканкама, работа па перафарбоўванні ўжо актыўна вядзецца.

— Усяго ў Віцебску 114 аўтобусаў, 98 трамваяў і 97 тралейбусаў, — распавядае карэспандэнту «Звязды» **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Дзмітрый ШЭРЫКАЎ**. — Афарбоўванне грамадскага транспарту ў канкрэтныя колеры — гэта сусветная практыка. Новы колер, калі ён не адпавядае «стандартнаму», атрымаюць усе грамадскія машыны ў горадзе, калі тэрмін іх эксплуатацыі перавышае 3 гады. Гэты тэрмін тлумачыцца проста — да 3 гадоў не рэкамендавана наносіць новую фарбу на заводскую.

— На перафарбоўванне аднаго аўтобуса неабходна патраціць 3 мільёны рублёў, — распавядае «Звяздзе» дырэктар Віцебскага аўтобуснага парка № 1 Валерый Іллюковіч. — Патрабуюцца для гэтага каля трох сутак і 3-4 рабочыя. Па дагаворы з «МАЗам» усе новыя аўтобусы, якія закупляе Віцебск, павінны быць толькі зялёнага колеру.

Што датычыцца рэкламы, размешчанай на гарадскім транспарце, калі тэрмін дагавора з рэкламадаўцамі не прайшоў, ніхто спецыяльна не будзе зафарбоўваць рэкламныя малюнкі і надпісы. А потым, як растлумачылі адказныя асобы, за кошт рэкламадаўцаў (пры іх жаданні) будзе аднаўляцца рэклама з паралельным перафарбоўваннем машыны...

У гарвыканкаме спадзяюцца, што мясцовая ініцыятыва знойдзе падтрымку і ў іншых рэгіёнах. У народзе ідэю абмяркоўваюць і часта жартуюць — ці самае галоўнае гэта цяпер? Але ж, парадак нават у дробязях, думаецца, гэта нядрэнна і падчас крызісу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Мова — душа народа

Жывое слова ў акіяне свабоды

Стаўленне ў грамадстве да беларускай мовы як дзяржаўнай прымушае звяртацца да гэтай праблемы зноў і зноў. Мова, якая ахоўваецца законам (ці павінна ахоўвацца) часта ігнаруецца, і робіцца гэта пад маркай свабоды і дэмакратыі. Маўляў, у нас дзве дзяржаўныя мовы і чалавек мае права выбіраць, якой мовай карыстацца.

У Баранавічах здарыўся адзін эпізод, які і падштурхнуў мяне да напісання гэтага артыкула. Факт малапрыкметны, і на яго можна было б не звярнуць увагі, калі б ён не атрымаў агалоску.

Вучаніца адной школы горада пры запаўненні дзённіка напісала не март, а сакавік. Класны кіраўнік, праглядаючы той дзённік, беларускую назву закрэсліла і напісала рускую. Маці дзяўчынкі гэта прыняла за абразу і звярнулася па тлумачэнне да настаўніцы, а затым і ў мясцовую газету.

Дзяўчынка памылілася, бо назвы прадметаў ёю запоўнены на рускай мове і тут педагогу трэба было б толькі ўсміхнуцца і сказаць:

— А ты, Наташа, малайчына, не забываеш родную мову, але ўлічваючы, што школа ў нас....

І не было б ніякіх непаразуменняў, і ніхто не станавіўся б у позу. А так спасылкі педагога на тое, што ўсе дакументы павінны ў школе афармляцца на рускай мове, у гэтым выпадку не вытрымліваюць крытыкі. Згодна з інструкцыяй дзённік неабходна запаўняць на той мове, на якой ажыццяўляецца агульнаадукацыйны працэс — усё правільна, але ёсць цікавы момант у гэтай сітуацыі. Дзённік, з якім прывучылася дзяўчынка амаль год, быў для беларускай школы і там на кожнай старонцы напісана: адзнакі настаўніка, дата, заданні....і чамусьці гэты «вопиющий факт» не абурыў настаўніцу! А прытрымліваючыся літары інструкцыі, яна абавязана была ўсе беларускія надпісы перакрэсліць ці запатрабаваць, каб дзённік быў рускамоўным.

Выходзіць, сакавік у тым дзённіку не быў адзінокім і не мог успрымацца чужародным украпінай.

Проста класны кіраўнік была тут не на вышыні — паддалася эмоцыям, але ж званне Настаўніка абавязвае...

Дарэчы, я нічога не маю супраць пастаноў і розных інструкцый. Толькі думаю, што тут падыход не павінен быць выбарачным.

Не хачу сказаць, што ва ўсіх беларускіх школах, якія яшчэ засталіся ў сельскай мясцовасці, інфармацыя не на роднай мове. Але ў тых школах, дзе мне даводзілася пабываць, інструкцыя «Аб парадку фарміравання вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах» не выконваецца.

І паўбяды, калі па калідорах развешаны рускамоўны расклад ці іншая інфармацыя — часта ад беларускай школы застаецца толькі шыльда, а прадметы выкладаюцца на рускай.

А як на такую сітуацыю рэагуюць начальнікі раённых упраўленняў адукацыі? Ды ніяк!

Чыноўнік у нас кемлівы і разумее, што за такое стаўленне да беларускай мовы пад суд не аддадуць. А яшчэ любяць ківаць на бацькоў, маўляў, у іх уся праблема — не хочуць, каб іх дзеці вучыліся па-беларуску. Калі стаць на такую пазіцыю, то атрымліваецца заганны круг: беларускіх класаў няма, бо вучняў у іх не набраць.

Але ў найноўшай гісторыі Беларусі быў перыяд, калі беларускія класы з'яўляліся, як грыбы, ва ўсіх гарадах. А дзе яны сёння? Надвор'е неспрыяльнае ці бацькі вінаватыя? Што, была адпаведная пастанова аб ліквідацыі ўжо створаных класаў? Не! А ў чым тады прычына?

А хіба ж найперш не дырэктары і настаўнікі адгаворвалі бацькоў ад беларускіх класаў. Сцвярджалі, што ў дзяцей не будзе перспектывы, што ў іх будзе псіхіка траўмаваца... Толькі не пра дзяцей тыя педагогі думалі, а пра сябе, бо беларускія класы ў рускамоўнай школе — гэта лішнія турботы.

А дырэктар школы глядзіць на начальніка ўпраўлення адукацыі...

Гэта толькі адна з прычын праблемы, але мы вернемся да свабоды выбару мовы. Яна ж не можа быць бязмежнай. Калі прытрымлівацца юрыдычнага падыходу, то мая свабода канчаецца там, дзе пачынаецца свабода іншага чалавека.

У Баранавічах, як і ў іншых нашых гарадах, амаль уся інфармацыя (шыльды, рэклама, плакаты) на рускай мове — другой дзяржаўнай, а на мове тытульнай нацыі сустракаецца рэдка. Тут крама «Калі ласка», а там «Цвік», але гэтыя назвы запамінаюцца найперш таму, што іх у горадзе мала.

Вуліца — не прыватная кватэра, яе жыццё рэгулюецца адпаведнымі структурамі мясцовай улады, і інфармацыйнае афармленне яе павінна быць выканана на дзвюх дзяржаўных мовах, інакш будзе парушана права выбару — мая свабода. Чаму вуліцы аддадзены часта на водкуп людзям, якія на сваіх крамах вешаюць усё, што ім прыйдзе ў галаву?

Кожны можа мову выбіраць, але калі чалавек на дзяржаўнай службе, ён абавязаны валодаць дзвюма мовамі. Аднойчы ў ашчаднай касе я запоўніў квіток па-беларуску, то давялося выклікаць загадчыцу — скандал падняўся. А каб касір-аператар ведала, што за такі выпад яе па галоўцы не пагладзяць, то паводзіла б сябе інакш.

Ды што касірка! З многімі кіраўнікамі аддзелаў культуры даводзілася сустракацца, і далёка не ўсе з іх валодаюць беларускай мовай. А ў такім выпадку чаго чакаць ад дырэктараў музеяў, дамоў культуры, кіраўнікоў мастацкіх калектываў, якія падпарадкоўваюцца такім начальнікам?

Вось свежы прыклад.

Перад днём Перамогі ў зале цэнтральнай бібліятэкі горада адбылася сустрэча з нямецкім пісьменнікам П. Колем, які прысутнічаў на прэзентацыі сваёй кнігі «Найлепшыя прывітанні з Мінска».

Коль многа пісаў пра злачынствы вермахта і паліцыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, пра гісторыю мінскага гета, пра лагер смерці Трасцянец, і вось «Найлепшыя прывітанні з Мінска» перакладзены на беларускую мову.

Зразумела, што размова вялася па-беларуску, у ёй бралі ўдзел госці са сталіцы, тыя, хто перакладаў і рэдагаваў кнігу. А калі заключнае слова ўзяла кіраўнік аддзела культуры, то з залы прагучала рэпліка: «Гаварыце па-беларуску». Напэўна, тыя некалькі слоў падзякі неабходна было сказаць на роднай мове — навошта было парушаць гармонію, якая склалася падчас сустрэчы?

А хіба абітурыентам , якія паступаюць на пэўныя спецыяльнасці, пры гутарцы з камісіяй не раяць адказваць на той мове, на якой зададзена пытанне? Разумна, бо ў гэтым ёсць элемент культуры.

Моўнае пытанне на Беларусі было заўсёды неадназначным, і за савецкім часам многае з таго, што дазвалялася ў рэспубліках Прыбалтыкі ці Закаўказзя, у нас было немагчымым — не толькі адносна мовы, але і культуры ў цэлым.

І не дзіўна, што ў дырэктара прадпрыемства ці кіраўніка больш высокага рангу праблемы з мовай — нацыянальнай свядомасцю. Але ж той, хто адказвае за культуру ці адукацыю, абавязаны быць на вышыні. Калі такі чалавек не валодае беларускай мовай, то ці адпавядае ён сваёй пасадзе?

Можна было б у гэтым артыкуле прывесці мноства фактаў, але яны нічога новага чытачу не адкрыюць. Лепш будзе крок за крокам вырашаць наспелыя праблемы. Відавочна, нядаўна прынятыя папраўкі правапісу ў беларускай мове звязаныя з тым, каб яе удасканаліць, каб мова развівалася і адпавядала статусу дзяржаўнай.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

МИРСКИЙ ПОСЕЛКОВЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
(КОРЕЛИЧСКИЙ РАЙОН, ГРОДНЕНСКАЯ ОБЛАСТЬ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

Лот 1 — по продаже земельного участка в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Гродненская область, Кореличский район, Мирский поссовет, д. Криничное, участок У-1, площадь участка 0,1999 га, начальная цена — 57 291 белорусский рубль. Ограничение в землепользовании земель: водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос площадью 0,1999 га. Кадастровый номер участка 423375703601000041. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 561 143 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ.

Лот 2 — по продаже земельного участка в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного

АЛЯКСЕЙ ШКАДАРЭВІЧ:

«ПРАГРЭС У НАВУЦЫ ВЫКЛІКАЕ ПРАГРЭС У ВЫТВОРЧАСЦІ»

Беларускія ўрачы эфектыўна лечаць хворых з дапамогай знакамітага цяпер «Пульсара». А каралеўская армія Швецыі прыняла на ўзбраенне беларускія аптычныя прыцэлы. Што тут агульнага? І «Пульсар», і прыцэлы зроблены ў Мінску, на навукова-вытворчым прыватным унітарным прадпрыемстве «ЛЭМТ» Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання («БелОМА»). Узначальвае яго член-карэспандэнт НАНБ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ Аляксей Пятровіч ШКАДАРЭВІЧ.

З'ява па-свойму ўнікальная: доктар фізіка-матэматычных навук — дырэктар прадпрыемства. Сярод прадстаўнікоў айчыннага дырэктарскага корпуса ёсць дактары тэхнічных навук, а вось масцітага фізіка ці матэматыка больш няма ніводнага. Але ж згадзіцеся, што і само прадпрыемства — незвычайнае: займаецца даследаваннямі, распрацоўкай і вытворчасцю лазерна-аптычных, оптыка-механічных і оптыка-электронных вырабаў і сістэм.

З прафесарам Аляксеем Шкадарэвічам гутарыць навуковы аглядальнік «Звязды» Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

— Прадпрыемства створана 17 гадоў таму — 1 чэрвеня 1992 года, у выніку структурных пераўтварэнняў на Беларускім оптыка-механічным аб'яднанні («БелОМА»), — расказвае Аляксей Пятровіч. — Гэта быў час напярэдадні распаду Савецкага Саюза, ішло скарачэнне абаронных заказаў, бушавала канверсія. І стварэнне навукова-вытворчага прадпрыемства «ЛЭМТ» («Лазеры ў эканогіі, медыцыне і тэхналогіі») было своеасаблівым адказам на сітуацыю.

Не ўсё адразу давалася лёгка. Мы спачатку паспрабавалі сябе ў медыцынскай тэматыцы, пачалі займацца медыцынскай тэхнікай. Перыяд быў цяжкі, бо медыцына грошай не мела, да таго ж вельмі доўгім па працягласці быў час апрабацыі любой навінкі, што ўсё разам складана і дорага купіць, а часам і немагчыма.

— Мушу прызнацца, што мая, мне з калегамі давялося яе і ажыццяўляць. На «БелОМА» я перайшоў з Нацыянальнай акадэміі навук яшчэ ў 1979 годзе, і меў час усё прадумаць і разлічыць. І ў 1992 годзе, калі стала зразумела, што работы па нашых праграмах згортваюцца, фінансаванне адсутнічае, адважыўся ўзяць на сябе адказнасць за новы калектыў. І разам з калегамі пачалі настойліва шукаць цвёрдую глебу пад нагамі ў рэчышчы таго, што ўмелі, дзе адчувалі сябе прафесіяналамі.

Мы былі новымі людзьмі на рынку, тым больш — на сусветным, ніколі да гэтага не займаліся збытам. Раней наша задача была адна — выканаць дзяржаўны заказ, а рэалізацыя была цэнтралізавана ў рамках планавай гаспадаркі. А калі ўсё развалілася ў адначассе, заселі за грунтоўнае вывучэнне асноў рыначнай эканомікі і тых стандартаў, якім павінна адпавядаць наша прадукцыя. Было вельмі і вельмі нялёгка. Напачатку 90-х я ўпершыню пабываў на спецыялізаванай лазернай выстаўцы ў Мюнхене, з таго часу мы ўжо штогод удзельнічалі ў гэтай найбуйнейшай выставе па лазерах. І кожны раз па сантыметру заваёўвалі для сябе жыццёвую прастору.

— І як да вас паставіліся прадстаўнікі замежных карпарацый, навуковых колаў?

— З вялікай цікавасцю. Яшчэ ў 1989 годзе, калі паднялася «жалезная заслона», я змог выехаць на буйную навуковую канферэнцыю ў Злучаныя Штаты і зрабіць там даклад, пасля чаго пайшлі запрашэнні выступіць з лекцыямі ў шматлікіх навуковых цэнтрах. Напрыклад, выступаў у знакамітай Ліверморскай нацыянальнай лабараторыі, Масачусецкім інстытуце тэхналогій, а гэта вядучыя лазерныя цэнтры ЗША. І ў іншых сусветных навуковых цэнтрах — у Германіі, Італіі, Іспаніі, Францыі, Японіі, Кітаі, Расіі і г.д.

Адным словам, пра нас сёння добра ведаюць, мы канкурыруем з вядомымі заходнімі фірмамі. Стараемся канкурыраваць на роўных.

— На якія акадэмічныя распрацоўкі вы абапіраліся тады і абапіраецеся зараз?

— Маё з'яўленне на «БелОМА» было ў пэўным сэнсе эксперыментам па наладжванні больш цеснага супрацоўніцтва навукі з вытворчасцю, калі аб'яднаннем і НАНБ быў створаны міжгалінавы канструктарскі аддзел. Мы з самага пачатку абапіраліся на акадэмічную навуку, у першую чаргу — на распрацоўкі Інстытута фізікі імя Б. Сцяпанава, супрацоўнікам якога я доўгія гады з'яўляўся. А таксама іншых інстытутаў — фізікі цвёрдага цела, цепламасаабмену, інстытута тэхнічнай кібернетыкі. Калі зразумелі, што гэтага недастаткова, — падключылі Беларускі політэхнічны інстытут і стварылі вучэбна-навукова-вытворчую структуру. Адкрылі ў нас філіял кафедры палітэха, пачалі чытаць лекцыі і падрыхтавалі для вытворчасці і навукі сотні новых спецыялістаў па оптыцы, электроніцы, якія працуюць зараз даволі паспяхова. У тым ліку не толькі ў нас, а і ў іншых фірмах. Дзякуючы чаму гэты сектар — вытворчасць лазернай тэхнікі, я мяркую, развіты ў нас значна мацней, чым у некаторых суседніх краінах, нават у Расіі. Што прызнаюць і самі расіяне.

— Ці мянялася наменклатура вырабаў?

— Пачыналі з прасцейшых вырабаў — з тых жа традыцыйных тэлескапічных прыцэлаў. Потым былі створаны навуковыя перадумовы, і з'явіліся лазерныя прыцэлы. Мы пачалі іх вытворчасць практычна адначасова з вядучымі краінамі і ўтрымліваем сёння сур'ёзны сегмент рынка па лазерных прыцэлах. У апошні час з'явіліся лазеры з вертыкальным рэзанатарам, і мы іх актыўна прымяняем. Усё заканамерна: прагрэс у навуцы выклікае прагрэс у вытворчасці.

Працэс ідзе за нарастаннем. І сёння акрамя наменклатуры большменш распаўсюджаных прыцэлаў з'явілася новае іх пакаленне — так званыя інтэлектуальныя прыцэлы. Пры іх выкарыстанні практычна зводзіцца да мінімуму чалавечы фактар, усё выконвае аўтаматыка. Працуем непасрэдна з расійскімі вытворцамі ўзбраенняў, яны ў нас заказваюць новае пакаленне оптыкі — адпаведна з нашымі новымі магчымасцямі.

Супрацоўнічаем са знакамітымі беларускімі вытворцамі. Напрыклад, з «Інтэгралам» асвойваем выпуск новых фотапрыёмнікаў. Кампаненты купляем у вядучых замежных вытворцаў. Зыходзім з таго, што трэба выкарыстоўваць глабалізацыю, міжнароднае раздзяленне працы і выпускаць дастойны канчатковы прадукт.

Для «Беларускалія» будзем рабіць апаратуру, якая дазволіць падземнаму камбайну рухацца па прамяні лазера. Робім размеранае прыстасаванне для вырабу корду на «Белшыне». За аптычнымі, лазернымі сістэмамі — будучыня.

Яны, як і прыборабудаванне ў цэлым, найбольш «упісваюцца» ў інфраструктуру прамысловасці нашай краіны: мінімальнае энерга- і матэрыяласпажыванне, высокая дабаўленая вартасць за кошт уласнай высокаінтэлектуальнай працы, з высокім перавышэннем экспарту над імпартам (у нашым выпадку ў трыпяць разоў).

Калектыў хоць і невялікі, тым не менш вызначае навуковае і нават вытворчае аблічча Беларусі. Яго іншы раз называюць жамчужынай айчыннага рэальнага сектара. А задачы абароннага характару, што мы вырашаем, дазваляюць Беларусі мець прадукцыю, якую было б складана і дорага купіць, а часам і немагчыма.

— І хто гэтымі цікавымі рэчамі займаецца? Людзі, якія прыйшлі разам з вамі ці ўжо пазней, навукоўцы ці «чыстыя» вытворцы? У вас ёсць свой «мазгавы цэнтр»?

— Мы пачыналі з маленькай групы людзей. Былі ўзлёты, падзенні, сыходы людзей, некаторыя сыходзілі ад нас і стваралі свае прадпрыемствы пасля таго, як набраліся вопыту. Усё як у жыцці. А касцяк застаўся. Ёсць людзі, якія разам са мной 30 гадоў, яны — твар калектыву. У нас працуюць два дактары і чатыры кандыдаты навук. У «мазгавы цэнтр», як вы кажаце, уваходзяць і прафесар Ілья Рыгоравіч Ляндрас, які займаецца лазерамі ў медыцыне, і галоўны спецыяліст, кандыдат фізіка-матэматычных навук Валянцін Генадзьевіч Копцеў — ён узначальвае распрацоўку і выпуск спецыяльных прыбораў, і кандыдат фізіка-матэматычных навук Ігар Паўлавіч Пятровіч, знакаміты спецыяліст па лазерах, і іншыя сур'ёзныя вучоныя і вытворцы. Я назваў бы іх унікальнымі спецыялістамі сусветнага ўзроўню.

Безумоўна, «склад розуму» тут патрэбен асаблівы, бо праз нас многа прайшло і дактароў, і кандыдатаў, якія не затрымаліся — тут даводзіцца значна складаней, чым у навукова-даследчым інстытуце. Там калі не завяршыў даследаванні сёлета, то можна ў наступным годзе, ды і аб'ём даследаванняў цяжка зафіксаваць. У нас так нельга, бо заключаны кантракты, і прыбор павінен быць абавязкова створаны і пастаўлены заказчыку. А гэта новая тэхніка, якая часта не мае аналага, падгледзець няма дзе. Робім усё з чыстага аркуша дзякуючы веданню «прадмета», свайму вопыту, нават навуковай інтуіцыі. У апошнія гады, калі фінансавы стан прадпрыемства палепшыўся, з'явілася магчымасць запрашаць да сябе на працу вельмі добрых спецыялістаў. Мы плацім ім някепскую зарплату, але маем і аддачу.

Выхоўваем маладыя кадры. Толькі ў гэтым годзе бяром на працу дзесяць маладых спецыялістаў. Гэта выпускнікі факультэта аптычнага прыборабудавання і лазерных тэхналогій БНТУ і некалькі чалавек з БГУІР — электроншчыкі. Бо прадпрыемства ўзброена камп'ютарнай тэхнікай, якую выкарыстоўваюць нават рабочыя, і высокадакладным тэхналагічным абсталяваннем. Без гэтага нельга займацца, скажам, нанясеннем разнастайных пакрыццяў на аптычныя дэталі, у тым ліку на лазерныя элементы, што само па сабе з'яўляецца ўнікальнай тэхналогіяй. У той жа лабараторыі знаходзяцца ўнікальныя прыборы, з дапамогай якіх ажыццяўляецца кантроль за якасцю пакрыцця.

Скажам, набылі швейцарскі прыбор, каб кантраляваць аптычныя дэталі і пры неабходнасці ўносіць карэкціроўку ў тэхналагічны працэс. Маем унікальны стэнд для юсціроўкі лазерных сістэм і гэтак далей — пералік можна працягваць. Па ўзроўні абсталявання, якое мы выкарыстоўваем, знаходзімся на пярэднім краі прыкладных навуковых даследаванняў.

— Раскажыце, калі ласка, пра ўдзел у выставах, пра вашы дыпломы і медалі...

— Маем сапраўды вялікую колькасць дыпломаў, бо ўдзельнічаем у многіх выставах і займаем там «прызавыя» месцы. І не толькі ў Беларусі і Расіі, а ва ўсім свеце: у Паўднёва-Усходняй Азіі, на Блізкім Усходзе, у Еўропе — а гэта Парыж, Мюнхен. Зараз рыхтуемся да ўдзелу ў 5-й міжнароднай выставе ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі «MILEX-2009».

Удзельнічаем ва ўсіх мерапрыемствах па лініі Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта РБ, Гандлёва-прамысловай палаты. У многіх краінах у нас ёсць партнёры, з якімі мы цесна супрацоўнічаем — з тым жа знакамітым «Самсунгам». Ствараем за мяжой свае сэрвісныя цэнтры па абслугоўванні оптыкі, і не толькі ўласнай.

— Пракаментуйце, калі можна, тэму якасці. Што для вас з'яўляецца ўзорам — тая ж цэйсаўская оптыка ці ўжо нешта іншае?

— «Цэйс» застаецца самым высокім узорам для пераймання, мы шмат разоў бывалі на яго прадпрыемствах. Канечне, «Цэйс» для Германіі больш чым простая фірма, у яго інвестуюцца велізарныя сродкі, у тым ліку і бюджэтныя. У нас пакуль іншыя фінансавыя магчымасці, але многае, я спадзяюся, зменіцца пры ўдалым ходзе падзей у айчыннай і сусветнай эканоміцы. Многія нашы вырабы, хоць бы аб'ектывы для аэраздымак, нам не сорамна паказаць таму ж «Цэйсу».

У нас даўно дзейнічае сістэма менеджменту якасці на базе міжнародных стандартаў ICO 9001, працуе спецыяльная служба. Так што належная ўвага да якасці — важны складальнік нашай дзейнасці.

Вельмі сур'ёзны фактар для якаснай і эфектыўнай работы — гэта тая вялікая падтрымка, якую мы атрымліваем ад кіраўніцтва краіны, у тым ліку ад Прэзідэнта.

— Вы сказалі, што адзін час з прычыны пэўных абставінаў пераключылі сваю ўвагу з медыцынскай тэхнікі на оптыку і на лазерныя сістэмы. Але ж потым вы зноў вярнуліся да медыцынскага абсталявання.

— Зараз мы выпускаем лазерны хірургічны апарат «Пульсар», які прымяняецца ў медыцынскіх тэхналогіях — практычна ва ўсіх галінах медыцыны. У тым ліку ён паспяхова працуе і ў кардыялагічным цэнтры. Яго перавагамі з'яўляюцца бяскроўнае рассячэнне тканак, малая іх траўматызацыя і дазіраванае фотатэрмічнае ўздзеянне. Адна з мадыфікацый «Пульсара» — з «бартавым» камп'ютарам.

Такія ж характарыстыкі ў лазерных дыёдных апаратаў Diolas-810 і Diolas-940. Новыя перспектывы ў сучаснай стаматалагічнай практыцы адкрывае лазерная стаматалагічная ўстаноўка «Оптыма», прызначаная для лячэння парадантозу і іншых захворванняў поласці рота. Медыцынскія выпрабаванні, праведзеныя на базе вядучых клінік Мінска, паказалі высокую эфектыўнасць паўправадніковых лазерных устройстваў УПЛ-3,0 і УПЛ—ФДТ для лячэння вачэй і шырокага спектра іншых захворванняў. Пры лячэнні многіх хваробаў з поспехам выкарыстоўваецца прыбор лазернай акупунктуры «Альфа», ён стымулюе біялагічна актыўныя кропкі цела і абпраменьвае рэфлекторныя зоны.

Нашу медыцынскую тэхніку характарызуе прастата і надзейнасць у эксплуатацыі, а таксама даступнасць цаны для ўстаноў аховы здароўя.

— У сувязі з сітуацыяй у сусветнай эканоміцы праблем з рэалізацыяй сваёй прадукцыі не адчуваеце?

— Мы не працуем на склад. У нас прынцып іншы — працуем толькі па кантрактах. І на гэты год, і на наступны загружаны больш чым на 100 працэнтаў, але ж разумеем, што сітуацыя можа змяніцца.

Канечне, уважліва адсочваем сітуацыю на сусветных рынках. Асабіста я зараз больш штудзіруе літаратуру па эканоміцы, чым тэхнічную. Не магу сказаць, што нас пакуль «не зачапіла». Узніклі праблемы з аплатай за выкарыстаную намі прадукцыю, растуць цэны на камплектацыю, на паслугі. Прымаем свае супрацькрызісныя меры, якія ў нашых магчымасцях, а таму пашыраем наменклатуру выпускаемых вырабаў, фарсіруем заключэнне кантрактаў з шэрагам заказчыкаў.

— Пытанне, адказ на якое будзе цікавы вашым калегам-навукоўцам: у якой ступені ваш прыклад — «іншым навука»?

— Я нядаўна выступаў на агульным сходзе Нацыянальнай акадэміі навук і сказаў, што сцяжынка ў вытворчасць «пратаптана», можна ісці следам.

Існуе такі важны паказчык дзейнасці любога навуковага супрацоўніка, як цытаванне — колькі разоў на яго спасліліся ў сваіх працах іншыя навукоўцы. І гэта абсалютна аб'ектыўны крытэрый. Але трэба разумець, што нават сто самых цытаваных навукоўцаў не дабавяць ніводнага рубля ў бюджэт краіны. Маюць права на жыццё і іншыя крытэрыі. А такое прадпрыемства, як наша, дзе навукоўцы працуюць на вытворчасці і для вытворчасці, якое спраўна плаціць падаткі, забяспечвае валютныя паступленні ў краіну за кошт укаранення сваіх навуковых распрацовак — яго вопыт мае права на жыццё.

Таму я і сказаў на сходзе, што такія магчымасці ёсць, калі ласка. Зараз «БелОМА» пачало развіваць такі перспектыўны кірунак, як святлодыёдная тэхніка. Вельмі патрэбен кіраўнік з навуковай ступенню, які мог бы ўзначаліць працу і ўзяць на сябе ўсю паўнату адказнасці за тэхнічныя рашэнні, за камерцыйныя вынікі. Гэты кірунак можа прынесці каласальныя дывідэнды — як навуковыя, маральныя, так і матэрыяльныя.

Праблема ўкаранення навуковых распрацовак не ў тым, што нехта не жадае ўкараняць. Проста вытворцам у рэальным сектары не заўсёды зразумелы камерцыйны патэнцыял той ці іншай распрацоўкі. Тэхнічны патэнцыял, як правіла, зразумелы, а вось камерцыйны патрабуе асобнага вывучэння і матэрыяльных выдаткаў, якія іншым разам перавышаюць выдаткі на навуковы пошук і на выпуск узораў новай тэхнікі.

А каб паставіць гэты доследны ўзор на паток, выдаткі наогул патрэбныя ў дзясяткі разоў большыя. Як заводу вызначыць: пойдзе навінка ці не? Таму частку такой працы даводзіцца выконваць самому навукоўцу, аўтару арыгінальнай ідэі — праводзіць маркетынгавае вывучэнне рынка і такім чынам даказваць «состоятельность» новага прадукта. Знайсці новыя заканамернасці, стварыць новы прыбор — палова справы, важна яшчэ даць яму пуцёўку ў жыццё.

Я магу назваць дзясяткі невялікіх прадпрыемстваў нашай краіны, якія ўдала ўкараняюць новыя распрацоўкі і дамагаюцца вельмі добрых вынікаў. Але пракладзеная імі і намі дарога павінна стаць больш «шматлюднай», нават скажам так: магістральнай.

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Нарадзіўся ў Капылі. У 1970 годзе з адзнакай закончыў фізічны факультэт БДУ. Працаваў і вучыўся ў аспірантуры Інстытута фізікі НАН Беларусі. З 1979 года на Беларускім оптыка-механічным аб'яднанні. З 1992 года кіруе НВПУП «ЛЭМТ».

З'яўляецца вядомым вучоным у галіне квантавай электронікі, прыкладной нелінейнай оптыкі, лазернага прыборабудавання. Ім развіты навуковы кірунак — цвёрдацельныя перабудоўваемыя лазеры з селектыўнай напампоўкай.

Высокай арыгінальнасцю адрозніваюцца атрыманыя ім вынікі даследаванняў шматфункцыянальных лазерных асяроддзяў. Гэтыя работы дазволілі забяспечыць парытэт з вядучымі заходнімі краінамі ў стварэнні цвёрдацельных лазераў на хромаўтрымліваючых крышталях і стварыць кампактныя лазерныя перадатчыкі.

Не меншае значэнне маюць атрыманыя А. Шкадарэвічам навуковыя вынікі ў галіне прыкладной оптыкі і оптыка-электроннага прыборабудавання. Шырокае выкарыстанне сучасных дасягненняў квантавай электронікі, нелінейнай оптыкі і інфармацыйных тэхналогій дазволілі яму не толькі істотна павысіць характарыстыкі традыцыйных прыбораў і сістэм спецыяльнага прызначэння, але і стварыць прынцыпова новыя вырабы. Ім створаны «інтэлектуальныя» прыцэлы, якія істотна павялічылі эфектыўнасць сучасных узбраенняў. Пад яго кіраўніцтвам створана і новае пакаленне лазерных дальнамераў, а таксама лазерныя перадатчыкі з дыёднай напампоўкай.

Аўтар больш чым 375 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій і кніг, 3 падручнікаў, 97 вынаходніцтваў. Падрыхтаваў 5 кандыдатаў навук.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Інжынер-тэхнолаг Ірына СМІРНОВА.

2. Побач з вопытным спецыялістам вядучым інжынерам Уладзімірам Качаном плённа працуе яго дачка — тэхнік-тэхнолаг Ганна КАЧАН.

3. Намеснік дырэктара па вытворчасці Ігар ДАБРЫЯН і вядучы інжынер-даследчык Мікалай ХРОПІК.

4. У руках слесара механазборачных работ Ірыны АНАНІЧ прыцэл для зброі.

5. Сярод новых распрацовак — лазерны дальнамер.

6. Доктар медыцынскіх навук прафесар Ілья ЛЯНДРАС (справа), вядучы інжынер кандыдат фізіка-матэматычных навук Павел НАЗАРАНКА і намеснік дырэктара па аптычных тэхналогіях і медтэхніцы Леанід ХАХЛЯНКОЎ каля «Пульсара».

7. Аб'ектывы для акуляраў начнога бачання правяраюць намеснік начальніка вытворчасці Аляксандр ВАГЕНТАЎ і фоталабарант Людміла СТЭЛЬМАХ.

8. Тут на паверхню аптычных дэталяў наносіцца звыштонкае антыадбівальнае пакрыццё.

9. Аператар вакуумных установак Вольга ЯРШОВА.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 100230590

Плануем лета

Крызіс крызісам, а адпачываць хочацца. І малым, і дарослым. Якія наогул сёння ёсць варыянты для сямейнага адпачынку і колькі гэта можа каштаваць?

1. Дамок на прыродзе

Ёсць свая дача — выдатна. Не — самы час узяцца за яе пошукі. Не верце, што зараз гэтым займацца позна, маўляў, усе лепшыя варыянты разабраны ў лютым—красавіку. Наадварот, цяпер у вас ёсць шанц адхапіць варыянт больш танны. У канцы жэ мая, калі жыллё так і не здадзена, яго гаспадары гатовы патаргавацца. Але і зацягваць з выбарам дамка таксама не трэба, у сезонны рост цікавасці да адпачынку на ўлонні прыроды цэны пачынаюць хутка расці. Такі ўсплёск адбываецца, як правіла, з пачаткам школьных канікулаў і ў спякотнае надвор'е, тады дамок ля вады можа абыходзіцца ў 200 долараў у суткі, а то і больш.

Самы надзейны варыянт пошуку прыстанку на летні месяц — праз знаёмых. Далей — Інтэрнэт (там можна знайсці аб'явы, апісанні дамкоў, тэлефоны гаспадароў, фатаграфіі жытла і тэрыторыі вакол яго). Так, мая знаёмая знайшла неблагі варыянт — дамок у добрым месцы будзе каштаваць ёй усяго 90 долараў за месяц.

Калі вы звяртаецеся пры пошуку дачы ў агенцтва, будзьце гатовыя да такога павароту: вы выкладваеце 100 тысяч і атрымліваеце спіс тэлефонаў гаспадароў вясковага жылля, пасля сядаеце за тэлефон і даведваецеся, што больш за палову з іх свае дамкі ўжо здалі. Далей вам неабходна ехаць на самі дачы і глядзець, якія там умовы для пражывання. Некаторыя агенцтвы прапануюць яшчэ і такі варыянт: яны падбіраюць дамок і вывозяць вас на месца, але такая паслуга будзе каштаваць 350 тысяч. Пагадзіцеся, танней самім выправіцца ў месціны, дзе вы хацелі б правесці месяц з дзіцем, і пашукаць мясцовых жыхароў пра тое, дзе знайсці дамкі. Сёння ў многіх дачных таварыствах здаюцца жыллё, часам на ўсё лета. Адразу ж і прыгледзіце сабе нядрэнны варыянт. Загадзя з гаспадаром абгаворыце ўсе дэталі (ці будзе ён наведваць дамок, каб даглядаць за агародам, ці не плануе ён другі паверх фазэнды ці яшчэ адзін будынак на сваім участку здаваць яшчэ каму-небудзь, ці дазваляецца вам браць дровы і збіраць ягады на кустах, ці можна прымаць гасцей, як заказаць лазню...).

Самы танны варыянт сёння — арэнда просценькай дачы, сярод выгад якой — толькі газ (прыбіральня на вуліцы, вада ў студні альбо ў калонцы) за 100 — 300 долараў у месяц. Дом з санвузлом і гарачай вадой пацягне не менш як на 600. На кошт дамка можа ўплываць тое, дзе ён знаходзіцца (ці блізка ад электрычкі, ці недалёка ад горада, ці ёсць побач вадаём і лес), памер жытла і ўчастка, інфраструктура.

У Беларусі з кожным годам павялічваецца колькасць аграсядзібаў, гатовых прымаць турыстаў. Паступова расце і сэрвіс. Сёння не праблема зняць катэджы, у якіх ёсць ванна-джакузі, саўна, лазня, басейн, більярд, спартыўныя пляцоўкі, танцзала, музычны цэнтр з фанатэкай, хатні кінатэатр, караоке, спадарожнікавае тэлебачанне, выхад у Інтэрнэт, шыкоўныя альтанкі і дзіцячыя пляцоўкі. Прычым цэны на камфартабельны адпачынак могуць зашкальваць. Суткі ў сядзібе з выгодамі абыдуцца не менш чым у 10 долараў з носа (за катэдж цалкам ад 50 да 1000 долараў за суткі).

2. Сям'я на базе

Хочаце, каб адпачынак прайшоў з максімальнай карысцю для здароўя, — ёсць сэнс выправіцца з дзецьмі ў аздараўленчыя цэнтры, санаторыі. Лепш шукаць установы, разлічаныя на дзяцей, альбо з аддзяленнямі для дарослых з малымі. Некаторыя дзіцячыя санаторыі прымаюць хлопчыкаў і дзяўчынак ужо з трох гадоў. Перш чым заказваць пуцёўкі, парайцеся са сваім педыятрам, куды малому лепш ехаць, выбірайце базу па медыцынскім профілі.

Сёння праз Інтэрнэт можна не толькі знайсці інфармацыю пра санаторыі, пазнаёміцца з водгукамі аб гэтых установах, але і на форумах задаць свае пытанні галоўным урачам некаторых з іх, забраніраваць пуцёўку. Праўда, з апошнім вы ўжо прыпазніліся. З сакавіка-красавіка онлайн-браніраванне месцаў на лета ў многіх санаторыях было прыпынена, а з зімы Інтэрнэт запоўнены паведамленнямі расіян, якія пыталіся, як даехаць да нашых санаторыяў. У суседзяў падобны адпачынак абыходзіцца значна даражэй.

Але ў некаторых санаторыях і аздараўленчых цэнтрах, калі патэлефанаваць зараз, яшчэ можна знайсці месца (акрамя таго, пуцёўкі можна набыць праз турагенцтвы, праўда, тады вам давядзецца пераплаціць тысяч 40—80 за паслугі). Да таго ж, цяпер выбар тэрмінаў заездаў абмежаваны, як правіла, гэта канец мая—чэрвень, канец жніўня—верасень. Прынамсі, пуцёўка на чалавека на 12 дзён можа каштаваць ад 500 тысяч беларускіх рублёў да больш чым мільёна, усё залежыць ад таго, які нумар вы будзеце здымаць і якія паслугі закажаце (напрыклад, можна ехаць проста адпачываць, а можна — браць пуцёўку з лячэннем). Цікаўцеся, ці ёсць зніжкі на дзяцей пры засяленні на асноўнае ці дадатковае месца.

3. Эх, мора

Часам адпачынак за межамі Беларусі, ля мора, сям'і можа абысціся не даражэй, чым на радзіме. Самы танны варыянт, які мне ўдалося знайсці, — адпачынак у Адэсе ці Крыме на курортах, якія лічацца менш раскручанымі. Ложкамесца ў катэджы побач з морам каштуе — 5 долараў у суткі, калі ехаць туды ў канцы мая — пачатку чэрвеня. Пазней кошт вырасце да 10 і больш долараў. Прыбярэльня на дварэ, душ з вадой, якая награецца на сонцы. Зразумела, такі варыянт для тых, хто павязе на мора зусім маленькіх дзяцей, не зусім тое, што трэба. А вось пражыванне ў нумары з санвузлом і гарачай вадой з трохразовым харчаваннем можа абысціся ў 220 долараў з чалавека. Калі хочаце эканоміць — дамаўляйцеся з атэлем самастойна (за паслугі турагенцтваў вам давядзецца выкласці не менш 20—40 тысяч беларускіх рублёў за кожнага чалавека, у тым ліку малых дзяцей). Наогул сям'я (двое дзяцей і двое дарослых), каб адпачыць ва Украіне 10 дзён у самым пачатку лета, можа ўкласціся ў 800—1000 долараў.

Для параўнання: 10 дзённы адпачынак у Турцыі ці Балгарыі на такую ж сям'ю будзе каштаваць утрая даражэй. Вось, калі б вы замаўлялі пуцёўкі яшчэ з зімы ці ў сакавіку-красавіку, маглі значна эканоміць, пуцёўкі, якія прадаюцца па раннім браніраванні, на 15—30 працэнтаў таннейшыя. Майце на ўвазе, што ў маі і верасні адпачынак на моры больш танны, чым бліжэй да ліпеня, цэны на пражыванне могуць вырастаць на дзясяткі-сотню долараў з кожным тыднем. Прынамсі, пуцёўкі ў аднолькавых па катэгорыі атэлях у Турцыі і Балгарыі могуць супадаць, пры тым, што сэрвіс у першай усё ж больш наладжаны. Калі вы выбіраеце харчаванне па сістэме «ўсё ўключана», дадатковая ежа вам не спатрэбіцца: на тэрыторыі гатэляў працуе некалькі рэстаранаў і кавярняў, дзе вы можаце знайсці ўсё, што трэба. Калі вы рашыцеся ехаць з зусім малымі дзецьмі (хлопчыкі і дзяўчынкі да двух гадоў адпачываюць бясплатна), зможаце знайсці там стравы і для іх. Для немаўлят ёсць сэнс хаця б на першыя дні захапіць з сабой пюрэ ў слоіках (на месцы адзін слоічак дзіцячага харчавання вам можа каштаваць да 6 долараў), і сокі (напрыклад, у Турцыі нават у дарагіх гатэлях з гэтым туга). Пацікаўцеся, які там пляж і ўваходы ў мора. Пры гатэлях працуюць дзіцячыя пакоі, дзе аніматары прыдумляюць для малых розныя забавы. Прынамсі, замежнікі больш проста, чым мы, ставяцца да дзіцячага адпачынку і вязуць сваіх карапузаў на адпачынак з самага ранняга ўзросту, яны запускаюць малых у басейны, пакуль немаўляты спяць, у каляскі цягнуць іх з сабой у рэстараны і на дыскатэкі.

У самастойнае плаванне

Вы ўжо выкарысталі свой адпачынак, а дзіця на школьныя канікулы заняць трэба. Ужо з сямі гадоў дзіця можна адправіць адпачываць у складзе арганізаванай групы. І варыянтаў для падарожжа з кампаніяй аднагодкаў зашмат. Можна проста выправіць яго на мора адпачываць, а можна абраць нейкую праграму, якая спрыяе развіццю дзіцяці. Напрыклад, у Балгарыі і Турцыі марскія купанні можна сумяшчаць з урокамі па англійскай мове. Альбо паехаць на мора з інструктарам, які будзе вучыць плаваць. Ёсць лагеры нават з урокамі віндсёрфінгу, танцамі, мастацкім ухілам, з веласіпеднымі і пешымі экскурсіямі, сплавам на каноэ, карасканнем на гарах і ў пячорах, начным спускам пры святле паходнюў на рафтах. Толькі каштаваць такія замежныя дзіцячыя туры могуць часам у 2 разы больш, чым просты адпачынак малога на моры (1000—2000 долараў за 15 дзён). Калі вы збіраецеся купіць падобныя туры ў агенцтве, пацікаўцеся, ці мае яно права на арганізацыю дзіцячага адпачынку. Абавязкова высвятляйце, што ўваходзіць у кошт пуцёўкі (ад праезду, пражывання, харчавання, страхоўкі, аплаты паслуг педагогаў, якія будуць займацца з дзецьмі, да аплаты экскурсій, якія запланаваны падчас тура). Калі вы выпраўляеце дзіця за мяжу, абавязкова трэба заверыць у натарыуса заявы абодвух бацькоў са згодай на такое падарожжа.

Дарэчы, творчыя і экстрэмальныя лагеры для малых непасед ладзяцца і ў Беларусі. Пражыванне ў абсталяваным палатачным лагеры з харчаваннем і забаўляльнай праграмай на 12 дзён можа каштаваць каля 400 тысяч. Сярод праграм, якія прапануюцца, — школы выжывання, знаёмства з элементамі спартыўнай і прыкладной акрабатыкі (паркур), навучанне верхавой язде, стральбе з лука і арбалета, для дзяўчынак — усходнія і сучасныя танцы і шмат іншага.

Калі пастарацца, можна адшукаць для свайго сына ці дачкі «самастойны» адпачынак і ў вёсцы. Напрыклад, гаспадыня дамка летам сядзіць на прысядзібным участку са сваім унукам і гатова за грошы даглядаць яшчэ дадатковае дзіця.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Які адпачынак вы выбіраеце?

А як вы будзеце адпачываць са сваімі дзецьмі, пацікавілася я ў мінакоў.

Аліна ПАТАПАВА: Навошта камусьці плаціць грошы, калі малое можна выдатна аздаравіць самім. Штогод мы з сынам выязджаем на дачу. Мы забываемся пра ўсе прастуды. Тут ён расце як на дражджах і мацнее не па днях, а па гадзінах. Ён увесь час нечым заняты, то корпаецца ў зямлі, то плёскаецца ў халоднай вадзе, бывае, што наогул знікае са сваёй кампаніяй.

Валодзя БАРАНАЎ: Штогод усёй сям'ёй мы едзем адпачываць на Браслаўскія азёры. Здымаем адзін і той жа дамок за 300 долараў у месяц. Выбралі менавіта сялянскую хатку, жонцы вельмі падабаецца, што гэта стары драўляны зруб з адпаведным вясковым пахам, што на акенцах вісяць вышываныя фіранкі, а на ложках самаробныя пакрывалы. Гаспадары нас забяспечваюць сваёй гароднінай, у мясцовых набываем малако і тварог. На машыне аб'язджаем усе азёры, мясціны там вельмі прыгожыя. Сыну падабаецца плаваць на лодцы і рыбачыць.

Святлана і Зміцер КУШНЯРОВІЧЫ: Мы самі з вёскі, таму праблем з тым, каб падыхаць свежым паветрам, для двух нашых дачок няма. Але ўсё ж хочацца нейкай экзотыкі. У мінулым годзе вазілі іх у Турцыю, абралі сістэму «ўсё ўключана». Адпачынак нам абышоўся роўна ў столькі, колькі мы заплацілі за пуцёўку (2500 на дваіх дарослых і дваіх дзяцей за 10 дзён), бо «хлеба і відовішч» хапала на тэрыторыі атэля. Ні на што, акрамя экскурсій, не трэба выдзяляць дадатковыя грошы. За год да таго мы ўсёй сям'ёй ездзілі ў Крым, і там праматалі значна больш. Акрамя таго, уражанні ад гэтых адпачынкаў засталіся зусім розныя. Калі ў Крыме нам пастаянна даводзілася змагацца з персаналам атэля, дык у Турцыі мы адчулі сябе каралямі.

ЗЛАЯ ЦЁТКА ІНФЛЯЦЫЯ

Аб інфляцыі і рэальным жыцці ва ўмовах глабальнага крызісу наш карэспандэнт гутарыць з вядомым беларускім эканамістам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. Заікам.

— Па апошніх звестках Міністэрства эканомікі Беларусі, у першым квартале інфляцыя склала 6,1 %. Як бы вы пракаментавалі гэты паказчык?

— Відавочна, гэта даволі вялікая і, прама скажам, непрыемная лічба. Таму трэба зрабіць усё магчымае, каб па выніках года інфляцыя не выйшла за прагнозныя параметры. І тым самым выратаваць рублёвыя і валютныя зберажэнні і ўклады на банкаўскіх дэпазітах ад замаху «злой цёткі інфляцыі». Думаю, варта ў найбліжэйшай будучыні правесці карэкцыю даходаў розных слаёў насельніцтва, у першую чаргу пенсіянераў.

Праўда, крызіс нікога не шкадуе і б'е па працоўных у іншых краінах. І не толькі шляхам інфляцыі. Давайце паглядзім, як складваецца сітуацыя ў нашых суседзяў — Еўрасаюзе. У сакавіку ў краінах еўразоны зафіксаваны рэкордна нізкі ўзровень інфляцыі — 0,6 % у гадавым вылічэнні, хоць яшчэ ў лютым ён быў удвая большы. Самыя нізкія паказчыкі адзначаны ў Ірландыі, Партугаліі і Люксембургу. Асабліва выраслі цэны ў Літве, Латвіі і Румыніі. У параўнанні з мінулым месяцам у еўразоне істотна ўзняліся цэны на бытавую тэхніку і адзенне, але патаннела жыллё і транспарт, некаторыя паслугі.

Разам з тым, у Еўрасаюзе згортваецца вытворчасць, скарачаецца ўнутраны попыт, звальняюцца тысячы рабочых і служачых, хутка расце ўзровень беспрацоўя, усё часцей праводзяцца рашучыя акцыі пратэсту. У Германіі — вядучай эканоміцы ЕС, сёлета прагназуецца зніжэнне ВУП на 6 %, а колькасць беспрацоўных дасягне 5 мільёнаў. І гэта на фоне нізкай інфляцыі. Так што ўсё трэба суадносіць з рэальным жыццём.

— Аднак чаму апошнім часам знізілася інфляцыя і ў Расіі, хоць яна моцна залежыць ад паставак па імпарце?

— Чым большая нацыянальная эканоміка, тым менш адчувальныя ў краіне інфляцыйныя наступствы. Гэта назіраецца ў Кітаі, ЗША, Еўрасаюзе і нават у Расіі. Апошняя завозіць з-за мяжы амаль 70 % харчавання, у яе велізарны імпарт спажывецкіх тавараў, яна таксама купляе шмат дарагіх шыкоўных іншамарак, напрыклад, сярод багацеяў папулярныя аўтамабілі «ламбарджыні» па $500 тысяч за адзінку. Расія сёння — краіна кантрастаў у класічным разуменні гэтага выразу. З пачатку крызісу расійскі рубель быў дэвальваваны амаль на 50 %, што амаль удвая больш, чым беларускі рубель. Прагназуецца, што ў Расіі па выніках 2009 года інфляцыя дасягне 15 %. Гэта таксама шмат.

— А як можна больш-менш эфектыўна супрацьстаяць інфляцыі?

— Зніжэнне цэнаў на спажывецкія тавары, паслугі, прадукты харчавання — даволі дзейсная мера. Бо самая яркая праява інфляцыі — рост цэнаў. А яны падчас крызісу звычайна падаюць — гэта вам кожны эканаміст скажа. Такі аб'ектыўны і заканамерны працэс. Бо тое, што мы цяпер назіраем у свеце, невыпадкова называюць яшчэ і крызісам перавытворчасці. Сёння прапановы тавараў і паслуг перабольшваюць попыт, людзі пачынаюць менш набываць. Аднойчы становіцца відавочным, што выпушчана шмат лішняй прадукцыі. Што з ёй рабіць? І вытворцы ў залежнасці ад абставінаў скідваюць цану, часам на 20-30 %, а то і больш. У гэтым, так бы мовіць, станоўчы бок крызісу для звычайных спажыўцоў.

— А калі зніжэнне цэнаў не адбываецца?

— Гэта значыць, да сапраўднага крызісу мы яшчэ не даехалі. Ён яшчэ чакае нас наперадзе ва ўсёй «сваёй прыгажосці».

— Але ад так званай «перавытворчасці» і падзення попыту ўжо пачало ліхаманіць нашу прамысловасць, ёй цяжка збываць прадукцыю.

— А вось гэта самы негатыўны бок крызісу, бо ў выніку затаварвання складаў узнікае пагроза скарачэння працоўнага тыдня, спынення вытворчасці прадукцыі, звальнення часткі персаналу і г. д. Цяпер наступае момант ісціны для нашых прадпрыемстваў. Ім належыць прыкласці максімум намаганняў, каб у прынцыпова новых умовах не толькі выжыць і захавацца, але і перабудаваць вытворчасць, умацавацца на рынках збыту гатовых вырабаў. Магчыма, давядзецца, калі няма іншага выйсця, пайсці на перапрафіляванне вырабу прадукцыі, рэзкае зніжэнне яе сабекошту. У гэтым сэнсе добры прыклад паказвае славуты расійскі завод ГАЗ, які пастаўляе нам вядомыя машыны «Газелі». Адна з іх, як плануецца, хутка будзе каштаваць удвая менш за базавую мадэль. На заводзе знайшлі рэзервы істотнага зніжэння цаны свайго вырабу і тым самым маюць неблагія шанцы пашырэння збыту аўтамабіля. Бо ён па цане будзе вельмі канкурэнтаздольным і прывабным для спажыўцоў, у тым ліку і ў нашай краіне. І тут расіяне не адны. Многія вытворцы аўтатэхнікі сёння зніжаюць цэны.

— Чаму крызіс асабліва моцна, я сказаў бы бязлітасна, ударыў па пераважнай большасці сусветнага аўтапрама? З чым гэта звязана, бо менш рухацца людзі не сталі?

— Але і яны сталі і больш абачлівымі. Аўтапрам і нерухомасць, як тавары чацвёртай спажывецкай хвалі (аб прыродзе і сутнасці гэтых хваляў мы ужо вялі з вамі размову на старонках «Звязды») звязаны адным ланцугом. Падчас крызісных узрушэнняў яны першымі адчуваюць на сабе іх уплыў. Бо набываліся гэтыя дарагія рэчы і кватэры, дамы часцей за ўсё за крэдыты. І справа не толькі ў тым, што грошы сёння падаражэлі — паўсюдна банкі (у Беларусі таксама) узнялі працэнтныя стаўкі. Сёння многіх людзей у той жа Еўропе ды і ў нас больш хвалюе заўтрашні дзень, напрыклад, ці застанецца заробак на ранейшым узроўні.

Таму цяпер многім не да новай машыны. Гэта пацвярджаецца статыстыкай. Згодна са звесткамі еўрапейскай асацыяцыі аўтавытворцаў, продажы легкавых аўтамашын у Еўропе ў першым квартале знізіліся на 17,2 % у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, ці больш чым на тры мільёны адзінак. Заўважу, зніжэнне попыту на аўтамабілі працягваецца ўжо не першы месяц. Праўда, у рамках рашучай фінансавай падтрымкі аўтапрама ў некаторых краінах удалося дасягнуць росту продажу аўтамашын. Але, думаю, гэта часовая перамога.

— Пытанне ў працяг тэмы аб крэдытах. Калі крызіс спрыяе зніжэнню цэнаў і ўтаймаванню інфляцыі, то чаму ў нас істотна выраслі крэдытныя стаўкі?

— Таму што сувязь паміж дэвальвацыяй і інфляцыяй прамая. Узровень дэвальвацыі ў многім вызначае паказчык інфляцыі. Пасля дэвальвацыі нацыянальнай валюты ў пачатку года на 25 % на большасць імпартных тавараў цэны скокнулі прыкладна на чвэрць. А імпарт заўсёды моцна ўздзейнічае на ўнутраныя спажывецкія цэны.

Апошнім часам павялічылася колькасць выпадкаў невяртання крэдытаў і парушэнняў тэрмінаў вяртання запазычанасці. Сёння банкі лічаць за лепшае перастрахавацца, а таму абмяжоўваюць кола крэдытаатрымальнікаў, больш уважліва вывучаюць іх фінансавыя магчымасці, перш чым падпісаць дагавор. Банкіраў можна зразумець — яны рызыкуюць вялікімі грашыма.

Але з іншага боку, а ці варта сёння так ужо імкнуцца браць пад вялікія працэнты банкаўскія крэдыты, якія нават празвалі «забароннымі» зза іх дарагоўлі? Я раіў бы моцна падумаць над гэтым кожнаму, хто мае патрэбу ў грошах. Можа лепш адкласці да лепшых часоў тую ці іншую дарагую пакупку? Як гэта робяць сёння шведы. Хоць іх краіна больш-менш трымае ўдар крызісу, шведы рэзка скарацілі паходы ў банкі па крэдыты. Бо яны думаюць у першую чаргу пра тое, як будуць вяртаць немалыя грошы ды яшчэ з працэнтамі, калі не выключаецца пагроза страты работы, іншых крыніц даходаў.

Калі зніжэння цэнаў не адбываецца, гэта значыць, што да сапраўднага крызісу мы яшчэ не даехалі.

Незалежная экспертыза Леаніда Заікі

У нашых банках грошы сталі ну вельмі дарагімі. На мой погляд, цяпер па такіх «шалёных» стаўках бяруць крэдыты толькі тыя, у каго безвыходная сітуацыя, хто вымушаны плаціць па ранейшых крэдытах. Скажам, за ўзятыя летась у банку да крызісу долары вы набылі «наварочаную» іншамарку «ўсяго» за $30 тысяч. Першы ўдар вам як крэдытаатрымальніку нанесла дэвальвацыя беларускага рубля, другі — прадаўцы машыны з салона, якія нядаўна значна знізілі цану на машыну. Яна цяпер каштуе значна менш тых $30 тысяч, якія вы, умоўна кажучы, год таму ўзялі ў банку. Вам ці некаму іншаму цяпер даводзіцца аддаваць па больш высокай банкаўскай стаўцы і з дэвальваванай зарплаты. Не пазайздросціш небараку, якому прэстыжная машына абыдзецца амаль па двайной цяперашняй цане. Але гэта жыццё і плаціць па крэдыце трэба абавязкова.

— Чым пагражаюць для нас перапоўненыя склады?

— Увогуле затаварванне складаў — з'ява небяспечная, яна можа нанесці моцны ўдар нашай банкаўскай сістэме. Сёння шмат вялікіх і сярэдніх прадпрыемстваў набралі шмат крэдытаў на велізарныя сумы. Дастаткова сказаць, што з пачатку года ў эканоміку ўлілося на 60 % больш крэдытных грошай, чым летась, што, між іншым, таксама не садзейнічае барацьбе з інфляцыяй. Крэдытныя сродкі, як вядома, хутка заканчваюцца. І калі прадукцыю не набываюць ці мала набываюць, то з-за недастатковай выручкі не будзе грошай для вяртання крэдытаў. А банкі бяруць грошы для крэдытаў з укладаў насельніцтва. І такім чынам можа ўтварыцца заганнае кола неплацяжоў, якое пагражае нават стаць бомбай запаволенага дзеяння для нашай эканомікі. Таму гатовую прадукцыю лепш не марынаваць на складах і працаваць на рынак, на спажыўца.

— Цяпер, ва ўсякім разе па знешніх прыкметах, наступіла пэўная валютная стабілізацыя. Ці гэта толькі здаецца?

— Хутчэй, другое, чым першае. Гэта не стабілізацыя, а больш правільна сказаць — супакойванне валютнага рынку. Увогуле увесь 2009 год будзе складаным, цяжкім і малапрадказальным. Ёсць прагнозы, што няпэўная эканамічная сітуацыя захаваецца аж да 2012 года. Таму рана пакуль пераводзіць дыханне і супакойвацца, трэба быць пільнымі і гатовымі да разгортвання падзей па самых розных варыянтах, у тым ліку і непажаданых.

— Леанід Фёдаравіч, а ці вялікія сёння інфляцыйныя чаканні насельніцтва?

— Думаю, што яны маюць месца, і даволі значнае, у нашым паўсядзённым жыцці. Людзей узрушыла вымушаная дэвальвацыя рубля ў пачатку года, ды і няпэўная эканамічная сітуацыя на глабальных рынках таксама выклікае заклапочанасць. Але ў народзе не адчуваецца панічных настрояў, няма жудасных чутак, нешта не бачна, каб людзі мяхамі цягнулі дамоў цукар, соль, запалкі, крупы, хлеб, іншыя тавары і рэчы першай неабходнасці, як гэта здаралася ў нядаўнім мінулым.

— Многія памятаюць жудасную гіперінфляцыю пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, сумнавядомы расійскі дэфолт 1998 года, калі грошы хутка ператварыліся ў каляровыя паперкі, людзі страцілі свае ўклады ў банках. Такое можа паўтарыцца?

— Не думаю, хоць поўнай упэўненасці няма. Ва ўмовах фінансавай нестабільнасці, якая ўласціва крызісам, галоўнае для кожнага чалавека — захаваць свае зберажэнні. Якім чынам? На мой погляд, лепш за ўсё мець так званы кошык валют. Напрыклад, трымаць зберажэнні ў рублях, даларах, еўра і юанях. Тым больш што сёння «Беларусбанк» практыкуе валютныя ўклады насельніцтва. Яго адкрыць можа кожны, дзе ёсць побач філіял «Беларусбанка». Але гэты кошык валют мае карысць у тым выпадку, калі вы валодаеце значнымі запасамі грошай. А з-за дробязі не варта разводзіць мітусню.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ЕўрАзЭС размаўляе на мове культуры

Фестывалі

Яшчэ ў 2006 годзе было прынята рашэнне аб правядзенні ў 2009 годзе фестывалю культур народаў Еўразіі. Прапанову гэтую выказаў Прэзідэнт Беларусі. Наша краіна першая прымае гэты фестываль.

Мінск, а таксама іншыя гарады нашай краіны, атрымалі гонар прыняць такі фестываль як падзяку за ўнёсак у вызваленне планеты ад фашызму. Менавіта 65-й гадавіне вызвалення Беларусі прысвечаны гэты фестываль, які пачнецца сёння. Адкрыццём стане ўрачысты канцэрт у Палацы Рэспублікі.

У фестывалі возьмуць удзел прадстаўнікі дзяржаў, якія ўваходзяць у Еўразійскую эканамічную супольнасць. Але каб эканамічнае супрацоўніцтва ішло больш плённа, народы павінны лепш разумець адзін аднаго. Самы лепшы шлях адчуць адметнасці і таленты кожнага народа — пазнаваць яго культурныя здабыткі, каштоўнасці.

Больш за 200 удзельнікаў з Расіі, Казахстана, Кыргызстана прыедуць у Мінск. Гэта заслужаныя майстры культуры краін, моладзь, якая ўжо праявіла свае таленты ў розных відах мастацтваў. Што асабліва важна, мерапрыемствы выйдуць за межы сталіцы Беларусі — госці наведаюць Гродзенскую, Магілёўскую, Віцебскую вобласці. Міністэрства культуры Беларусі прадумала праграму так, каб было цікава не толькі жыхарам нашай краіны пазнаёміцца з культурай іншых народаў, але каб госці павезлі на радзіму найлепшыя ўспаміны пра Беларусь. У іх будуць магчымасці пазнаёміцца з музеямі і гістарычнымі помнікамі нашай краіны, акрамя таго, патрапіць у сэрца «беларускага алмазу», наведаўшы Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«ПАРА СУМЕСНЫХ ВЯЧЭРАЎ ПЕРАД ЧЭМПІЯНАТАМ — І МЕЗІН БЫЎ ГАТОВЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

В.К. — Я глядзеў дома, побач з сям'ёй, таксама хварэў за Расію.

Э.З. — Не глядзеў увогуле. Мне было нецікава. Магчыма, з'явіцца час, пагляджу.

— Ці звязваўся трэнерскі штаб з братамі Касціцынамі, якія з-за траўмаў не прыехалі ў Швейцарыю?

Э.З. — Скажу за сябе — я не тэлефанаваў пасля чэмпіянату. Сяргей перанёс аперацыю, у Андрэя таксама была траўма. Ім патрэбен цяпер адпачынак. Мяркую, што ў найбліжэйшы час з імі звяжамся.

— Руслан, што можаце сказаць пра Кантынентальную хакейную лігу?

— Не надта шмат пра яе ведаю. Але хлопцы задаволеныя — і арганізацыяй, і правядзеннем. Незадаволеныя, што ў апошні час у іх урэзалі заработныя платы. Але ў асноўным я чуў толькі станоўчыя водгукі.

— Зборная перад кожным матчам праводзіла сходы?

Р.С. — Перад турнірам у нас было пару хуткіх сходаў — пазнаёміліся з хлопцамі маладымі, пару анекдотаў расказалі...

— Можаце нам расказаць які-небудзь з іх?

— Тыя анекдоты не для прэсы...

— Руслан, сёння ў вашага сына дзень нараджэння?

— Так, сёння яму спаўняецца два гады. Злятаю ў Амерыку на пару гадзін, павіншую... Калі сур'ёзна, яшчэ не тэлефанаваў, бо там яшчэ ноч. Але абавязкова павіншую. Я кожны дзень тэлефаную жонцы. Дзякуючы Інтэрнэту, бачу дзяцей, размаўляю з імі. Дзеці — галоўная радасць у маім жыцці.

— Дачка ўжо стаіць на каньках?

— Стаіць, але пакуль гэта не надта яе цікавіць.

— Як збіраецеся праводзіць адпачынак?

Э.З. — Спачатку буду ў Мінску, потым — на мора.

Р.С. — Збіраюся ехаць у Амерыку. Лета правяду там, у Каліфорніі, Каларада, Лас-Вегасе.

— Згуляеце ў казіно?

— Я больш люблю гуляць у покер. У Лас-Вегасе правядзём выхадныя, паглядзім, як там атрымаецца. Магчыма, на некаторы час прыляцім у Беларусь. Летась мы былі тут летам. З двума дзецьмі падарожнічаць усё ж складана. Спачатку ў нас была думка паехаць на чэмпіянат усёй сям'ёй. Але вырашылі, што дзецям пакуль больш камфортна дома.

— Калі ў зборнай з'яўляецца Глен Хэнлан, прыходзіць і прыстойны вынік. У чым сакрэт поспеху гэтага трэнера?

Р.С. — Я першы раз прыехаў у зборную пад яго кіраўніцтвам. Магу сказаць толькі пра станоўчыя эмоцыі ад гэтага спецыяліста. Мы разумеем адзін аднаго, і гэта самае галоўнае. Трэнер мне давярае, і ў мяне добрае стаўленне да яго.

Свае пытанні задалі журналісты і Глену Хэнлану, які праводзіць свой адпачынак у Фінляндыі.

— Глен, чым цяпер займаецеся?

— Я толькі вярнуўся ў Фінляндыю. Сын ходзіць у школу, жонка таксама працуе ў школе. Засталося яшчэ тры тыдні, і я не магу дачакацца, калі ўсё гэта скончыцца. Потым паедзем у летні дамок.

— Якія вашы самыя яркія ўражанні пасля чэмпіянату свету?

— Гэта буліты, закінутыя Алегам Антоненкам. Штосьці проста неверагоднае, я такога ніколі не бачыў. Гэта пераможная шайба Руслана Салея нарвежцам. І перамога над фінамі — прынцыповая для мяне.

— Вам не хацелася прыехаць у Беларусь, дзе вас усе любяць, замест таго, каб ехаць у Фінляндыю, зборную якой вы перамаглі, чым заслужылі незадаволенасць мясцовых балельшчыкаў?

— У нас у сям'і бос — мая жонка. А яна працуе ў Фінляндыі. У мяне не было выйсця.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

УНП 100061627.
ОАО «Белаттракцион»
продает недвижимость в г. Минске.
Обращаться по тел.: 222 73 14, (Velcom) 654 79 06.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков

	Лот № 1		
Предмет аукциона	Насосная станция второго подъема инв. № 452/С-184; насосная станция первого подъема инв. № 452/С-180; гаражи инв. № 452/С-183; склад ГСМ инв. № 452/С-182; здание техническое с пристройкой (гаражи) инв. № 452/С-181; сооружение специализированное энергетики (электрические сети) инв. № 452/С-5501; сооружение специализированное коммунального хозяйства (канализационная сеть) инв. № 452/С-5503; сооружение (септики – 3 единицы) инв. № 452/С-5504; сооружение (технологический трубопровод) инв. № 452/С-5505; сооружение (резервуар для топлива) инв. № 452/С-5506; сооружение (пожарный резервуар) инв. № 452/С-5507; сооружение (пожарный резервуар) инв. № 452/С-5508; сооружение (артезианская скважина) инв. № 452/С-5509, сооружение (бетонное покрытие) инв. № 452/С-5510; сооружение (асфальтовое покрытие) инв. № 452/С-5511; сооружение специализированное водохозяйственного назначения (водопроводная сеть «чугун», «сталь») инв. № 452/С-5518, оборудование в количестве 7 инвентарных номеров и право заключения договора аренды земельного участка площадью 5,3514 га сроком на 50 лет		
Место нахождения объектов	Гродненская обл., Зельвенский р-н, г.п. Зельва, ул. Смирнова, 2		
Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	306 636,685		
Сумма задатка, тыс. руб.	30 663,000		
	Лот № 2	**Лот № 3**	
Предмет аукциона	Здание неустановленного назначения (сарай) инв. № 422/С-430 и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0054 га сроком на 50 лет	Изолированное нежилое помещение инв. № 442/D-133 и право заключения договора аренды доли в праве на земельный участок, составляющей 0,0152 га, сроком на 50 лет	
Место нахождения объектов	Гродненская обл., Островецкий р-н, г.п. Островец, ул. Ленинская, 77	Гродненская обл., Островецкий р-н, г.п. Островец, ул. Ленинская, 77	
Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	2 103,416	30 996,049	
Сумма задатка, тыс. руб.	210,000	3 099,000	
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Республиканское унитарное предприятие «Белорусский радиотелевизионный передающий центр» Контактные телефоны: (8-0152) 43-01-66, 43-44-28		
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82		

1. Аукцион состоится **20 мая 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 18 мая 2009

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Лечымся без лекаў

Белы цвет, чорная ягада

Па берагах рэк, па схілах яроў і сярод кустоўя прыкладна ў сярэдзіне мая зацвітае чаромха. Яе краса — белыя пушыстыя пахкія гронкі. Час цвіцення чаромхі — вяха, якая падзяляе вясну на два перыяды. Зацвіла чаромха — значыць, закончылася зялёная вясна і настае позняя, або перадлецце. Увогуле з чаромхай звязана шмат народных прыкмет... А ці ведаеце вы, што гэтая бялюткая прыгажуня здаўна выкарыстоўваецца ў народзе як лекавая расліна: духмяная гарбата з лісця чаромхі дапамагае пры прастудзе, а сок ягад загойвае раны і запаленні...

Гаючыя ўласцівасці чаромхі тлумачацца багатым хімічным складам. Так, у яе пладах (чорныя бліскучыя касцянкі з саладкаватым прысмакам, якія спяваюць у жніўні-верасні) выяўлены цукры, дубільныя рэчывы, арганічныя кіслоты, гліказіды, флаваноіды, мікраэлементы: жалеза, марганец, малібдэн, магній, медзь, цынк; у кветках і лісці прысутнічаюць аскарбінавая кіслата, эфірны алей (у яго склад уваходзіць гліказід пруназін, што абумоўлівае насычаны водар). Акрамя таго, усе часткі чаромхі: і плады, і лісце, і кветкі — валодаюць фітанцыднымі ўласцівасцямі. Лятучыя фітанцыды чаромхі адпужваюць, а часам і забіваюць мух, камароў, сляпнёў. Чаромха ў цвіценні — гэта сапраўдны біялагічны ачышчальнік паветра ад хваробатворных мікраарганізмаў. Але майце на ўвазе: працяглае знаходжанне ў памяшканні, дзе стаіць чаромхавы букет, небяспечнае для чалавека, бо можа развіцца атручэнне арганізма, якое праявіцца ў галаўным болі, слабасці, галавакружэнні, млоснасці. Лепшае супрацьяддзе ў гэтым выпадку — свежае паветра.

У дэндратэрапіі (лячэнне захворванняў энергетыкай дрэваў) чаромха лічыцца дрэвам-«спажыўцом». Такія дрэвы лечаць, выцягваючы негатыўную энергію. Чаромха — лепшы сябар дзяўчат і юнакоў, яна лечыць душэўныя расчараванні маладых, пад яе ўплывам лягчэй дараваць ці папрасіць прабачэння.

РЭЦЭПТЫ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

● Пры расстройстве жывата як вяжучы сродак прымяняйце адвар сухіх пладоў: 15 г сыравіны заліце 1 шклянкай гатаванай вады, кіпяціце 20 хвілін, працадзіце, прымайце па 2 ст. лыжкі 2—3 разы на дзень. Альбо прыгатуйце страўнікавую гарбату: вазьміце ягады чаромхі (3 часткі) і чарніцы (2 часткі); 2 ст. лыжкі сумесі заварыце 2 шклянкамі гатаванай вады, кіпяціце на працягу 20 хвілін, працадзіце, прымайце 3 разы па 1/4—1/2 шклянкі.

● Для нармалізацыі абмену рэчываў: 1 ст. лыжку сухіх кветак заліце шклянкай кіпеню, настойвайце 30 хвілін, працадзіце, прымайце па 1 ст. лыжцы 3 разы на дзень да яды.

● Пры бранхіце, кашлі і прастудзе вазьміце 10 г кары чаромхі, заліце шклянкай вады і кіпяціце паўгадзіны, затым адвар працадзіце і даліце гатаванай вадой да поўнай шклянкі, піце па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень.

● Настой чаромхавых кветак дапамагае стомленым вачам — гэтым рэцэптам калісьці карысталіся рукадзельніцы, а сёння ён дапаможа тым, хто шмат працуе за камп'ютарам: 1 ч. лыжку свежых або сухіх кветак заліваюць шклянкай халоднай вады і настойваюць 7—8 гадзін. Змочаную настоем сурвэтку прыкладаюць да вачэй.

● Як мачагонны і патагонны сродак выкарыстоўваецца адвар кары чаромхі. Каб прыгатаваць яго, трэба ўзяць 5—10 г сыравіны, заліць 2 шклянкамі вады і кіпяціць 10 хвілін, затым працадзіць і піць па 1 ч. лыжцы 3 разы на дзень.

● Для лячэння рэўматызму гатуюць адвар кары і маладых галінак чаромхі: 10 г сыравіны заліваюць шклянкай вады, кіпяцяць 30 хвілін, працэджваюць у гарачым выглядзе, ахалоджваюць і даводзяць да першапачатковага аб'ёму гатаванай вадой. Прымаюць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень да яды.

● Пры язвах, дэрматыце і фурункулёзе для прамывання выкарыстоўваюць настой сцёблаў і лісця чаромхі: 20 г сухой здробненай сыравіны настойваюць 30 хвілін на шклянцы крутога кіпеню, а затым працэджваюць.

● Настой лісця чаромхі прымяняецца для паласкання пры стаматыце і захворваннях слізістай абалонкі поласці рота.

● Каб на нейкі час зняць зубны боль, пакладзіце на хворы зуб ягаду чаромхі, аднак доўга яе не трымайце.

Увага! *У чаромсе змяшчаецца гліказід амігдалін, які, раскладаючыся, выдзяляе сінільную кіслату, таму злоўжыванне можа выклікаць моцнае атручэнне. Чаромха супрацьпаказана пры запорах, гемароі, цяжарнасці.*

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ПАЛІКЛІНІКІ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЛЕТНІ РЭЖЫМ

Усе дзяржаўныя паліклінікі Мінска з 16 мая пераходзяць на летні рэжым працы. Пра гэта паведамілі ў Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама.

У будныя дні ўсё застаецца па-ранейшаму — рэгістратуры будуць працаваць з 7.00 да 20.00, прыём урачоў усіх спецыяльнасцяў з 8.00 да 20.00. Выклікаць на дом доктара дарасламу хвораму можна з 7.30 да 19.30, дзіцяці — з 7.30 да 15.00.

Змяненні закранаюць выхадныя. У суботнія дні рэгістратура будзе працаваць з 8.30 да 15.00. А для ўчастковых тэрапеўтаў, педыятраў і вузкіх спецыялістаў уводзіцца зменны графік. Яны будуць прымаць пацыентаў з 9.00 да 15.00. Участковыя медсёстры стануць выконваць урачэбныя прызначэнні дома ў хворых да 18.00.

Прыём выклікаў на дом для дарослых і дзяцей з 8.30 да 14.00. Акрамя таго, з дзевяці раніцы і да трох гадзін дня ў суботнія дні арганізуецца работа дзённага стацыянара і дапаможных службаў — лабараторнай, фізіятэрапеўтычнай, працэдурнага кабінета, кабінета даўрачэбнага агляду. Нядзеля ў паліклініках — выхадны. Так гарадскія паліклінікі будуць працаваць па 30 верасня.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск—Навіны».*

«Гарачая лінія» ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

13 мая — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога радзільнага дома С.Р. Мазітаў.

14 мая — загадчык хірургічнага аддзялення Мінскай ЦРБ І.В. Карпук.

15 мая — загадчык гематалагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы В.В. Савасць-янаў.

Графік работы «прамой лініі» з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (6 мая). Па гарызанталі: Наскок. Каўнер. Арча. Лупа. Фае. Фат. Шалі. Сукно. «Барадзіно». Жан. Пап. Застава. Сіла. Лава. Абак. Апарат. Вага. Пат. Іран. Баул. Каст. Цна. Палонка. **Па вертыкалі:** Абуза. Прычэп. Граф. Аэрастат. Крафт. Джала. Бацян. Кулеш. Заварка. Акінава. Узала. Капал. Атол. Icon. Асавік. Капібара. Лагас. «Рыбалоў». Акант. Адказы на судоку гл. у табліцы.

1	6	7	5	4	9	3	2	8
5	9	8	3	7	2	1	6	4
3	4	2	6	1	8	9	7	5
4	3	6	2	8	7	5	1	9
2	1	9	4	6	5	8	3	7
7	8	5	1	9	3	6	4	2
6	2	4	9	5	1	7	8	3
9	7	3	8	2	6	4	5	1
8	5	1	7	3	4	2	9	6

Сканворд (7 мая). Па гарызанталі: «Верасы». Язь. Гляда. Елка. Падрад. Арабіка. Апал. Галушкі. Тарка. «Сябры». Куст. Плашка. Салака. Паха. Бак. Лак. Пікап. Сякера. Рып. Рона. Нож. Каля. Палаш. Касір. Ірак. Лата. Спод. Пасталы. **Па вертыкалі:** Лагапед. Ява. Палка. Шпалера. Шык. «Харошкі». Сага. Рак. Абакан. Апіс. Сіло. «Бяседа». Ірад. Лоб. Нерат. Зварка. Кап. Араты. Пыж. Макі. Барк. Кукабара. Квас. Капыл. Трак. «Песняры».

Сканворд (8 мая). Па гарызанталі: Мальберт. Мінск. Дача. Таран. Гар. Грам. Ажына. Перл. Паланез. Тварог. Сага. Лакмус. Аматар. Ірга. Апа. Борт. Агарод. Асіна. Балык. Бор. Тартак. Элада. Сап. Страва. Ода. Флагшток. Трэйлер. **Па вертыкалі:** Савастопаль. Масква. Ролік. Ібіс. Мірон. Нанду. Граб. Сват. Газ. Брэст. Бліндаж. Ларок. Арык. Апад. Сыч. Ват. Тук. Агата. Актава. Маг. Апаска. Аер. Мера. Тар. Рог. Апора. Валгаград. Калібр.

І ВІЗЫ, І ІНФАРМАЦЫЯ

З 4 мая ў горадзе Аўгустове (вул. Вежбна, дом 9, каб. 3) пачаў працаваць сезонны консульскі пункт і інфармацыйна-турысцкі цэнтр Беларусі.

У консульскім пункце ў максімальна кароткі тэрмін афармяць групавыя і індывідуальныя турыстычныя візы. Акрамя таго, на працягу пяці працоўных дзён можна атрымаць кароткатэрміновыя дзелавыя альбо гасцявыя беларускія візы. Адначасова замежныя турысты могуць азнаёміцца з падрабязнай інфармацыяй аб турыстычным патэнцыяле Беларусі, умовах, цэнах і спосабах ажыццяўлення экскурсійных паездак.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УСЁЙ ГРАМАДОЙ!

Грузавы кран з прадпрыемства «Гродна—Азот» і спецыяльны пад'ёмнік абласнога ўпраўлення МНС былі задзейнічаны на работах па падыманні купалоў і крыжоў над новым храмам у горадзе над Нёманам — царквой Сабору Усіх Беларускіх Святых.

Тры купалы, галоўны з якіх важыць каля пяці тон, выраблены ў Гродне беларускімі, расійскімі і украінскімі майстрамі з нержавеючай сталі з тытанавым напыленнем. Пазалочаныя крыжы прывезеныя з Расіі.

Гэты храм у мікрараёне Вішнявец, вышынёй больш за 30 метраў, будуецца з 2002 года, як кажуць, усёй грамадой. Спачатку богаслужэнні праходзілі ў вагончыку, а затым — у ніжняй царкве і паўцокальным памяшканні. Непасрэдна ў храме яны будуць праводзіцца пасля завяршэння работ па апрацоўцы і ўнутраным убранні.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«БЕЛАВІЯ» АДКРЫВАЕ РЭГУЛЯРНЫЯ РЭЙСЫ Ў СОЧЫ

З 27 мая палёты будуць выконвацца па серадах і суботах, а з 15 чэрвеня па 7 верасня яшчэ і па панядзелках. З Мінска самалёт будзе вылятаць у 15.10 з прыбыццём у Сочы ў 18.35, з Сочы будзе вылятаць у 19.35 з прызямленнем у Мінску ў 21.05. Час мясцовы.

БЕЛТА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

АЎТАРСКІ-8

Аб'яўляем яго з нормай першага спартыўнага разраду па шашках і на прызы майстра спорту Пятра Шклудава (Наваполацк), якому належаць усе 15 заданняў. Падаём першае з іх — камбінацыйную мініяцюру:



Белыя: a5, d6, e3, e5, f2, f4 (6). **Чорныя:** a3, d8, g5, h4, h6 (5). Выйгрыш.

У рамках бліца-45/3 развяжыце яго праблему:

Белыя: a1, b4, c3, d4, e3, g1, h4 (7). **Чорныя:** a5, b2, c7, e7, f6, g5 (6). Перамога белых.

Для амаатараў стаклетак прапануем задачу Аляксандра Шурпіна (Клімавічы) у якасці бліца-46/3:



Белыя: 8, 10, 13, 19, 34, 37, 39, 40, 44, 48, 49, дамкі 9, 14, 21, 41, 50 (16). **Чорныя:** 4, 23, 25, 27, 28, 32, 35, дамка 16 (8).

Замкнуць дзве простыя чорных: 30 (45A) 2, 25, 20, 9, 30, 40, 36, 38#. Варыянт А(43) застаецца за вамі.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

Па-за конкурсамі разгледзьце і такія задумкі на 64-клетачнай дошцы П. Шклудава:

№ 1. Белыя: c1, c7, d2, e1, f4, g1, g3, g5, h4 (9). **Чорныя:** a3, b4, b8, c3, e3, e7, f8, g7, h2 (9).

d6 (d6) fg5, f6 (e5) ef2, d8 (c3) f6 (ab2) a3 (d2) c3, e7, g7 (e3) f8 (c5) b4x.

№ 2. Белыя: b6, c5, d6, e1, e7, h2, h6 (7). **Чорныя:** a7, d4, e3, f4, f8, g3, g7, h4 (8).

d8 (f6) g5, d2, e7, b4, f4, f4x.

№ 3. Белыя: a1, b4, b6, c3, c5, e1, h2 (7). **Чорныя:** b2, d2, d6, e3, e5, e7 (7).

g3, c3, c3 (g5) d4, h4, f4x.

№ 4. Белыя: a1, b4, c3, c7, d4, d6, e1 (7). **Чорныя:** a5, b2, d2, e5, f4, f6, g3, g5 (8).

e7, f2, g3, e3 (c5) gf4 (b4) e5 (a3) d6 (ab2) d4, c3x.

№ 5. Белыя: d4, e1, e3, e5, f4, g5, h4, h6 (8). **Чорныя:** b2, b4, b6, b8, c3, c7, h2 (7).

Перавага белых. Перакананайцеся ў гэтым самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.11	21.02	15.51
Віцебск —	4.54	20.58	16.04
Магілёў —	5.01	20.52	15.51
Гомель —	5.04	20.42	15.38
Брэст —	5.27	21.17	15.50
Гродна —	5.34	21.10	15.36

Месяц

Поўня.

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Васіля, Максіма, Мікіты, Якава.*

К. *Жанны, Магдалены, Андрэя, Германа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+14..+16°C	КІЕЎ	+14..+16°C	РЫГА	+11..+13°C
ВІЛЬНЮС	+10..+9°C	МАСКВА	+7..+9°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+1..+3°C

13 мая

Дзве даты

1905 год — нарадзілася Стэфанія Міхайлаўна Станюта, славутая беларуская актрыса, народная артыстка Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. З 1932 года працавала ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.

1940 год — толькі што абраны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль заявіў у парламенце: «Я нічога вам не абяцаю, акрамя працы, слёз і поту...».

Цытата дня:

«Калі вы валодаеце глыбокімі ведамі, дайце і іншым запаліць ад іх свае свяцільнікі».

Томас Фулер.

ГАЛАШЭННІ

Свет і сусвет Чалавека

Адной з самых важных складовых частак пахавальнага абраду і абрадаў, звязаных з ушанаваннем продкаў, з'яўляюцца галашэнні па памерлых — жанр, які ўвабраў у сябе жалобу ўсіх пакаленняў людзей з нагоды бяды — смерці роднага чалавека.

● Галашэнні былі пабудаваныя на дыялагічнай аснове. Сваякі памерлага звярталіся да яго з рытарычнымі пытаннямі-зваротамі: на каго ж ты нас пакінуў? Чаму не возьмеш нас з сабой? Як нам надалей жыць без цябе?

«А мая мамачка, а мая мілая,
А прабачай мяне, што я рэдка цябе адведвала.
Я ж далёкая, я ж адзінокая, з малымі дзеткамі.
А мая мамачка, чаму ж ты не адзываешся?»

● Унікальнасць галашэнняў была ў тым, што яны дапамагалі чалавеку хаця б на некаторы момант выплеснуць негатыўныя эмоцыі і тым самым ураўнаважвалі псіхалагічны стан і таго, хто галасіў, і тых, хто прысутнічаў побач.

● Аднак у той жа час у народнай культуры існавалі так званыя залатыя правілы. Напрыклад, тыя, хто галасілі, добра ведалі, што рабіць гэта можна з вызначанай перыядычнасцю. Інакш гэта можа ўплываць на псіхалагічны стан людзей.

● Акрамя гэтага, існавала строгая забарона галасіць пасля захаду сонца. У народзе існавала глыбокая перакананасць, што ўсе слёзы, якія будуць выплаканы паслы захаду сонца, памерлы будзе насіць за плячыма ў вялікім мяху або апынецца замест нябёсаў у падзямеллі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Доктар сустракае свайго даўняга пацыента.

— Добры дзень, на дзіва добра выглядаеце! Як ваша язва?

— З'ехала на тыдзень да маці!

☺

Ганна Семяновіч рыхтуецца стаць мамай. Для кармлення будучага дзіцяці ўжо адгадавала такія малочныя залозы, што немаўля будзе забяспечана не толькі матчыным малаком, але і сліўкамі, смятанай, тварагом і маслам.

☺

Малады чалавек паступае ў кансерваторыю. Усім, каму трэба, ужо дадзеныя грошы. Праходзіць ён удала ўсе іспыты. Застаецца сальфеджыо. Яму кажуць:

— Гэта зусім проста. Мы націснем на фартэпіяна клавішу, а вы адгадаеце.

Ён адварочваецца ад піяніна, слухае ўзятую ноту, потым тыцкае пальцам у аднаго з выкладчыкаў: «Ты націснуў!»

☺

Мыйка вокнаў.
Для нас вымыць акно — раз плюнуць!

☺

Дзве сяброўкі.

— Вой, якая на табе цудоўная сукенка! А што, твайго памеру не было?

У суд Добрушскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні памерлай **АПЛЕСНІНАЙ Галіны Генадзьеўны**, 1972 года нараджэння, ураджэнкі г. Снежнагорска, Краснаярскага края РФ, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Добруш, вул. Палявая, 40/60. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб месцы знаходжання Аплеснінай Г.Г., паведаміць іх суду Добрушскага раёна Гомельскай вобл. на адрас: Гомельская вобл., г. Добруш, вул. Пушкіна, 13 у пісьмовым выглядзе на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **КЛОПАВАЙ Раісы Васільеўны**, 12 лістапада 1957 года нараджэння, ураджэнкі п. Рошча Пачэпскага раёна Бранскай вобласці РФ, якая пражывала ў в. Стара-Красная Слабада Пачэпскага раёна Бранскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Р.В. Клопаву, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Гараскоп стрыжак на май

13 мая. У гэты дзень лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўных боляў, з'яўлення пачуцця страху.

14 мая. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвастрыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.

15 мая. Станоўчы дзень для эксперыментаў са сваімі валасамі. Магчыма, вы знойдзеце для сябе вельмі дакладны імідж, праўда, не без дапамогі цырульніка.

16 мая. Калі падстрыгчыся ў гэты дзень, то валасы будуць лепш расці, стануць густымі і пышнымі. Але памятайце, што сёння супрацьпаказана хімічнае ўздзеянне на валасы (фарбаванне, завіўка). А складаная ўкладка, зробленая ў гэты дзень, пратрымаецца нядоўга.

17 мая. Пасля стрыжкі, зробленай у гэты дзень, валасы стануць танчэйшымі. Затое будуць павольна адрастаць, і форма, створаная цырульнікам, захаваецца надоўга. Магчыма, зменіцца і колер валасоў: яны стануць крыху цямнейшымі.

18 мая. У гэты дзень спробы стварыць прычоску, якая пасуе менавіта вам, будуць паспяховымі. Пасля сённяшняй стрыжкі вашы валасы будуць крыху завівацца.

19 мая. Пасля стрыжкі, зробленай сёння, валасы будуць гусцейшымі, стануць больш цяжкімі. Наведванне цырульні не толькі палепшыць ваш знешні выгляд, але і адновіць душэўную раўнавагу.

20 мая. У выніку стварэння прычоскі ці стрыжкі валасоў вы прыцягнеце да сябе радасць і шчасце.

21 мая. У гэты дзень прыслухайцеся да сябе: калі ў вас ёсць моцнае жаданне змяніць прычоску, тады абавязкова наведайце свайго майстра.

22 мая. Лепш ад стрыжкі ўстрымацца — могуць узнікнуць праблемы са здароўем: павышаная нервовасць, галаўныя болі.

23 мая. Зробленая сёння стрыжка прыцягне паляпшэнне фінансавага становішча, павелічэнне маёмасці і добрае стаўленне кіраўніцтва.

24 мая. Добры дзень для наведвання цырульніка. Сённяшняя стрыжка прыцягне ўдачу і дабрабыт.

25 мая. Сёння не трэба хадзіць да цырульніка: вы можаце не знайсці свайго майстра. Лепш паберагчы нервы і проста адпачыць.

26 мая. Гэты дзень выдатны для афарбоўвання валасоў і хімічнай завіўкі. Цырульнік усё зробіць акуратна і правільна. Вы застанецеся задаволенымі сваім знешнім выглядам.

27 мая. Выдатны дзень для стрыжкі валасоў. Вам удасца змяніць знешні выгляд у лепшы бок.

28 мая. Сёння таксама можаце смела накіроўвацца да цырульніка. Пасля новай стрыжкі вашы валасы будуць расці прыгожымі і здаровымі.

29 мая. Сённяшні дзень як мага лепш падыходзіць да змены іміджу. Зробленая ў гэты дзень стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: ваша фінансавае становішча прыкметна палепшыцца.

30 мая. Сённяшняя стрыжка не толькі зробіць вас яшчэ больш прывабнымі, але і прыцягне ўдачу. Вы напоўніцеся аптымізмам і энергіяй.

31 мая. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі вашай знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвастрыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца праніклівасць розуму.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2518. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Занатоўкі мастака

ПРАВАДЫРЫ

Шархаценне слухаю. У шолахі, у шэпты, у пасвістванні і ў пастогванні ўслухоўваюся. На большае я і не здатны. Ляжу і прыслухоўваюся, як павольна і з замераннямі сыплецца тонкі пясок у вушыу. Кроў рухаецца ў маім зморaным ды ператомленым целе. Знешні свет сцямнеў, страціў каляровасць і згубіў гучанне, таму ляжу з заплюшчанымі вачыма і ўслухоўваюся ў свой непраяснены ўнутраны стан. Занураюся я ў яго, запакоўваюся, нібыта — я немаўля, і нехта спавівае мяне ў мяккую пялюшку. Мне мулка, цесна, задушліва і няўтульна, але расплюшчыць вочы не магу і сказаць нічога не здатны, язык не паварочваецца. У такі момант я згадваю сваіх праважатых: Казіка і Броніка з Кісялёў...

Некалі майму таварышу з паэтаў споўнілася трыццаць тры, мы адзначалі ягоны дзень народзінаў, пілі белую на маёй кухні. «Адчуў, што мяне цягне да зямлі... Быў лёгкі, светлы, паветраны, а тут — трыццаць тры — і пацягнула да глебы. У трыццаць тры мяняецца стыхія чалавека, для мяне яна змянілася з паветранай на зямную...» — так казаў мне таварыш з паэтаў, і яшчэ ён казаў: «Паміраць не баюся, зусім. Бо на небе мяне будуць чакаць добрыя людзі. Тут я памру, а тамака яны накрыюць стол з пачастункамі. Я прыйду да іх, і вып'ю з імі белай так, як сягоння выпіваю з табою... Не страшна мне паміраць...»

Днямі мой таварыш, той, што з паэтаў, памёр у Кёльне, ён заснуў і не прачнуўся, лёгкі сыход. Ён і не баяўся сысці, бо яго чакалі тамака добрыя людзі. Чамусьці ён уяўляў сустрэчу з людзьмі знакамітымі і сусветна вядомымі. Ён казаў, што сустрэнецца тамака з Мантэнем. Не было ў майго паэта і сумневаў наконт таго, што трапіць ён адразу ў райскі сад. Ён так метафарычна апісваў рай са сталом, на якім з талеркі выкіпае вінаград, што я нават паверыў яму. Ён выбудоўваў свой рай з дзедам марозам, снягуркаю і пеўнем на ланцужку, з морам складзеным з веласіпедных рулёў і са скарбонкамі падобнымі да чарапах, і з чарапахамі падобнымі да аздобленых каштоўнымі камянямі скарбонак.

Які ў мяне рай? Ці чакаюць мяне там? Калі чакаюць, дык хто? Такія пытанні і я пачаў задаваць сабе пасля трыццаці трох. Мяне не пацягнула да зямлі, мая лёгкая паветраная сутнасць змянілася на прахалодную бруістую празрыстую водную стыхію. Мая сутнасць плыла ў зменлівай плыні, а на беразе мяне чакалі правадыры. Я іх пазнаў. Як я мог іх не пазнаць? Гэта былі мае сваякі — нябожчыкі Бронік і Казік, сыны Ваці і Мані Кісялёў. У руках Броніка я бачу чамаданчык, невялічкі чорны чамаданчык, поўны жоўтых антонаўскіх яблыкаў, пазагортваных у газеты, каб не пабіліся. Калі нехта мяне і сустрэне ў іншасвеце, дык гэта Казік і Бронік, мужчыны ў брунатных капелюшах. Яны пачастуюць мяне духмяным антонаўскім яблыкам, каб крыху перакусіць з дарогі. Мы пойдзем... Далей я нічога не бачу, адно чую шархаценне пяску, які сыплецца павольна з замераннямі.

Часам у тым шолаху чуецца голас маці Броніка і Казіка, голас бабы Мані: «Людзі, што з'яўляліся ў нашым лагеры ў лакіраваных чаравіках не выжывалі. Той, хто прыязджаў у ботах ці простых чобатах, неяк трымаўся, неяк жыў, неяк спадзяваўся на вяртанне. Людзі ў лакіраваных чаравіках хутка паміралі... Унучка (Маня звяртаецца да Казікавай дачкі — Валі), не купляй ты болей лакірак. Не абутак гэта для нашых людзей. Крый Бог, трапіш у лагер, дык і не выжывеш, а табе трэба жыць і жыць...»

Сыплецца, сыплецца пясок часу... Хутка мая водная стыхія зменіцца на вогненную, а пазней і на зямную. У цяжкі для сябе час я бачу сваіх правадыроў — Казіміра і Браніслава. «Яшчэ не час, — кажуць яны мне, — яшчэ...»

Адам ГЛОБУС.